ВІКТАР КАЖУРА

Школьная Энцыклапедыя



# Энцыклапедыя юнага натураліста



Школьная Энцыклапедыя

ВІКТАР КАЖУРА

# Энцыклапедыя юнага натураліста



Мінск «Народная асвета» 2022

УДК 085.5:[58+59](031)
ББК 28я2
К13

Серыя заснавана ў 2022 годзе

Мастак *Алена Дашкевіч*

Фота: *А. У. Эрдман, П. Л. Лычкоўскі, С. В. Зуёнак, В. А. Якубоўская*; kartinki24.ru, wikigrib.ru

*Для дзяцей малодшага і сярэдняга школьнага ўзросту*

Выпуск выдання ажыццёўлены па заказе і пры фінансавай падтрымцы Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь

**Кажура, В. В.**

К13 Энцыклапедыя юнага натураліста : для малодшага і сярэдняга школьнага ўзросту / Віктар Кажура ; мастак Алена Дашкевіч. — Мінск : Народная асвета, 2022. — 143 с.: іл. — (Школьная энцыклапедыя).

ISBN 978-985-03-3819-8.

Кніга вядомага беларускага аўтара Віктара Кажуры працягвае серыю «Школьная энцыклапедыя». Гэта незвычайная энцыклапедыя. У кнізе чытач знойдзе шмат ілюстрацый, а таксама вершы і апісанні розных раслін, грыбоў і жывёл. Для цікаўных — рэцэпты блюд.

Адрасуецца чытачам малодшага і сярэдняга школьнага ўзросту, а таксама настаўнікам і бацькам.

**УДК 085.5:[58+59](031)**
**ББК 28я2**

**ISBN 978-985-03-3819-8**

© Кажура В. В., 2022
© Дашкевіч А. Г., ілюстрацыі, 2022
© Афармленне. УП «Народная асвета», 2022

## *Дарагія юныя натуралісты!*

Кажуць, на карце свету Беларусь — маленькая. Можа, і так.

Але для нас яна — вялікая. Сваёй гісторыяй. Сваёй памяццю. Сваёй сучаснасцю. Сваёй будучыняй.

А яшчэ — багаццем. Азірніцеся!

На лузе — ***гербарый-разнатраўе***, ад водару якога можа закружыцца галава.

***Ягадныя россыпы***, быццам вясёлка на зямлі, упрыгожваюць наваколле. Ды не толькі ўпрыгожваюць, а дораць чалавеку радасць і здароўе.

***Грыбы*** летняй ці асенняй парою, схаваўшыся пад галінкі, лісце ды іглiцу, запрашаюць пагуляць з імі ў хованкі. Пры гэтым — вось хітруны! — нібы кажуць: «Пакланіся нам, чалавек, тады мы пакажамся». І ты кланяешся з удзячнасцю і радасцю, бо чым часцей кланяешся, тым паўнейшым становіцца твой кош.

У лясах і пушчах водзяцца ***зубры***. Ды не толькі яны. У маладым сасонніку стаіліся паважныя ***ласі***. А там з-за куста хітравата сочыць рыжы ***ліс***, ці не пакажацца на паляне палахлівы ***заяц***.

Рэкі і азёры віруюць ад незлічонай колькасці ***рыбы***. Сядзеш раніцай, яшчэ да сонейка, на беразе, закінеш вудачку і думаеш: «От бы трапіла сёння такая рыбіна, якую ніколі яшчэ не лавіў!»

Усё напісанае ў кнізе — гэта імкненне пазнаёміць вас, юныя чытачы, з карысным і каштоўным прыродным багаццем нашай краіны, і жаданне падзяліцца ***кулінарнымі рэцэптамі*** ад гэтага багацця, і прапанова расказаць пра свае нечаканыя сустрэчы, знаходкі і адкрыцці на лясных сцяжынках, на аксамітных лугах, у блакітных рэках і азёрах.

***Чытайце! Збірайце! Гатуйце! Запрашайце! На здароўе!***

*Віктар Кажура*







Гляньце: сонейкавы дзеткі –
Зацвілі на полі кветкі.
І над імі загулі
Таўстабокія чмялі.
А на ўзмежках і ў травіцы
Пахаваліся суніцы.
Водар лета – цераз край!
На здароўе! Спажывай!







# Ягады і кветкі — сонейкавы дзеткі

# А

## Абляпіха

(*русск.* ***Облепиха***)

*Верасень прымчаў вятрамі гонкімі,*
*Ураджай багаты аглядае,*
*Як цяжкімі, сакаўнымі гронкамі*
***Абляпіха*** *залатая даспявае.*



Што за гарошынкі залацістыя абляпілі галінку і нібы прырасліі да яе? Бо не відаць нават ножак, на якіх яны трымаюцца. Пазналі? Канешне, гэта — абляпіха, якая і назву сваю атрымала з-за незвычайнага выгляду.

Прыйшла абляпіха да нас з Сібіры і адразу стала папулярнай сярод садаводаў. Таму што ягадкі яе — вельмі карысныя. У іх шмат лекавага алею.

Вопытныя садоўнікі раяць збіраць абляпіху не ў верасні, калі паспявае, а тады, калі яе кране першы марозік. Каб толькі птушкі не папярэдзілі. Пасля гэтага ягады становяцца прыемна-кіславатымі і пахнуць... ананасамі. Але збіраць абляпіху вельмі складана, ягады лопаюцца паміж пальцамі. Таму вучоныя вывелі сарты з ягадамі на ножках.

**Абляпіхавае варэнне**

Напачатку трэба падрыхтаваць сіроп. Для гэтага ў 1 л вады, якая закіпела, усыпаем 500 г цукру, перамешваем і варым на невялікім агні да загусцення. 500 г ягад абляпіхі апускаем у сіроп. Перамешваем, і калі той закіпеў, варым 5 хвілін. Вось і ўсё. ***Смачна есці!***







# Агрэст

(русск. **Крыжовник**)

*Асцярожна, мае ўнукі!*
*Не параньце свае рукі,*
*Бо **агрэст** калючкі мае,*
*Хоць і смачна выглядае.*



Як прывабна выглядваюць з-пад зубчатых лісточкаў ізумрудна-зялёныя, быццам воскам пакрытыя, ягады! Рука так і цягнецца сарваць іх. Але кусцік сам сябе ахоўвае: на кожнай галінцы — вострыя шыпы... Толькі вельмі ж хочацца пакаштаваць...

А вы можаце ўявіць сабе, як гэта «хочацца» не давала спакою дзецям яшчэ тысячу гадоў таму. Бо захаваліся звесткі, што агрэст пачалі вырошчваць у манастырскіх садах аж у далёкім XI стагоддзі.



Сёння гэта расліна прыжылася ў нашых садах, таму што яна мае шмат карысных уласцівасцей, як харчовых, так і лекавых. І ягады агрэсту бываюць самых розных колераў: жоўтыя, барвовыя, зялёныя.

**Жэле «Сюрпрыз»**

Паўлітра вады даводзім да кіпення, усыпаем адзін пачак сумесі для жэле, размешваем. Вымытыя і абсушаныя ягады агрэсту з адрэзанымі хвосцікамі раскладваем па формачках, а потым заліваем іх атрыманай сумессю і пакідаем у халадзільніку для застывання. Вось і ўсё. **Смачна есці!**







# Ажыны

(*русск.* **Ежевіка**)

*Ох, спякота дык спякота —*
*Долу хіліцца лістота,*
*Нават чорныя* ***ажыны***
*Паўцякалі пад галіны.*

Усе ведаюць гэту расліну з пераплеценымі паміж сабой сцёбламі, пакрытымі вострымі шыпамі, быццам калючы дрот. Мала радасці пакалоць аб іх рукі. Праўда, зараз ужо выведзены культурныя сарты ажын без шыпоў, каб вырошчваць на прысядзібных участках.



Але колькі шчасця і задавальнення атрымаеш, калі збярэш вядзерца чорна-бурых ягад: яны такія смачныя і пахучыя! Да таго ж яшчэ і лекавыя: у іх шмат вітамінаў. Адварам галінак і ягад можна лячыць кашаль, боль у горле.

А ці каштавалі вы ажынавы мёд? Кветкі ў ажын белыя з вялікай колькасцю тычынак з нектарам. Пчолам падабаюцца зараснікі ажын.

А гаспадыні гатуюць з ягад шмат смачных страў.



**Марожанае з ажынамі**

*У блэндар насыпаем 450 г ажын і заліваем іх ёгуртам (150 г). Усё гэта перамяшваем да аднароднай масы. Затым выкладваем у сіта, пераціраем, каб аддзяліць костачкі. У атрыманую масу дадаем цукровую пудру, даліваем астатні ёгурт (300 г), яшчэ раз добра перамешваем і разліваем па формачках. А затым на 3 гадзіны ставім у маразільнік. Вось і ўсё.* ***Смачна есці!***







# Алыча

(*русск.* **Алыча**)

*Промні сонца радасна-іскрыстыя*
*Ажывілі цуд, народжаны ўначы:*
*Між густой лістоты залацістыя*
*Плодзікі заззялі* ***алычы.***



Здаецца, пышнае белае воблака апусцілася вясенняй раніцай у сад. А далей — яшчэ адно. І яшчэ. Гэта зацвіла алыча, блізкая сваячка слівы. Такое хараство, што вачэй не адвесці!



Пройдзе час — і замест кветак дрэва ўпрыгожыцца ярка-залацістымі, чырвонымі ці фіялетавымі ягадамі. Пахучымі. Кісла-салодкімі на смак. Багатымі на вітаміны. Таму вельмі карыснымі.

Гаспадыні алычу паважаюць, бо з яе ўдаюцца смачныя кампоты, ліманады, варэнне, жэле. На Каўказе з алычы робяць соус Ткемалі.

## Алычовая пасціла

*У пасудзіну наліваем паўшклянкі вады, насыпаем 2 кг ягад і ставім на пліту на невялікі агонь. Праз нейкі час алыча пачне лопацца. Здымаем з пліты і праціраем цераз сіта. Да атрыманага пюрэ дадаем 1 кг цукру, зноў ставім на невялікі агонь і памешваем, пакуль яно не загусцее. Пасля тонкім слоем выкладваем пюрэ на пергамент і ставім у духоўку, каб пасціла падсохла. Тэмпература ў духоўцы павінна быць самай нізкай, а дзверцы — адчыненымі. Вось і ўсё.* ***Смачна есці!***









# Астра

(*русск.* **Астра многолетняя**)

*Дар нябёсаў на зямлі,*
*Ды які багаты —*
*Зноў блакітам зацвілі*
***Астры** каля хаты.*
*Апранаюць хай палі,*
*Снегавыя шаты —*
*Зноў ліловым зацвілі*
*Астры каля хаты.*



Восень. Хутка выпадзе снег, пачне ўладарыць мароз. Адцвілі ўсе летнія кветкі. А на дварэ зноў казка. Светла-блакітныя, малінавыя, ліловыя кветкі з залаціста-жоўтымі сярэдзінкамі вітаюць нясмелае сонца. І самі гарацьзіхацяць, нібы тыя зоркі. Таму, напэўна, у далёкія часы, гледзячы на іх, людзі і ўскліквалі ў захапленні: «Астра! Астра!» А па-беларуску: «Зорка! Зорка!»

Легенда расказвае, што, калі стаць ноччу сярод кветак і прыслухацца, можна пачуць ледзь улоўны шэпт — гэта астры размаўляюць с сястрычкамі на небе.

Астра не толькі радуе чалавека харaством кветак. Прыгатаваная па спецыяльных рэцэптах, яна дапамагае паніжаць тэмпературу, вылечвае запаленні.



*Вядома больш за 200 разнастайных, рознакаляровых відаў астраў, як аднагадовых так і шматгадовых. А колькі сартоў — не пералічыць!*





Б

# Барбарыс

(*русск.* **Барбарис**)

*Май-прыгажун на зыходзе —*
*Прырода ва ўборы квяцістым.*
*І воблакам жоўта-пушыстым*
*Цвіце* ***барбарыс*** *у агародзе.*



Расліна гэта добра вядомая, хоць некаторыя з вас яе і не бачылі. Затое ў крамах з задавальненнем куплялі карамелькі з прыгожай назвай «Барбарыс». «Барбарыс» — слова з лацінскай мовы. Там яно вымаўлялася як «берберы», што значыць «мядзведжая ягада». Але пры чым тут мядзведзі?



Падчас раскопак у Егіпце былі знойдзены старажытныя кнігі — гліняныя таблічкі, напісаныя за 650 гадоў да нашай эры (гэта ж амаль 3 тысячы гадоў таму!). У іх расказвалася пра незвычайныя ягады на калючых кустах. Аўтар услаўляў барбарыс як сродак «ачышчэння крыві».

Але раней за егіпцян пра лекавыя ўласцівасці гэтай расліны даведаліся ў Індыі, калі заўважылі, што барбарыс прыносіць карысць амаль круглы год. Таму кару і лісце нарыхтоўваюць вясной, плады — летам, а корань — позняй восенню.

Сёння з барбарысу гатуюць мноства розных страў: варэнне, жэле, сокі, сіропы, кампоты. І нават прыемную кіслую прыправу да рыбы і мяса.



**Пачастунак «Кіслінка»**

Колькі галінак барбарысу з ягадамі прамываем і кладзём у слоік. Заліваем вельмі салёнай (200 г солі на 1 л) астуджанай кіпячонай вадой так, каб яна пакрыла ўсе ягады. Даём настаяцца некалькі тыдняў. Вось і ўсё. ***Смачна есці!***



## Барвенак

(*русск.* **Барвинок**)

*Зацвіце **барвенак** –*
*І навокал — свята:*
*Для зямлі скалелай*
*Радасці багата.*
*Сонейка гукае*
*Ён вясновым ранкам.*
*Сілы набірае*
*На лясных палянках.*





Вясна нясмела ступае па зямлі, нібыта баіцца застудзіць ногі на нерасталым яшчэ снезе. Аднак дзе ступіць прыгажуня — з'яўляюцца праталінкі. А ў іх — сінія кветачкі з цвёрдымі лісцікамі. Думаеце, гэта фіялкі? Памыляецеся. Хоць і падобныя яны сваім колерам, аднак імя ім — барвенак, ці первінка. «Чаму?» — спытаеце вы. А вось чаму.

Было тое яшчэ за часы Старажытнага Рыма, калі багі жылі побач з людзьмі. Аднойчы багіня Флора спусцілася на зямлю і стала пеставаць фіялку-кветку. Убачыў гэта барвенак і нават пакрыўдзіўся:

— Чым я горшы за фіялку? Нават падобны да яе. Аднак фіялку ўсе любяць, а на мяне не звяртаюць увагі. Дапамажы мне, багіня.

— Добра, я зраблю так, што ты будзеш цвісці нават тады, калі адцвіце фіялка.

— Шчыра ўдзячны! — падзякаваў барвенак і прамовіў: — Але ў мяне ёсць яшчэ адна просьба. Зрабі так, каб мае кветачкі былі большымі за кветкі фіялкі.

На гэты раз Флора нават узлавалася, але выканала і гэту просьбу. А барвенак не супакойваўся:

— Як я буду жыць без імя? Ва ўсіх яно ёсць, а ў мяне няма. Крыўдна! Дай і мне імя, Флора.

— Ах ты, зайздроснік! Ты нават несумленным шляхам хочаш дабіцца перавагі над сціплай фіялкай, —

ужо раздражнёна адказала багіня. — Я выканаю тваю просьбу і дам імя. Але яно на ўсё жыццё застанецца адлюстраваннем твайго зайздроснага характару. Імя табе будзе — первінка.

Вось так і стаў барвенак-первінка пераможцам.



*Кветачкі брусніц*

*Барвенак — добры лекавы сродак. Адварамі і настоямі з яго паніжаюць артэрыяльны ціск, залечваюць раны і высыпанні на скуры.*

## Брусніцы

(*русск.* **Брусника**)



*Першы ліст пажоўкнуў на бярозе —*
*Восень крочыць непрыметна па дарозе,*
*Аглядае баравіны-таямніцы:*
*Ці паспелі там ужо* ***брусніцы****?*

Падумайце, 300 гадоў — многа ці мала? Як паглядзець... А вось для брусніц многа: вучоныя высветлілі, што вечназялёныя кусцікі гэтых ягад столькі жывуць.



Тыя, хто пастаянна збірае брусніцы, заўважылі яшчэ адну асаблівасць: там, дзе растуць ягады (а гэта чарнічныя, багуновыя ці чыстыя сасннякі), заўсёды знаходзяць і грыбы — баравікі, падбярозавікі, грузды.

Праз усё жыццё брусніцы прыносяць карысць чалавеку: іх можна есці сырымі і мочанымі, можна гатаваць варэнні ды кампоты.



**«Брусічная фантазія»**

Ягады (можна ўзяць 250 г) абавязкова перабраць, вымыць і абсушыць. Затым частку высыпаць у блэндар, дадаць 500 г марожанага, 250 г ёгурту і 3 сталовыя лыжкі цукру. Здрабніць да аднароднай масы. Атрыманы прадукт разліць па шклянках і ўпрыгожыць астатнімі ягадамі. Вось і ўсё. ***Смачна есці!***



# Буякі

(*русск.* **Голубика**)

*Быццам іней ранкам вераснёвым*
*Гронкам ягад выбеліў бакі —*
*Гэта ў хмельным моры багуновым*
*На балотах спеюць **буякі**.*



Хто любіць лес, абавязкова раскажа вам, што чарніцы маюць «сястрычак», якія называюцца буякі. Гэта невысокія кусцікі з блакітна-васковымі лісцікамі і шызавата-чорнымі ягадамі, падобнымі да чарніц, толькі буйнейшымі. Мякаць у ягад зялёная, а сок — светлы.

Растуць буякі па краях тарфяных балот, у мокрых барах ці багуновых сасняках. З-за таго, што буякі суседнічаюць з багуном, які водарам сваім ап'яняе чалавека, іх яшчэ называюць «п'янічкамі».

Буякі багатыя на вітаміны і іншыя карысныя рэчывы, таму гэтыя кусцікі пачалі вырошчваць на прысядзібных участках. З буякоў рыхтуюць морсы, варэнне, кісялі.



**Салата «Смаката для малых»**

Для салаты спатрэбіцца: 1 яблык, 1 морква, 2 сталовыя лыжкі смятаны, цукар, вішні, чарніцы, парэчкі, буякі. Яблык і моркву надзіраем на дробнай тарцы, дадаем смятаны, цукру, перамешваем, а потым упрыгожваем салату ягадамі. Вось і ўсё. ***Смачна есці!***







# Бэз

(*русск.* **Сирень**)

*Хмурыць свае бровы*
*Ціхі майскі вечар —*
*Полымем ліловым*
***Бэз** расквеціў вецце.*
*Дзе знайсці мне словы,*
*Каб разнёс іх вецер,*
*Як агнём ліловым*
*Бэз расквеціў вецце.*



Ціхі вечар. На дварэ гаспадарыць май. То злёгку прабяжыць ветрыкам па вуліцы, падымаючы віхорчыкі пылу, то сцішыцца. То зашалясціць у кустах з белымі ці ліловымі кветкамі. І тады незвычайна прывабны водар разліваецца па наваколлі. Гэта цвіце бэз.



Кажуць, што кветкі яго прыйшлі да нас, калі сонца высока паднялося і сагнала снег з палёў і лугоў. Узяўшы з сабою вясёлку, яно рушыла над зямлёю. Побач ішла вясна. Вясна змешвала сонечныя промні з промнямі вясёлкі і рассыпала іх па зямлі. Дзе ўпадуць промні — вырастаюць рознакаляровыя кветкі дзівоснай прыгажосці. Калі ж вясна дайшла да поўначы, то ў яе засталіся толькі два колеры — белы і ліловы.

Што ж рабіць? Як і чым упрыгожыць зямлю?



Не разгубілася вясна, змяшала яна сонечныя промні з ліловым колерам і кінула на маленькія кусты, якія адразу ж пакрыліся бэзавымі кветкамі.

А што рабіць з белым колерам? Не пашкадавала яго вясна, шчодра рассыпала над зямлёю. Там, куды падаў гэты колер, выраслі кусты белага бэзу.

Сёння бэз выкарыстоўваецца ў дэкаратыўным садаводстве і парфумернай вытворчасці.

*Сёння ў свеце вядома амаль 2,5 тысячы сартоў бэзу з кветкамі рознага колеру, памеру і формы.*





## Бяссмертнік, цмен

(*русск.* **Бессмертник, цмин**)

*У шэрай світцы ранкам летнім*
*На скрыжаванні дзвюх дарог*
*Пад сонцам грэецца* ***бяссмертнік,***
*Нібы за ночку ён прадрог.*

З пашанай адносіліся нашы продкі да бяссмертнікаў. Сустракаючы іх на магілах ці курганах, людзі верылі, што гэтыя кветкі валодаюць незвычайнай сілай, бо ў іх перасяляюцца душы памерлых, каб не парывалася сувязь паміж жывымі і тымі, каго ўжо няма. Таму і назву далі ім такую — бяссмертнікі.

А можа і таму, што кветкі бяссмертнікаў доўга не вянуць, застаюцца яркімі і прыгожымі, нават узімку. І на доўгія часы захоўваюць непаўторны водар лета.

Мы прызвычаіліся да гэтых кветачак і часам праходзім міма, не ведаючы нават, што бяссмертнікі могуць дапамагаць чалавеку і праганяюць моль.

А яшчэ адварам з бяссмертніку пясчанага, ці як яго яшчэ называюць цмену, можна лячыць печань і страўнік (толькі пад наглядам урача!).

# В



## Валошкі, васількі

(*русск.* **Васильки**)

*Жнівеньскай раніцаю ніва*
*Срабрыцца ў кропельках расы.*
*Гарэза-ветрык жартаўліва*
*За чуб цягае каласы.*
*Ды раптам — о, якое дзіва!*
*Між кропель стрэсенай расы*
*Ўзышлі* ***валошкі*** *сарамліва*
*Узорам чыстае красы.*

Клапатлівы гаспадар, убачыўшы такое, спыніцца ды сур'ёзна скажа: «Зноў гэта пустазелле засмеціла

поле!» А другі, вясёлы ды жыццярадасны, у захапленні ўсклікне: «Якое хараство!» І кожны будзе мець рацыю.

Працаўнікі-земляробы не любяць кветку за тое, што яна, выспяваючы разам з жытам ці пшаніцай, сваім насеннем засмечвае збожжа. Таму на наступны год валошкі зноў трапляюць у зямлю разам з зернем і зноў засмечваюць ніву.

А нашы далёкія продкі вельмі шанавалі валошку і абавязкова ўводзілі яе ў некаторыя абрады. Ды і ў другіх народаў кветка была ў пашане. Магчыма, па гэтай прычыне існуе вялікая колькасць незвычайных легенд. Вось адна з іх.

Аднойчы неба стала папракаць ніву за няўдзячнасць:

— Усё, што ёсць на зямлі, дзякуе мне. Птушкі спяваюць для мяне песні, кветкі ап’яняюць сваім водарам, лясы зачароўваюць шэптам. Адна ты застаешся няўдзячнай, хаця толькі я ратую цябе ад смагі дажджавой вадой і прымушаю выспяваць каласы.

— Я ўдзячна табе, — адказала ніва. — Кожнай вясной упрыгожваю поле пяшчотнай зялянінай руні, а восенню пакрываю яго золатам. Па-другому выказаць сваю ўдзячнасць не ўмею. Дапамажы мне, каб я пяшчотай і ласкай магла аддзячыць табе.

— Добра, — згадзілася неба. — Калі ты не можаш падняцца да мяне, то я спушчуся да цябе.

І здарылася незвычайнае: сярод збажыны выраслі дзівоснейшыя кветкі, якія сваім колерам былі падобныя да сіняга неба.

З таго часу хлебныя каласы нават пад лёгкім подыхам ветру схіляюцца да валошак і шэпчуць ім пяшчотныя словы.







- *У народнай медыцыне з даўніны адвары і настоі з валошак прымянялі падчас хваробы, як патагонны і жарапаніжальны сродак.*
- *А яшчэ з кветак атрымлівалі сіне-блакітную фарбу.*



## Венерын чаравічак

(*русск.* **Венерин башмачок**)

*Залацісты, невялічкі,*
*Хто згубіў тут **чаравічкі**?*
*Хто красу такую кінуў?*
*Ці знарок іх тут пакінуў?*
*Хто спяшаўся да крынічкі*
*і згубіў тут чаравічкі?..*
*Вунь вісяць, на сонцы ззяюць —*
*Гаспадыню ўсё чакаюць.*



Прапрадзеды нашых прапрадзедаў перадавалі адзін аднаму такую гісторыю.

Аднойчы багіня прыгажосці Венера хадзіла па зямлі. Шлях нялёгкі: па дарогах, палях, праз лясы ды рэкі. Прытамілася Венера, вырашыла адпачыць у цяньку. Зайшла ў лес.

Убачыўшы багіню, лес ажывіўся, каб дагадзіць прыгажуні: ярчэй заззяла сонца на небе, весялей заспявалі птушкі, кветкі разаслалі пушысты рознакаляровы дыван, а дрэвы шырэй расхінулі свае галіны, каб Венера магла схавацца ў цяні.



Прысела багіня на зямлю, зняла чаравічкі, каб даць спакой нагам, ды задрамала. А калі прачнулася, пачала хуценька збірацца ў дарогу. Але так спяшалася, што забыла свае чаравічкі ў траве.

Лес, каб захаваць памяць пра Венеру, ператварыў чаравічкі ў незвычайнай прыгажосці кветкі, а людзі занеслі дзіўную расліну ў Чырвоную кнігу.

*Вельмі асцярожна (пад наглядам урача!) выкарыстоўваюць венерыны чаравічкі падчас лячэння. Настой гэтай расліны здольны супакойваць чалавека, пазбаўляць ад бяссонніцы, страху і трывогі, памяншаць галаўны боль і здымаць ацёкі.*

# *Верас*

(*русск.* **Вереск**)



*Расхінае восень крылы*
*Над прасторамі зямлі.*
*Небакрай панура-стылы*
*Абуджаюць жураўлі.*
*Туманы кажухам шэрым*
*Крыюць чорныя палі.*
*Толькі ўзлескі ружавеюць —*
***Верасы** зноў зацвілі.*



У розных народаў існуе шмат легенд пра верас. Толькі адну, самую вядомую, паслухайце. Прыйшла яна да нас з паўночнай краіны, дзе зямля неўрадлівая ды скалістая.

Стварыў Бог зямлю, насяліў яе жывёламі, упрыгожыў дрэвамі, кустамі, кветкамі. Зірнуў навокал — хараство! Але... Што гэта? Палі і узгоркі далёкай Шатландыі засталіся шэрымі ды панурымі.

— Трэба дапамагчы гэтай зямлі! — падумаў Стваральнік і звярнуўся да дуба, каб той пасяліўся на непрыветнай зямлі. Аднак дрэва адмовілася, бо палічыла, што караням цяжка будзе на скалах.

Тады Бог звярнуўся да бружмелю. Але і той не згадзіўся:



— Каму я буду дарыць сваю прыгажосць, калі зямля там галодная і негасцінная?

— Напэўна, ружа зможа ўпрыгожыць пусткі Шатландыі? — з надзеяй падумаў Бог.

Толькі і гэта ганарлівая кветка адмовілася, спаслаўшыся на бясконцыя дажджы ды халодныя вятры, ад якіх яе пяшчотныя пялёсткі могуць загінуць.

Расчараваўся Бог:

— Няхай усё застаецца па-ранейшаму, калі ніхто не згаджаецца пасяліцца тут.





Але раптам яго позірк упаў на маленькія кусты з непрыметнымі кветачкамі. Ды гэта ж верас! Узрадаваны, Бог спытаў:

— Ці не мог бы ты засяліць гэту непрыветную пустую зямлю?

— Добра, паспрабую, — адказаў верас. — Але ці апраўдаю, Божа, твае надзеі?

— Я дапамагу табе: дам сілу дуба, водар бружмелю, асалоду ружы.

І здарылася дзіва: шэрая, панурая, нежывая зямля раптам расквецілася, ажыла, апрануўшыся ў ружовы і ліловы ўбор.



*Верас, акрамя сваёй прыгажосці, вядомы тым, што пчолы бяруць з яго нектар і робяць верасовы мёд. І мёд гэты вельмі карысны. А гарбата, прыгатаваная з высушаных галінак верасу, дапамагае лячыць інфекцыйныя захворванні.*

## Вішня

(*русск.* **Вишня**)

***Вішні*** *лісцікі-далонькі падстаўляюць*
*Пад вясёлку — дожджыку чакаюць.*
*На зялёны ліст дажджынкі ўпалі –*
***Вішні*** *дыяментамі заззялі.*



Радзімай вішань лічаць Чарнаморскае ўзбярэжжа, адкуль яны трапілі спачатку ў Рым, а потым распаўсюдзіліся па ўсёй Еўропе.

Ужо ў III стагоддзі да нашай эры ўрач Сіфініус называў вішні каштоўнай лекавай раслінай. Пазней, у 1569 годзе, у Германіі быў выдадзены медыцынскі зборнік «Сад здароўя», у якім вішням адводзілася цэлая глава. У нас вішні з'явіліся даўно і адразу сталі аднымі з самых

любімых садовых дрэў, бо іх ягады вельмі багатыя на вітаміны, антацыяны, арганічныя кіслоты, мінералы.

Руплівыя гаспадыні з вішань рыхтуюць кампоты, варэнне, сіроп, сушаць ягады і нават марынуюць. А хто не любіць варэнікі з вішнямі?



**Варэнікі з вішнямі**

Паўкілаграма прасеянай мукі высыпаем у міску. У сярэдзіне мукі робім ямку, у якую разбіваем 2 яйцы і крыху падсольваем. Дадаем шклянку вады і размешваем, пакуль у місцы не ўтворыцца густое цеста, якое б не ліпла да рук. Тонка раскачваем цеста і формай выразаем круглячкі. У сярэдзіну круглячкоў раскладваем вішні без костачак і акуратна сціскаем краі, каб не разляпіліся. Падрыхтаваныя варэнікі апускаем у кіпень і варым да ўсплыцця (5—7 хвілін). Каб задавальненне было яшчэ большым, варэнікі падаем са смятанай. Вось і ўсё. ***Смачна есці!***

Г

## *Гарлачык*

(*русск.* **Кувшинка**)

*З глыбіні ўсплываюць — раніцу чакаюць,*
*Залатымі вочкамі навакол глядзяць.*
*Белыя* ***гарлачыкі*** *сонейка вітаюць —*
*Жамчугамі-перламі на вадзе гараць.*



Раніца. Ціхая і спакойная. Ні адна хваля не прабяжыць па азёрнай гладзі. Толькі шматкі туману, як казачныя прывіды, спяшаюцца схавацца ад першых промняў сонца. І раптам...

Дзіва дзіўнае! З яшчэ цёмнай ад начнога змроку глыбіні нясмела паказваюцца галоўкі-бутоны. Сонейка прыгравае — і бутоны раскрываюцца, з’яўляючы нам кветку чароўнай красы. Ды гэта ж гарлачык! Да чаго падобны ён на сапраўдны гарлачык, што стаіць на стале.



Дэкаратыўны ружовы гарлачык



Хочаце — верце, не хочаце — не верце, але ў далёкай старажытнасці пра гарлачык расказвалі такую гісторыю.

Калі шумяць першыя веснавыя дажджы, зямля ажывае: распускаецца лісце на дрэвах, зелянее трава, яркімі вочкамі глядзяць на свет пералескі. А кроплі, падаючы на рэкі і азёры, будзяць ад сну ракавінкі-жамчужніцы. Падымаючыся на паверхню, тыя раскрываюць свае перламутравыя палавінкі і ловяць дажджавыя кроплі. Злавіўшы хоць адну, ракавінкі зноў хаваюцца, дзе ў падводнай цемры ператвараюць кроплю ў каштоўны жэмчуг. Так і нараджаюцца гарлачыкі.

Яшчэ кажуць, што гэта кветка дае сілы, каб адолець ворага, абараніць сябе ад розных напасцяў. Але можа і загубіць таго, хто шукае яе з нядобрымі помысламі.

Лісце, кветкі, карэнішча гарлачыка выкарыстоўваюцца ў медыцыне. Прыгатаваныя з іх лекавыя сродкі дапамагаюць пазбавіцца ад захворванняў нырак, страўніка, печані, паніжаюць артэрыяльны ціск.

*Гарлачык белы занесены ў Чырвоную кнігу Рэспублікі Беларусь. Ахоўвайце гэту вельмі прыгожую расліну нашых вадаёмаў!*







# Гваздзік

(*русск.* **Гвоздика**)

*Быццам сотні легкакрылых матылькоў*
*Поле ўкрылі з ранішняй зарою —*
*Гэта россыпы агністых **гваздзікоў***
*Зацвілі тут летняю парою.*



Летам на лугах і лясных палянах у нашых лясах можна сустрэць гваздзіка травянку.

Ёсць у гэтай кветкі і другія назвы. Адна з іх — палявыя слёзкі.



*Гваздзік травянка*

Кажуць, у Старажытнай Грэцыі здарыўся такі выпадак. Багіня Артэміда вярталася з палявання. Настрой у яе быў дрэнны, бо паляванне не ўдалося. Аж тут бачыць: маленькі хлопчык-пастушок іграе на дудачцы.

— Ах ты, нягоднік! Дык гэта ты распужаў усіх звяроў і птушак! — закрычала разгневаная Артэміда.

— Не, багіня! Не! Я не вінаваты! Гукі маёй дудачкі чуюць толькі травы ды кветкі.



Не паверыла Артэміда і загадала сваім прыслужнікам пакараць хлопчыка. А калі зразумела, што несправядліва і жорстка абышлася з пастушком, было ўжо позна. Там жа, куды ўпалі кроплі крыві пастушка, выраслі трапяткія чырвоныя кветкі — гваздзікі.

Белыя, ружовыя, чырвоныя, пурпуровыя кветкі гваздзікоў былі вядомы людзям задоўга да нашай эры. Жыхары Старажытнага Егіпта імі нават муміі ўпрыгожвалі.



- *Вучоныя вывелі шмат дэкаратыўных сартоў гваздзікоў. Сцвярджаюць, што іх водар стымулюе ў чалавека выпрацоўку станоўчых эмоцый.*
- *А як медыцынскі сродак гваздзікі дапамагаюць лячыць горла, супыняюць зубны боль.*



# Глог

(*русск.* **Боярышник**)

*Глянь, карысці колькі многа*
*Ад куста ляснога* ***глогу:***
*Дасць ён ягад на лячэнне,*
*А на фарбу дасць карэнне.*



Прыгожая гэта расліна, моцная і недаступная. Як нашы дзяўчаты-славянкі, што гатовы былі ахвяраваць жыццём, але не скарыцца перад чужынцамі-ворагамі.

У даўнія часы жыла ў вёсцы дзяўчына, статная ды прыгожая. На шчасце бацькам і радасць вяскоўцам. Любіла яна збіраць кветкі ды травы і сплятаць з іх вянкі ці складаць прыгожыя букеты. І абавязкова ў кожны вянок і ў кожны букецік уплятала галінку глогу. А потым дзялілася імі з сяброўкамі-суседкамі.

Толькі не адным вяскоўцам падабалася дзяўчына. Заўважыў яе хараство і захопнік-татарын, унук Чынгісхана, будучы Бату-хан. Але на ўсе яго заляцанні дзяўчына адказвала адмовай.

Аднойчы хан высачыў прыгажуню і пайшоў следам за ёю. Ды не спужалася дзяўчына, прыхінулася да дрэўца глогу ды выхапіла кінжал. Толькі гэта не спыніла татарына. Тады дзяўчына ўдарыла сябе кінжалам у сэрца і ўпала ля дрэўца.







З таго часу на жаночай вопратцы славянак і на галаўных уборах у арнаменце заўсёды прысутнічалі кветкі, ягады, лісцікі глогу...

Сёння глог славіцца тым, што яго настоямі лечаць (ды і здаўна лячылі) хваробы сэрца. Плады глогу ядомыя, а сухія, перамолатыя на муку, надаюць хлебу прыемны пах. Адвары з ягад замяняюць гарбату і каву.

**Цукеркі з глогу**

З вымытых ягад (1 кг) робім пюрэ. Дадаем 400 г цукру і 100 г крухмалу, старанна перамешваем. Атрыманую масу раскладваем на кухонныя дошкі, разраўніваем і наразаем прамавугольнікамі, ромбамі ці квадратамі (як каму падабаецца), абсыпаем цукровай пудрай і пакідаем высыхаць. Вось і ўсё. ***Смачна есці!***

Д

## Дзівасіл

(*русск.* **Девясил**)

*Дзіва-трава — **дзівасіл**,*
*Ад сонца ў яго — дзевяць сіл.*
*Людзям здаўна памагае —*
*Хворым здароўе вяртае.*



Зараснікі дзівасілу маленькаму дзіцяці, калі яно акажацца там, могуць падацца непралазнай пушчай з высачэзнымі раслінамі. А жоўтыя ці аранжавыя галовы-кветкі — падобнымі на мноства сонейкаў.

Каб дзіцятка не пужалася, раскажу адну гісторыю. Нават прапрадзеды не памятаюць той час, пра які пойдзе гаворка.

У дружнай і шчаслівай сям'і нарадзіўся сыночак. Радасці мамы і таты не было канца. Люлялі і пеставалі яго — не ведалі, як і чым дагадзіць маленькаму. Толькі нядоўгім было бацькоўскае шчасце: гадалка напрарочыла, што бацька памрэ, калі дакранецца да сына.





Каб не здарылася ліхога, бацька з'ехаў у далёкую краіну, а навіны яму прыносілі ганцы. Неяк расказалі, што сын паранены і цяпер памірае. Знайшоў бацька лепшых дактароў і наказаў вылечыць сына. Але тыя не змаглі дапамагчы. І стары вырашыў: «Хай будзе што будзе, але я сам пайду да роднага дзіцяці». Прыйшоўшы, убачыў ён страшныя сынавы раны і горка расплакаўся. Ды здарыўся цуд: раны ад бацькавых слёз зажылі, а хлопец выздаравеў. Шчаслівы бацька ад радасці абдымаў сваё дзіця, прыціскаў да грудзей. Але...

Спраўдзілася прароцтва гадалкі: бацька памёр і стаў кветкай дзівасілу, якая і сёння дапамагае людзям, бо дзівасіл — лякарства ад дзевяці (а можа, і больш) хвароб. Ён лечыць і кашаль, і бранхіт, і захворванні страўніка і печані, і нават цукровы дыябет. І гэта — яшчэ не ўвесь пералік.

*Дзівасіл — лекавая, вітамінаносная, меданосная, фарбавальная і інсекцыцыдная расліна.*



## Дзьмухавец

(*русск.* **Одуванчик**)

*Як брацікі пушыстых аблачынак,*
*Укрылі поле шчодра* ***дзьмухаўцы.***
*Ледзь вецер дакранецца да чупрынак —*
*Пушынкі паляцяць ва ўсе канцы.*

Ледзь толькі гарэза-вецер праімчыцца летнім днём над полем, як сотні светла-шэрых парасонікаў уздымуцца ўгару і паспяшаюцца наўздагон. А хто ж пад тымі парасонікамі? Падстаўце далонь, злавіце некалькі — і самі ўбачыце, што ляцяць на парасоніках... маленькія зернейкі — насенне дзьмухаўца.

Цікавая гэта кветка. Яшчэ ад таго часу, як толькі з'явілася на зямлі.



Неяк вясной, прабіўшыся з-пад зямлі, маленькі дзьмухавец нясмела зірнуў навакол і ўбачыў сонейка. Цэлы дзень кветачка не зводзіла з сонейка вачэй, падстаўляла тварык пад ласкавыя промні. Ды так ёй гэта спадабалася, што сама захацела стаць падобнай да сонца. Сонца таксама заўважыла кветачку, жартаўліва правяло промнікам па светлай галоўцы — і дзьмухавец стаў залаціста-жоўтым. Ад захаплення не ведаў нават, што рабіць. А потым вырашыў, што стане ўсюды суправаджаць старэйшага сябра.



Вы самі пераканаецеся ў гэтым, калі паназіраеце за кветачкай. Вось сонейка толькі падымаецца над далёкім лесам — а дзьмухавец ужо выцягвае жоўтую галоўку на тоненькай сцяблінцы, каб прывітаць яго. Самым поўднем сонейка стаіць высока ўгары — і кветка падымае ўгару свой тварык. А вечарам, калі свяціла хіліцца да захаду, дзьмухавец, нібы жадаючы добрай ночы, ківае сонейку галоўкай.

- *У народнай медыцыне дзьмухавец лічылі эліксірам жыцця, які пазбаўляў ад бяссонніцы, паніжаў артэрыяльны ціск, дапамагаў залечваць апёкі.*
- *А яшчэ з падсмажаных каранёў дзьмухаўцу вараць прыемны саладкаваты напой, які замяняе каву.*

Ж

## *Журавельнік, герань*

(*русск.* **Герань**)

*Ах, якое казачнае ранне!*
*Наваколле песціцца ў расе...*
*Сонца выплывае на спатканне —*
*Дзіва-**журавельнік** зноў цвіце.*



Дзіўная гэта кветка: яна можа цвісці некалькі разоў на год. А назву «журавельнік» атрымала за тое, што плод расліны нагадвае доўгую дзюбу. Але гэта яшчэ не ўсё.



Дзівы працягваюцца, калі «дзюба» высыхае: у гэты час яна скручваецца і нагадвае спружыну. А потым раптоўна распрамляецца і... далёка раскідвае насенне.

Расказваюць, што аднойчы захварэла ў сям'і дзіця. Бедныя бацькі не ведалі, што рабіць, бо ніякія лекі не дапамагалі. Але тут хтосьці ўспомніў пра старога траўніка і параіў паклікаць яго на дапамогу. Прыйшоў лекар, агледзеў хворага ды кажа бацькам:

— Знайдзіце колькі кусцікаў журавельніку і пастаўце каля галавы дзіцяці.



*Плод журавельніку з насеннем*

Падзякавалі абнадзееныя бацькі траўніку, сталі распытваць у суседзяў пра кветку і праз нейкі час прынеслі яе дадому. Паставілі каля хворага...

Раніцай дзіця прачнулася здаровым.

Здаецца, што гэтай легендзе можна паверыць, бо журавельнік (як высветлілі вучоныя) дапамагае лячыць інфекцыі, запаленне лёгкіх, паніжае тэмпературу.

*У Беларусі сустракаюцца некалькі відаў журавельніку: лясны, балотны, лугавы і іншыя. Выведзены і дэкаратыўныя сарты.*

## Журавіны

(*русск.* **Клюква**)

*Ступала восень у прасторы-далі –*
*Рубінавыя страціла каралі.*
*Яны апалі на балоты-баравіны...*
*А людзі кажуць: «Гэта ж — **журавіны**».*

*Журавіны цвітуць*



На пачатку восені балотныя купіны ўсыпаны ярка-чырвонымі ягадамі. Падымеш адну — а за ёй, нібы рубінавыя каралі з вечназялёнымі лісцікамі на тоненькай нітачцы, цягнуцца на паўзучай сцяблінцы другія. Ды гэта ж журавіны!

Журавіны — найвялікшы скарб беларускіх балот. Позняй восенню іх нарыхтоўваюць аж да першага



снегу, а ранняй вясной, калі снег толькі-толькі пачынае сыходзіць, збіраюць і «падснежныя» ягады.

Кіслыя на смак, журавіны на працягу 9 месяцаў застаюцца свежымі і не растрачваюць свае каштоўныя карысныя ўласцівасці.

Сокі, напоі, сіропы, варэнне, жэле, мармелад, начынкі для цукерак і пірагоў, прыправы да мяса і птушкі — чаго толькі не прыдумалі кулінары з журавін?! Але, відаць, самае смачнае — гэта морс.



**Морс з журавін**

Здрабняем 600 г ягад і атрыманую масу адціскаем праз марлю — вось і журавінавы сок. Рэшткі змяшчаем у каструлю, заліваем вадой (2,5 л) і даводзім да кіпення. Зноў адціскаем і ў атрыманы адвар дадаем журавінавы сок, цукар (на смак) і старанна перамешваем. Вось і ўсё. ***Смачна есці!***

## *Жывакост*

(*русск.* **Окопник**)

*Людзі назвалі траву вельмі проста,*
*Людзі назвалі траву* ***жывакостам****,*
*Бо ў працы нялёгкай ці ў бітвах-навалах*
*Здароўе людское яна ратавала.*



— Хіба ёсць такая трава, якой можна лячыць косці? — са здзіўленнем спытаеце вы. — Косці ж лечаць толькі спецыялісты — ўрачы.

Гэта сёння мы звяртаемся да ўрачоў. А раней... Людзі знайшлі такую траву і назвалі яе — жывакост. Услухайцеся ў назву — і пачуеце адказ. У далёкай старажытнасці жывакостам лячылі расцяжэнні, болі ў спіне, выцятыя месцы і нават пераломы касцей.

Яшчэ старажытнагрэчаскі вучоны Теафраст узгадваў гэту расліну, а Авіцэна апісаў яе лекавыя ўласцівасці ў «Каноне ўрачэбнай навукі».





Жывакост — расліна вышынёй 30—100 сантыметраў, сцябло шурпатае, кветкі пурпурова-фіялетавыя.

*З лекавымі мэтамі выкарыстоўваюць карані жывакосту — у іх многа крухмалу, цукру, дубільных рэчываў. Але трэба быць асцярожнымі — карані ўтрымліваюць і ядавітыя рэчывы.*

## Жэньшэнь

(*русск.* **Женьшень**)

*У таёжнай пушчы непраходнай,*
*Дзе паўзмрок ствалы хавае кедраў,*
*Кветкай непрыметнай, але гордай*
*Цуд-**жэньшэнь** цвіце ў сховах нетраў.*

З даўніх часоў на Усходзе бытуе выказванне: «Цар лясных звяроў — тыгр, цар марскіх глыбінь — дракон, а цар лясных раслін — панцуй».

Панцуй, або жэньшэнь, называюць яшчэ «коранем жыцця», «духам зямлі», «святой травой», «царом зямных раслін», «боскай травой», «дарам бессмяротнасці», «соллю зямлі», «цудам свету». Усе гэтыя назвы расліна атрымала за ўнікальныя лекавыя ўласцівасці. Сцвярджаюць, што ўжо больш за 3 тысячы гадоў расліна дапамагае людзям: вяртае маладосць састарэлым, сілы — стомленым, здароўе — хворым.

Многа легенд складзена пра жэньшэнь.

Адна з іх расказвае, што сярод сопак, у дрымучых лясах, з даўным-даўна жылі прадстаўнікі двух родаў, якія пастаянна варагавалі між сабой. Адзін з гэтых родаў вёў пачатак ад магутнага і гордага цара звяроў — тыгра, другі — ад драпежнай і вераломнай рысі. І, напэўна, бясконцым было б варагаванне, каб аднойчы не нарадзілася ў кожным родзе па хлопчыку.

Разам раслі малыя, разам гулялі. І ніхто не заўважыў, як дзеці памірылі сваіх бацькоў.

Толькі з часам людзі сталі заўважаць, што хлопцы ўсё больш адрозніваюцца адзін ад аднаго. Той, хто быў з роду тыгра, рос моцным, смелым, магутным, нібы апраўдваў дадзенае яму імя — Жэнь Шэнь (чалавек-корань). Другі ж — з роду рысі — стаў прыгожым, але зайздрослівым, злосным і баязлівым.

І калі на зямлю, дзе жылі юнакі, нібы ноч, наплыла бяда — з'явіўся страшны і крыважэрны Жоўты дракон, — прыгажун Сон Шы-хо, здрадзіўшы свайму народу, перайшоў у стан ворага.

А Жэнь Шэнь не спужаўся дракона і выйшаў на смяротны паядынак. Доўгай і крывавай была бітва, толькі чалавек усё ж перамог.

Зняможаны, паранены, але радасны воін павярнуўся да сваіх суайчыннікаў. Аднак помслівы Сон Шы-хо, па-здрадніцку ўдарыў Жэнь Шэня ў спіну і забіў яго.

Горкім было развітанне народа са сваім героем...

А калі пахавалі Жэнь Шэня, на месцы яго гібелі вырасла расліна, якой далі імя адважнага юнака.

Цікава, што корань жэньшэня па форме нагадвае фігуру чалавека. Менавіта корань расліны і выкарыстоўваецца ў медыцыне.



*Ягады жэньшэню*

*Лекавыя прэпараты з кораня жэньшэню валодаюць танізуючымі ўласцівасцямі, павышаюць устойлівасць арганізма чалавека да захворванняў і радыяцыі.*

*Карані жэньшэню*





# 3

## Званочак

(*русск.* **Колокольчик**)

*Устае нясмела сонца над зямлёй,*
*Мые шчочкі ўранні белаю расой.*
*А з травы **званочак**, збуджаны зарой,*
*Сонейка вітае песняй веснавой.*

*Званочак раскідзісты*



*Званочак зборны*



Сонечны дзень. Лёгкі ветрык прабег па бяскрайнім лузе — і, здаецца, азваліся прасторы ледзь чутным крыштальным напевам. Гэта радуюцца сонцу званочкі.

Або зайдзіце пад цяністыя шаты алешніку, ляшчыны ці ліпы, каб зноў сустрэцца з яркімі кветачкамі, якія нібы асвятляюць наваколле сінімі і фіялетавымі ліхтарыкамі, абуджаюць яго пяшчотным перазвонам.

Кветкі-званочкі растуць паўсюль і вельмі падобныя да цацак-званочкаў ці тых велічных званоў, якія ўрачыста клічуць людзей на святы.

Расказваюць, што жыла ў вёсцы прыгожая дзяўчына са шчырай душой і адкрытым сэрцам. Вельмі любіла яна кветкі-званочкі і пляла з іх вянкі. Аднойчы, занятая гэтай справай, пачула дзяўчына дзіўныя гукі, што зачаравалі, паланілі яе душу. І засумавала яна... І пачала згасаць на вачах...

Але жыў у вёсцы каваль, які моцна кахаў дзяўчыну. Ён вырашыў: «Знайду я такія гукі, што будуць падобныя да гукаў неба. Каб пачула каханая. Каб хвароба пакінула яе».

Так з'явіўся на Зямлі першы званочак, зроблены рукамі чалавека.

- *У Беларусі расце шмат розных званочкаў, але ўсе яны блакітных або ліловых адценняў. Зараз людзі часта вырошчваюць на клумбах гэтыя падобныя да матылькоў, вельмі прыгожыя кветкі.*
- *А некаторыя званочкі дапамагаюць лячыць ліхаманку, хваробы горла: здымаюць асіпласць і хрыпату.*

# Зверабой, святаяннік

(*русск.* **Зверобой**)

*Ваяўнічаю травой*
*Называюць* ***зверабой.***
*Толькі ён не ліхадзей —*
*Лечыць ён здаўна людзей.*





Беларусы называюць гэту расліну святаяннікам. Аднак многім яна вядома пад іншай назвай — зверабой. Толькі не варта пужацца: кветка не забівае, а, наадварот, вылечвае. Праўда, жывёла, калі пакаштуе зверабой сонечным днём, можа сур'ёзна захварэць. Ды такое рэдка бывае.

А вось у народзе існавала павер'е, што гэта расліна дапамагае пры 99 хваробах. Таму і казалі: «Як без мукі нельга спячы хлеб, так і без зверабою нельга лячыць многія хваробы». Таму і лічылі кветку чароўнай.

Але яе выкарыстоўвалі не толькі для лячэння. Адварам зверабою фарбавалі тканіну ў прыгожыя чырвоны, рыжы ці фіялетавы колеры...

Толькі чаму — святаяннік? Лічылася, што гэта кветка зацвітае на дзень святога Яна. Таму і святаяннік.

*Зверабой — старажытная лекавая расліна. Яе трава валодае бальзамічным пахам, гаркаватая на смак, адвар і настой з яе — вяжучы і процізапаленчы сродак.*



*Зверабой чатырохкрылы занесены ў Чырвоную кнігу Рэспублікі Беларусь*









## Зуброўка

(*русск.* **Зубровка**)

*Зубр выводзіць на паляны*
*Статак свой — сваю сям'ю.*
*Там **зуброўкі** пах духмяны*
*Поўніць соладка зямлю.*

Зуброўка духмяная — знешне звычайная траўка падобная да пырніку — вельмі пашырана ў свеце: расце ў Еўропе, у Азіі, у Амерыцы. Таму і назваў мае вельмі многа.

Старажытныя грэкі называлі яе «святой», «падараванай багамі», «прыемнай багам», «свяшчэннай», «боскай». Тыя, хто размаўляў па-англійску, — «салодкай травой». І адны, і другія вылучалі галоўную якасць расліны — неверагодна прыемны пах.

А беларусы, рускія і палякі далі гэтай расліне іншую назву — «зуброўка». Бо траву гэту, як расказваюць, вельмі любяць уладары пушчаў — зубры.

● *Зуброўку выкарыстоўваюць і ў харчовай прамысловасці (уваходзіць у састаў прыправаў і лікёраў), і ў касметалогіі (у выглядзе масак для валасоў), і ў медыцыне (адвар павышае апетыт).*



## Зязюліны слёзкі

(*русск.* **Ятрышник пятнистый, кукушкины слёзки**)

*Плача зязюлька з ранку да вечара,*
*Словы балючыя ў неба ўзлятаюць:*
*— Чаму ж маё шчасце чорным расквечана?*
*Чаму ж мае **слёзкі** ў лузе ўзрастаюць?*

Людзі даўно заўважылі чорныя крапінкі на лістах і кветачках гэтай расліны і падумалі, што гэта зязюліны слёзы. А пасля і кветку сталі так называць. Але хіба

зязюля плача, раняючы слёзы? Яна ж кукуе. Толькі ў народзе лічаць інакш.

Так даўно тое было, што і імёны пазабываліся. Засталося толькі апавяданне пра маці і трох яе сыноў. Бедная была тая жанчына, але, працуючы з самага ранку да позняй ночы, старалася як-небудзь дапамагчы дзеткам. Бо спадзявалася: вырастуць хлопцы — стануць аб ёй клапаціцца. А сыны, пакуль маці была на працы, дзень пры дні гулялі-забаўляліся. І не думалі дапамагаць.



Аднойчы, вярнуўшыся дадому халодным дажджлівым вечарам, жанчына занемагла, захварэла. Просіць яна сыноў:

— Дзеткі, дайце мне вады напіцца, а то ў горле так перасохла, што гаварыць балюча. Ды і холадна вельмі, сагрэцца не магу. Запаліце печ, абагрэйце хату.

— Не ведаем мы, дзе вядро падзелася, — адказалі сыны. — Ды і печ не ўмеем паліць.

Адказаўшы так, пабеглі на вуліцу, дзе ўжо чакалі сябры. Маці засталася адна...



Колькі часу прайшло, вярнуўся адзін з сыноў у хату, бо вельмі захацеў есці. Аж бачыць: стаіць маці, апранаецца і горка плача. Узяла кажушок, накінула на плечы — а ён шэрым пер’ем пакрыўся. Узяла жалезны напарстак, а ён птушынаю дзюбаю абярнуўся. А драўляная лапата, на якой маці хлеб у печ саджала, стала птушыным хвастом. Узмахнула маці рукамі, якія ператварыліся ў крылы, і зязюляй вылецела з хаты. Спужаўся сын, пабег да братоў. Разам кінуліся яны за птушкай, прасілі вярнуцца. Ды позна было.

— Ку-ку, ку-ку. Не трэба клапаціцца пра мяне, не трэба мяне клікаць. Мне цяпер так добра, што і без вас пражыву.

Але праз некаторы час, калі крыўда на дзяцей прайшла, горка заплакала зязюля. І там, куды ўпалі яе слёзы, выраслі кветкі. Зязюліны слёзкі.

I

# Імшарніца

(*русск.* **Подбел**)

*Змрочны лес. Нясмела крочыць раніца,*
*З купіны на купіну ступае.*
*Зацвітае ў змроку тым* ***імшарніца*** *—*
*Яркімі ліхтарыкамі ззяе.*





Беларусы назвалі расліну імшарніцай за тое, што яна расце ў забалочаных хвойных лясах і на саміх балотах. У Расіі гэту расліну называюць падбел, бо лісце яе быццам падбеленае: зверху зялёнае, а знізу з серабрыста-блакітным налётам.

Цвіце ў маі-чэрвені. Кветачкі нагадваюць ружовыя званочкі. Імшарніцу называюць яшчэ андрамедай. Ведаеце чаму? Пра гэта і раскажа старажытнагрэчаская легенда.

Прыгажуня Андрамеда павінна была разлічвацца за ганарлівасць сваёй маці Касіяпеі. Дзяўчыну, прыкаваўшы да скалы, прынеслі ў ахвяру марскому змею. Аднак мужны Персей, убачыўшы хараство зняволенай, згадзіўся пайсці на бой і перамагчы пачвару. Толькі папрасіў, каб Андрамеда стала яго жонкай. Атрымаўшы згоду, герой забіў змея.

У памяць пра подзвіг багіня Афіна ўзняла маладых на неба, каб сёння мы маглі дзівіцца на сузор'і Персея і Андрамеды.

Так атрымалася, што сузор'е Андрамеды якраз указвае на мясціны, дзе звычайна расце імшарніца.

*Народныя лекары настоем гэтай расліны прамываюць хворым раны, лечаць суставы, а свежым лісцем зажыўляюць язвы. Але трэба ведаць, што імшарніца ўтрымлівае і ядавітыя рэчывы. Ужываць гэтую расліну трэба толькі пад кантролем урача.*



## *Ірга*

(*русск.* **Ирга**)

*Для варэння, для кампоту,*
*Для начынкі ў пірагі —*
*На кустах іх шмат ля плоту,*
*Смачных ягадак* ***іргі****.*

Ірга — сапраўдная «еўрапейка», вядомая з XVI стагоддзя. Спачатку яе пачалі разводзіць у Англіі, а потым расліна разышлася па ўсім свеце. Паважаюць яе за вясеннюю прыгажосць у час цвіцення, за незвычайную асеннюю афарбоўку, за марозаўстойлівасць і штогадовую ўраджайнасць. Вялікі дзякуй скажуць вам за пасаджаныя кусты іргі птушкі.

З ягад іргі можна прыгатаваць варэнне, пасцілу, жэле, кампоты, кісялі. Ужыванне іргі карыснае пры ломкасці сасудаў, авітамінозе, захворваннях сэрца.



**Ізюм з іргі**

Ягады перабіраем, прамываем, падсушваем на сонцы, затым раскладваем у скрыначкі, засцеленыя паперай. Кожны новы слой перасыпаем цукровай пудрай. Самы верхні рад прыкрываем марляй, на якую пакладзём дошчачку з невялікім грузам. Пачакаем, пакуль ягады падсохнуць. Вось і ўсё. ***Смачна есці!***

К

## *Казялец*

(*русск.* **Лютик**)

*Дзень гарачы. Сонца. Лета.*
***Казяльцы*** *— па лузе ўсім.*
*Толькі людзі для букетаў*
*Не збіраюць іх зусім.*



Такая прыгожая кветка: зялёная сукеначка, залаты вяночак на галаве, стройная, на тоненькай ножцы — а людзі стараюцца абыходзіць яе. Чаму?





Вы, напэўна, чулі гісторыю няшчаснага кахання Рамэа і Джульеты. А ці ведаеце, што яна з'явілася дзякуючы вядомаму англійскаму батаніку Джэрарду, які захапляўся развядзеннем казяльцоў і расказаў Уільяму Шэкспіру, аўтару п'есы, пра ўласцівасці гэтай расліны. Людзі даўно заўважылі, што казялец ядавіты. Але Джэрард сцвярджаў: «Яд расліны не шкодзіць чалавеку, а можа быць і карысным, варта толькі ўмела прыгатаваць лекі».

Шэкспір запомніў словы батаніка і выкарыстаў іх у сваім творы: Джульета, шукаючы дапамогі, звярнулася да аптэкара Ларэнца. Атрымаўшы зелле, дзяўчына выпіла яго і заснула глыбокім сном. А родныя падумалі, што яна памерла...

- *Вядома шмат розных відаў казяльцоў, многія — дэкаратыўныя, якія ўпрыгожваюць нашы сады.*

## Каліна

(*русск.* **Калина**)

*Даставайце, рыбакі, сваё начынне!*
*Вас язі чакаюць і ліні,*
*Бо пара: красуюць на **каліне***
*Кветкі белыя ў майскай цішыні.*



Аднаму падасца, што не ягады, а каштоўныя камяні-самацветы зззяюць на галінках. Другі ўсклікне: «Ды гэта ж кропелькі-іскры раскаленага ў гарачым полымі жалеза застылі сярод зялёных лістоў». А трэці, убачыўшы ярка-чырвоныя гронкі, спакойна скажа: «Ну вось, і каліна паспела». І пройдзе міма. Як быццам не ведае, што гэта дрэва трох пор года — квецень вясны, зелень лета, ягады восені. І што нашы далёкія продкі, калі хацелі расказаць пра дзявочае хараство, параўноўвалі дзяўчыну з расцвіўшай калінай.



Вось так! І што ў вёсках (ці чулі?) на дэсерт падавалі... калінавую кашу. Казалі — смаката!

Ды і сёння на кухні з калінай — раздолле! Хочаш, гатуй варэнне, хочаш — мармелад, хочаш — пасцілу, хочаш — кісель... Як фантазія падкажа...

Ягады каліны багатыя на карацін і мінеральныя рэчывы. Вітаміну С у іх больш за цытрусавыя: лімоны, апельсіны. Таму першы сродак пры прастудных захворваннях — гарачая гарбата з калінай. Вельмі карысны для чалавека калінавы морс.

**Каліна ў мёдзе**

Гронкі каліны (200 г) добра прамываем і старанна прасушваем. Потым на вадзяной лазні расплаўляем 200 г мёду. Гронкі ягад апускаем у мёд і абсушваем на лісце пергаменту. Вось і ўсё. ***Смачна есці!***

## *Касач*

(*русск.* **Ирис**)

*Светлы месяц праплыў уначы*
*І спавіў лёгкім вэлюмам травы.*
*А ля возера — глянь! — **касачы***
*Шэпчуць месяцу казкі-забавы.*



Расказваюць, што маладая дзяўчына чакала свайго каханага, які паплыў рыбачыць і доўга не вяртаўся. «Няўжо ён заблудзіўся, няўжо згубіў шлях да роднага дому?» — падумала яна і горка-горка заплакала. Буйныя гарачыя слязінкі каціліся па шчоках. А там, дзе яны ўпалі на зямлю, прараслі яркія кветкі. І гарэлі, быццам агні маяка, каб каханы ўбачыў бераг і хутчэй вярнуўся дадому.



У касача, што расце ля вады, кветкі ярка-жоўтыя. Але мы часта бачым гэтыя расліны ў садах і парках — вучоныя вывелі шмат дэкаратыўных сартоў з кветкамі ўсіх колераў вясёлкі.



Адвар з карэнішчаў касача выкарыстоўваюць для паласкання горла і пры лячэнні зубнога болю, а таксама ў касметалогіі для прыгатавання духоў.

А вось некаторыя даследчыкі нават сцвярджаюць, што лёгкі, прыемны водар касачоў здымае стрэс і стомленасць.

*Касач сібірскі і касач бязлісты занесены ў Чырвоную кнігу Рэспублікі Беларусь.*

## Кураслеп

(*русск.* **Ветреница**)

*— Глянь, матуля, белы снег*
*Зноў укрыў даліны.*
*— Не, дачушка, **кураслеп***
*Выткаў палатніны.*



Кураслеп адным з першых зацвітае вясной у нашых лясах — і палянкі робяцца снежна-белымі. Прыгажосць неверагодная!

Гэту расліну яшчэ называюць «дачкою вятроў». Бо, калі тыя нават ледзь-ледзь дыхнуць, кветкі пачынаюць рухацца: пялёсткі дрыжаць, быццам вялікія белыя матылі махаюць крыламі. І ніяк не могуць узляцець. Такі цуд у лесе!



А куры ад гэтай кветкі, нягледзячы на назву, зусім не слепнуць. Наадварот, кураслеп валодае незвычайнай здольнасцю: калі адчуваеце, што стаміліся вашы вочы, на працягу дзесяці хвілін паглядзіце на кветачкі — і стома пройдзе.

*Кураслеп лясны — рэдкая ў нашых лясах расліна з буйнымі кветкамі, таму яна занесена ў Чырвоную кнігу Рэспублікі Беларусь.*



# Ландыш

(*русск.* **Ландыш**)

Л

*Пад наміткай майскай ночкі*
*Зоркі ў небе разгуляліся.*
*Белых **ландышаў** званочкі*
*У траве ім адазваліся.*



Звініць ад птушыных спеваў лес, у такт мелодый гайдаюцца вершаліны дрэў. Толькі...

Заціхаюць песні, а лясныя артысты пачынаюць прыслухоўвацца. Вось яно што! Чыстым-чыстым галасочкам-звонам прывітаў вясну серабрысты ландыш. І яна заўважыла кветачку, пяшчотна пагладзіла сонечным промнікам. Узрадаваўся, расцвіў ад радасці маленькі ландыш. Быццам далоньку, усыпаную каралямі, працягнуў насустрач красуні зялёны лісцік з белымі кветачкамі.



Але нядоўгім было яго шчасце, бо вясна паспяшалася далей.

Засумаваў ландыш, затужыў. Ніжэй сталі згінацца зялёныя сцяблінкі з кветачкамі. Праз некаторы час на месцы белых званочкаў з'явіліся чырвоныя ягадкі. Але і яны пачалі ападаць, усыпаючы дол...

У многіх народаў белыя пахучыя кветкі ландыша сімвалізуюць самыя ўзвышаныя пачуцці: чысціню, пяшчоту, вернасць і любоў, а чырвоныя ягадкі — смутак па страчаным.



- *У нашых лясах ландыш цвіце ў маі і чэрвені. Таму яго навуковая назва ландыш майскі. З'яўляецца каштоўнай лекавай раслінай (сардэчны, абязбольвальны, процізапаленчы сродак). Але трэба памятаць, што чырвоныя ягады ландыша ядавітыя.*
- *За тое, што кветка мае прывабны водар, яе шырока выкарыстоўваюць у парфумернай вытворчасці ў якасці араматызатара.*





# Лілея

(*русск.* **Лилия**)

*І самы хмурны дзень святлее,*
*І думкі сумныя знікаюць,*
*Як снежна-белыя **лілеі***
*Пялёсткі горда раскрываюць.*

Колькі колераў, колькі адценняў мае гэта прыгажуня! Белы, жоўты, чырвоны, чырвоны з крапінкамі, як тыграва скура (таму і называюць гэты від «тыгровая лілея»). А гордая пастава?! А ўвенчаная дзівоснай прыгажосці каронай галоўка?! Сапраўдная каралева!!!

Невыпадкова лілея ў далёкай старажытнасці лічылася адной з найпрыгажэйшых кветак, якую шанавалі і егіпцяне, і французы, і германцы, і русічы.

Але найбольшую павагу выказаў кветцы персідскі цар Кір, які жыў за 5 стагоддзяў да нашай эры. Сталіцу сваёй дзяржавы ён назваў Сузы, што значыць «горад лілей». І нават ушанаваў гэтыя прыгожыя кветкі ў гербе горада.

А старажытныя вучоныя-алхімікі былі перакананы, што кветкі лілеі дапамагаюць ператвараць звычайныя металы ў золата. Ці атрымалася ў іх гэта ператварэнне, невядома.

Сёння кветку часцей за ўсё выкарыстоўваюць у парфумернай вытворчасці, бо лічаць, што яе водар здольны пазбаўляць чалавека ад стрэсу. А разнастайнасць колераў і форм дэкаратыўных лілей, якія ўпрыгожваюць нашы сады, здзіўляюць і ўражваюць!



*Лілея кучаравая*

*У нашых лясах сустракаецца лілея кучаравая, або царскія кучары. За тое, што гэта лілея рэдкая ў нашых мясцінах і за прыгожыя ружовыя кветкі, яе занеслі ў Чырвоную кнігу Рэспублікі Беларусь.*



# *Лотаць*

(*русск.* **Калужница**)

*Змрочна ў лесе на балоце,*
*Звер і той згубіў тут сцежку...*
*Толькі* ***лотаць*** *падарыла*
*Лесу сонейкаву ўсмешку.*

Вясна. Сонца прыгравае — растае снег, вада залівае лагчыны, заходзіць на берагі. Тут і можна палюбавацца жоўта-залацістымі кветкамі лотаці, якая ў сырых, вільготных мясцінах цвіце 2—3 тыдні. А калі вада спадае і наваколле падсыхае, кветкі знікаюць.



Вучоныя адзначаюць у расліны цікавую і рэдкую асаблівасць: яе падводныя лісцікі чырванаватыя, на доўгай нітачцы-ножцы, а на паверхні — цёмна-зялёныя, бліскучыя, прырослыя да сцябла. І зацвітае лотаць толькі на дзясяты год пасля прарастання.

Для чалавека гэта расліна ядавітая. А вось дзікія жывёлы: бабры, ласі, алені — спажываюць лотаць з задавальненнем.

*Лотаць — лекавая расліна, якая валодае процізапаленчымі і болесуцішальнымі ўласцівасцямі, але ўжываць адвары з яе можна толькі пад кантролем урача.*

М

# *Мак*

(*русск.* **Мак**)

*Ці выткаў дзіўны хто сувой*
*Ды разаслаў па ўсёй зямлі?*
*Ці гэта* ***макі*** *зацвілі*
*Нябачнай казачнай красой?*



Стварыў Бог зямлю, пасяліў на ёй чалавека, звяроў, птушак ды розныя расліны. Прыгожа стала навокал. Але толькі ўдзень, бо ноччу ўсё гэта харавство пакрывалася



цёмным полагам. Ноч паспрабавала асвятліць такую прыгажосць зоркамі, але марна. Тады Бог наслаў сон і сненні. І ўсе прынялі іх з радасцю.

Праходзіў час, людзі станавіліся сквапнымі і жорсткімі. А Бог не мог да іх падступіцца. У адчаі ўваткнуў ён у зямлю свой чароўны посах. І той ажыў, пусціў карэнне, зазеляне́ў і ператварыўся ў мак. Вось такая легенда.

На самай справе мак — звычайная для нашых мясцін расліна, вядомая са старажытных часоў. Макавае семя заўсёды выкарыстоўвалася пры выпечцы булак і кулічоў. Мак снатворны служыць крыніцай абязбольвальных лекавых сродкаў.

Сёння шмат сартоў маку людзі выкарыстоўваюць як дэкаратыўнае ўпрыгожанне клумбаў.



**Пірог з макам *(без мукі)***

У кавамолцы здрабняем 120 г макавага зерня. Узбіваем 2 бялкі са сталовай лыжкай цукру. У іншай пасудзіне перацераем 50 г сметанковага масла са сталовай лыжкай цукру, ваніллю і 2 жаўткамі. Дадаем мак, перамешваем і па крысе ўводзім пенку бялкоў. Змяшчаем у форму і выпякаем паўгадзіны пры 180 °С. Вось і ўсё. ***Смачна есці!***



## Мацярдушка

(*русск.* **Душица**)

*З вулляў пчолы вылятаюць,*
*Руныя нясплюшкі —*
*Вабным пахам іх вітаюць*
*Кветкі* ***мацярдушкі****.*

Гэту кветку ведаюць у многіх краінах свету: і ў Еўропе, і ў Азіі, і каля Міжземнага мора. Расце сабе, непрыметная на першы погляд. Але варта толькі дакрануцца да яе — і казачны водар напоўніць наваколле. Можа, па гэтай прычыне і існуе вялікая колькасць легенд





пра мацярдушку. Мы ўспомнім толькі адну, але вельмі старажытную.

Збіраўся кіпрскі цар на важную сустрэчу. Таму павінен быў мець адпаведны выгляд: і знешнасць прыстойную, і вопратку каштоўную, і нават пах незвычайны. Усё было падрыхтавана, засталіся толькі духі. Цар загадаў падаць любімыя. Але здарылася няшчасце: флакон выслізнуў з рук слугі і разбіўся. Ад страху юнак страціў прытомнасць, упаў — і ператварыўся ў кусцік кветак з водарам тых самых духоў.

У народзе гэту расліну называюць таксама душанка, пчалалюб, бабіна душыца. Мацярдушка — вельмі каштоўная лекавая і кулінарная расліна.

Яе настой выкарыстоўваюць як сродак ад бяссонніцы, трывожнасці, дрэннага настрою. Таксама дапамагае яна і пры кашлі.

*Зеляніна мацярдушкі ўжываецца пры засолцы і кансерваванні агуркоў і таматаў. Гаспадыні дабаўляюць яе ў блюды з агародніны і мяса. Эфірны алей расліны ідзе на араматызацыю мыла. У Італіі мацярдушку (арыгана) вельмі любяць усе кулінары.*

## Мята

(*русск.* **Мята**)

*Вабны водар на двары —*
*Зацвітае* ***мята.***
*Пчолаў рой гудзе ўгары —*
*Прыляцеў па ўзятак.*



А ці чулі вы такую гісторыю? Пакахала дзяўчына Мента юнака з беднага роду. Аднак яе бацькі забаранілі маладым сустракацца. Толькі закаханыя, парушыўшы бацькоўскую забарону, усё ж таемна прыходзілі на спатканне. Аднойчы, ап'янелы незвычайным водарам каханай, хлопец заснуў. І ў гэты момант злыя людзі



разлучылі юнака і дзяўчыну. Прыгажуню Менту забралі ў лясное царства, а хлопца кінулі ў глыбокую раку. Калі пра тое даведалася дзяўчына, то горка заплакала ды кінулася ў тую ж раку. А там, дзе падалі слёзы Менты, узыходзілі загадкавыя расліны з бледна-фіялетавымі кветачкамі і прывабным пахам.

У гонар Менты людзі назвалі кветку мятай.

У Беларусі сустракаюцца розныя віды мяты: водная, даўгалістая і палявая. Ды яшчэ некалькі вырошчваюцца для харчовай прамысловасці.



- *Мята — вядомая лекавая, эфіра-алейная, харчовая расліна. Свежае і сушанае лісце ўжываецца як прыправа. Адвар мяты супакойвае, падымае апетыт, знімае галаўны боль. Ментол, які знаходзіцца ў мяце, уваходзіць у састаў лекавых сродкаў ад насмарку, алоўкаў ад мігрэні, а таксама валідолу.*
- *Цікава, але мята можа ўратаваць ад камарыных укусаў. Варта толькі злёгку нацерці адкрытыя часткі цела яе лісцікамі — і камары пачнуць уцякаць ад вас.*

Н

## Наготкі, календула

(*русск.* **Ноготки, календула**)



*Калі на душэўнасць забудуцца людзі,*
*То шчасця, спагады ніколі не будзе...*
*Ды ў зайздрасці чорнай век дужа кароткі —*
*Пра светлыя справы нам шэпчуць* ***наготкі****.*

У народзе гэтую кветку называюць нявестай лета, залатой кветкай, кветкай сонца, сонцаваротам. А яшчэ — сонечным цыферблатам: яна раскрывае свае пялёсткі з усходам сонца, нібы «паведамляе» пра пачатак дня, а закрывае пасля заходу.

Наготкі служаць і дакладным прыродным барометрам: калі кветкі не раскрываюцца да 7 гадзін раніцы, то чакай дажджу або навальніцы.





А вось як народная легенда расказвае пра паходжанне назвы кветкі.

Нарадзіўся ў беднай сям'і хлопчык. Рос ён кволым і хваравітым. За гэта прыдумалі хлопцу мянушку — Заморак. З дзяцінства любіў ён збіраць травы і кветкі, а калі падрос, навучыўся з іх дапамогай лячыць людзей. І з блізкіх, і з далёкіх вёсак прыходзілі да Заморака хворыя.

Але яго славе пазайздросціла злая варажбітка. На свята пачаставала яна хлопца атручаным вінам. Сабраўшы апошнія сілы, ён прашаптаў: «Пасля смерці пазногаць з маёй рукі закапайце пад акном варажбіткі». Так і зрабілі. Вырасла на тым месцы залацістая кветка, якую назвалі наготкі.



*А навуковая назва наготкаў — календула. Гэта каштоўная лекавая і дэкаратыўная расліна. Лечыць календула ад хвароб сэрца, страўніка, печані, дапамагае загойваць раны, а свежы сок расліны выкарыстоўваюць супраць укусаў пчол і камароў.*

## Нарцыс

(*русск.* **Нарцисс**)

*Зачараваны дзіўнаю красой,*
*Бядак-Нарцыс схіліўся над вадой –*
*Рашыць загадку ён не можа:*
*Хто там са дна глядзіцца гожа?*



Бачылі вы гэту прыгожую, але, здаецца, халодную кветку? Чулі яе прыемны водар? Радаваліся яе з'яўленню на клумбе пасля працяглай зімы?

Вось якую даўнюю легенду захавала людская памяць.

Маладая багіня прыроды пакахала прыгожага хлопца Нарцыса. Але ён не звяртаў на дзяўчыну ніякай увагі. Тая ад безнадзейнага кахання гасла, нікла і ператварылася ў рэха. Але перад тым наслала праклён на





Нарцыса: «Няхай і табе не адкажа ўзаемнасцю той, каго ты палюбіш».

Неяк спякотным днём Нарцыс схіліўся над возерам, каб наталіць смагу, і ў люстэрку вады ўбачыў сябе. Ніколі раней не даводзілася яму бачыць такога хараства. Таму і не дзіўна, што Нарцыс закахаўся. Кожны дзень з усходам сонца прыходзіў ён да ракі, глядзеўся ў ваду і нават хацеў абняць адлюстраванне. Але ўсе намаганні былі марнымі.

Хлопец не мог ні есці, ні спаць і ўрэшце бясследна знік. А на тым месцы, дзе юнака бачылі апошні раз, узышла прыгожая белая кветка...

Прыгожая кветка, прыгожая легенда. Аднак памятайце, што вялікі букет нарцысаў у пакоі можа выклікаць галавакружэнне — такі моцны ў іх водар.

> *У дэкаратыўным садаводстве зараз выкарыстоўваюць каля 2 тысяч сартоў нарцысаў самых разнастайных форм і колераў.*

## Незабудка

(*русск.* **Незабудка**)



*Здаўна так вялося, што з бацькавай хаты*
*У свет выпраўляліся хлопцы, дзяўчаты.*
*Каб дзівы-спакусы ім памяць не скралі*
*З сабой **незабудкі** бацькі ім давалі.*

Сёння жыхары многіх краін ладзяць святы ў гонар гэтай маленькай сінявокай кветачкі, хаця радзімай незабудкі лічацца Сярэдняя Еўропа і Амерыка. Але чаму незабудка?

Было так. Стварыў Бог зямлю і ўсё, што ёсць на ёй, ды пачаў надзяляць імёнамі. Дайшла чарга да кветак. Кожная атрымала сваю назву. А яшчэ наказ: «Добра запомніце імя сваё!» Але не паспеў Гасподзь сказаць

гэта, як убачыў, што са слязамі на вачах вярнулася да яго маленькая кветачка і сумна прамовіла: «Госпадзі, я забыла імя сваё». І Бог, глянуўшы на гаротніцу, ласкава прамовіў: «Не забудзь мяне, незабудка!»

Незабудка — сімвал кахання, напамін пра тых, каго ўжо няма побач з намі, але ёсць у нашых сэрцах.



● *Сёння незабудкамі ўпрыгожваюць клумбы, складаюць з іх букеты і цэлыя кампазіцыі. Выведзены сарты з белымі, ружовымі і цёмна-сінімі кветкамі.*

П

## Парэчкі

(*русск.* **Смородина**)

*Кажуць людзі, каля рэчкі*
*Пасяліліся **парэчкі**.*
*Я ж да рэчкі не пайду —*
*У агародзе іх знайду.*







Усе ведаюць гэтыя ягадныя кусты — парэчкі. І ведаюць таксама, што іх ягады бываюць розных колераў — чорнага, чырвонага і жаўтавата-белага.

Ужо ў XI стагоддзі ў манастырскіх садах Старажытнай Русі можна было сустрэць чорныя парэчкі. А сёння яны выспяваюць нават за Палярным кругам. Медыкі параўноўваюць лячэнне парэчкамі з курортным аздараўленнем. Такі «гонар» ягады атрымалі за свае ўласцівасці, бо ў іх — цэлая кладоўка вітамінаў.

Чорныя парэчкі можна есці сырымі ці рыхтаваць з іх джэмы, варэнне, пасцілу. А ўмеліцы-гаспадыні нават выкарыстоўваюць свежае ці сушанае лісце парэчак падчас засолкі агуркоў, капусты, грыбоў, заварвання гарбаты.

У чорных парэчак ёсць «сястрычкі» — чырвоныя і белыя парэчкі. Яны і адрозніваюцца, і дапаўняюць адны другіх. Калі ў чорных шмат вітаміну С, то ў чырвоных —



вітаміну А. Па іншых якасцях чырвоныя парэчкі таксама пераўзыходзяць сваіх «сястрычак». Узяць хаця б сок: з чырвоных парэчак яго атрымліваюць значна больш, чым з чорных. І гэты сок — каштоўны прадукт, які дадаюць нават у дзіцячае харчаванне. Белыя парэчкі менш кіслыя, чым чырвоныя, прыемныя на смак і больш падыходзяць вашым бабулям і дзядулям, бо паніжаюць згусальнасць крыві.

**Хуткае варэнне «Сямейка»**

Паўкілаграма чырвоных і паўкілаграма чорных парэчак старанна прамываем, абсушваем і засыпаем 1 кг цукру. Усё гэта перамешваем да таго часу, пакуль цукар не стане мокрым ад соку. Затым ставім каструлю на моцны агонь і даводзім да кіпення. Бесперапынна памешваючы, варым 3 хвіліны. Атрыманую масу праціраем праз сіта. Вось і ўсё. ***Смачна есці!***

## Пералеска

(*русск.* **Перелеска, печеночница**)

*Ледзь сонца адагрэе ўзлескі*
*І жаўранкі ў блакіце адзавуцца,*
*Ліловыя красулі* ***пералескі***
*Вясне-красе прыветліва ўсміхнуцца.*



Даўно тое было, калі цяжка жылося чалавеку сярод прыроды: то дажджы зальюць, то снягі засыплюць, то маразы з пячор не пускаюць, то спёка дыхаць не дае. А так хацелася цеплыні лагоднага сонца. Аднак...

Бабуля-Зіма са сваімі прыслугачамі Сцюжай і Сіверам вырашылі не пускаць на зямлю Вясну. Спужалася ўсё навокал, задрыжала, панікла. Адна толькі пералеска ўзняла галоўку і раскрыла свае лілова-сіняватыя пялёсткі. Заўважыла Сонца гэту смелую кветку, аблашчыла промнямі. А потым адагрэла зямлю і расчыніла Вясне дзверы.

Пералеска пачынае цвісці ў нашых мясцінах адной з першых, — і паляны ў лесе робяцца сінімі, як неба. А лісты кветкі застаюцца зялёнымі ўсю зіму і зімуюць пад снегам. Беражыце гэты цуд прыроды!



- *Сёння людзі з дапамогай гэтай расліны лечаць хваробы сэрца, крыві, суставаў, упрыгожваюць імі сады, клумбы, газоны.*
- *Існуюць дэкаратыўныя сарты з жоўтымі, ружовымі, белымі, зялёнымі махровымі і простымі кветкамі.*

## Півоня

(*русск.* **Пион**)

*Завуць* ***півоню*** *нелюдзімаю:*
*— Павагі да другіх не мае!..*
*Ды кожны год красою дзіўнаю*
*Яна на радасць расцвітае.*



Нельга прайсці міма і не заўважыць яркую пышную кветку, якая, нібы казачны ліхтар, асвятляе клумбу і незвычайна пахне. Гэта — півоня. Здаўна (а кветцы больш за 2 тысячы гадоў) прыцягвала яна людскую ўвагу. Напрыклад, у Кітаі падоранай півоняй выказваюць добрыя пажаданні, а вось у Індыі кветку лічаць сімвалам нязграбнасці і недарэчнай ганарлівасці.

Зараз у свеце вырошчваецца больш за 5 тысяч сартоў півоні самых разнастайных форм і афарбовак.



Таму і апавяданняў пра півоню складзена нямала: добрых і не зусім.

У адной старажытнагрэчаскай легендзе расказваецца пра ўрача Пеона, які лячыў людзей настоямі і адварамі траў. Аднойчы ён дапамог богу падземнага царства Плутону, якога параніў Геркулес. Калі пра гэта дачуўся настаўнік Пеона Эскулап, то ад зайздрасці вырашыў атруціць таленавітага вучня. Аднак удзячны Плутон ператварыў юнака ў прыгожую кветку.



Півоня выкарыстоўваецца сёння ў першую чаргу як дэкаратыўная расліна, а яшчэ і ў медыцыне: яе настоямі (толькі па рэкамендацыі ўрача!) супакойваюць нервовую сістэму. Парфумеры прымяняюць півоневыя аддушкі ў касметычнай прадукцыі.

**Варэнне з пялёсткаў півоні**

У сонечнае надвор'е збіраем свежыя пялёсткі півоні і змяшчаем у каструлю. Выціскаем на пялёсткі сок лімона і надзіраем цэдру. Насыпаем крыху цукру і перамешваем, каб півоня пусціла сок. Гатуем цукровы сіроп, заліваем пялёсткі і даводзім да кіпення. Вось і ўсё. ***Смачна есці!***

## Пярэсна

(*русск.* **Купальница**)

*Сонца шчодра прыгравае,*
*Горды дуб расправіў плечы...*
*Глянь — **пярэсна** зацвітае*
*Майскай раніцай у лесе.*



Дзіўная гэта кветка і вельмі прыгожая. Зацвітае толькі на дзявяты год пасля прарастання. І цвіце, пакуль на дубе не адрастуць маладыя лісточкі ды не стануць засцяняць сонца.

А быў час, калі яна ледзь не знікла, бо людзі бяздумна зрывалі прыгожыя кветкі і вялікімі букетамі прыносілі дадому. Сёння расліна занесена ў Чырвоную кнігу Рэспублікі Беларусь.

Пра пярэсну людзі расказваюць такую легенду. Маладая прыгожая русалка пакахала вясёлага пастуха Аляксея. Але ён не адказваў узаемнасцю. Ад няшчаснага кахання дзяўчына і ператварылася ў жоўтую кветку, якая расце на сырых лясных палянах ды прырэчных лугах.

Цэняць пярэсну за тое, што яна, рана зацвітаючы (у маі або ў чэрвені), дае са сваіх кветак багата нектару, з якога пчолы атрымліваюць мёд.



*У медыцыне пярэсна выкарыстоўваецца як процізапаленчы сродак. Але трэба памятаць, што карэнішчы расліны ядавітыя. Выведзены шматлікія дэкаратыўныя сарты пярэсны з махрыстымі кветкамі.*

## Рабіна

(*русск.* **Рябина**)

*Калі асенняю парой*
*На **рабіне** ягад многа,*
*Будзе сёлетняй зімой*
*Снежная дарога.*

Р



Зімні марозны ранак. Сонца толькі-толькі паднялося над вёскай. А на рабіне каля хаты ўжо даўно віруе жыццё. Сям'я сінічак, пералятаючы з галінкі на галінку, частуецца ягадамі. Птушкі часам сварацца за лепшае месца. Але дарма. Ягад хопіць на ўсіх. Вунь колькі іх — ад цяжкіх гронак аж згінаюцца тонкія галінкі і ягады асыпаюцца на зямлю. Там імі ласуюцца мышы, вожыкі. Любяць рабіну ласі і нават мядзведзі. А вясной на белых кветках шмат пчол — рабіна вельмі добры меданос.



І сярод людзей гэта расліна ў пашане: вунь колькі песень пра яе складзена, а пісьменнікі, каб расказаць пра хараство дзяўчат — гераінь сваіх твораў — параўноўваюць іх з расцвіўшай рабінай.

Ды і гаспадыні не мінаюць гэтыя ягады, гатуюць розныя далікатэсы: пасцілу, мармелад, кампоты, варэнне, кісялі, марынуюць ці мочаць. Ёсць у рабіны і лекавыя ўласцівасці. Свежы сок паляпшае работу страўніка, а настой кветак — патагонны і адхарквальны



сродак. Лісце рабіны валодае бактэрыцыднымі ўласцівасцямі — у ім доўга захоўваюцца, напрыклад, агуркі.

**Рабіна ў цукры**

Спачатку гатуем сіроп. Для гэтага шклянку цукру (200 г) распусцім у гарачай вадзе (200 г). Затым гронкі з ягадамі акунаем у сіроп і прысыпаем дробна прасеяным цукрам. Потым усё гэта хараство прасушваем спачатку ў духоўцы, пасля — на свежым паветры. Вось і ўсё. ***Смачна есці!***

## Рамонак

(*русск.* **Ромашка**)

*Рамонкі — сонейкавы дзеткі –*
*Глядзяць так здзіўлена-шчасліва:*
*Прыволле, рэчка, луг, і кветкі,*
*І аблачынак белых дзіва.*

Раней гэту кветку за знешні выгляд называлі... пупаўкамі, бо ў цэнтры, пасярод белых пялёсткаў, узвышаўся жоўты «пупок». А рамонкам кветка стала нядаўна, некалькі стагоддзяў таму, калі знахары-траўнікі пачалі выкарыстоўваць расліну, што называлася «раманавай травой», «раманавай кветкай», «раманам».

*Нівянік*



Рамонак яшчэ можна назваць «вандроўнікам з далёкай Амерыкі, які знайшоў другую радзіму». За сваё хараство сотню гадоў таму ён лічыўся нават рэдкасцю, на якую ў батанічных садах прыходзілі падзівіцца наведвальнікі. Але кветка вельмі хутка распаўсюдзілася і стала адной з самых любімых, бо, гадаючы на ёй, многія хацелі ведаць будучыню.

Кажуць, у даўнія часы рамонкі служылі парасонамі для маленькіх палявых гномаў. Калі пачынаўся дождж, гномікі хаваліся пад імі або, сарваўшы кветку, смела крочылі пад вадзянымі струменямі і заставаліся сухімі.

У Беларусі можна сустрэць розныя рамонкі: нівянік з вялікімі кветкамі, рамонкі пахучы і непахучы і самы важны — рамонак аптэчны.

*Адвары з рамонка аптэчнага выкарыстоўваюць пры запаленні горла, як патагонны, вяжучы і антысептычны сродак, у касметыцы. Букеты рамонка пахучага, развешаныя ў кладоўках, адганяюць мышэй.*



Рамонак аптэчны

## Расіца

(*русск.* **Росянка**)

*Горка плачуць камары,*
*Аж звініць вадзіца:*
*У балоце на зары*
*Вырасла* ***расіца****.*



Фантазія чалавека ніколі не мела граніц. Пра што толькі нашы продкі не складалі легенды?! Тут і дракон, і цуда-юда, і ваўкалак... І нават дрэвы-людаеды. Аж страшна! Адно радуе, што гэта — усяго толькі міфы.

Але, пагадзіцеся, большасць неверагодных паданняў мае сваю перадгісторыю. Ды і ў царстве кветак на самай справе ёсць свае драпежнікі. Узяць хаця б расіцу. Чарльз Дарвін казаў пра яе: «Незвычайная расліна ці, лепей, надзвычай дасціпная жывёла». Вось так!

Сама па сабе расіца вельмі маленькая, але здольная жывіцца невялікімі насякомымі. Варта якому-небудзь камарыку сесці на яе лісцік, як той скручваецца «ў кулачок» і сціскае здабычу. Дні праз 2—3 камарыка нестае — расіца яго пераправаўлівае і зноў разгортвае лісток — «выходзіць на паляванне».



*Нягледзячы на такі «драпежны» характар, расіца шырока выкарыстоўваецца ў медыцыне, бо валодае патагоннымі, адхарквальнымі і антысептычнымі ўласцівасцямі.*







# Ружа

(*русск.* **Роза**)

*Каралеваю між кветак —*
*Роўных ёй няма нідзе! —*
*Зацвіла ў пачатку лета*
*Дзіва-**ружа** на градзе.*

Расказваюць, што жыхары Старажытнага Рыма, людзі смелыя і ваяўнічыя, былі ўпэўнены: ружы пасяляюць у сэрцах мужнасць і бясстрашнасць. Таму замест моцных шоламаў надзявалі на воінаў вянкі з ружаў, а на шчытах малявалі гэту кветку. Калі ж рымляне вярталіся пераможцамі, тады на іх галовы таксама ўскладалі вянкі з ружаў, а дарогу пасыпалі ружовымі пялёсткамі. Так кветка стала сімвалам перамогі.

Яшчэ ружа з'яўлялася сімвалам маўчання, захавання тайны. Для гэтага над сталамі ў дамах вешалі галінку, якая азначала: усё сказанае пад ружай застанецца тайнай. Адсюль і пайшоў выраз: «Я сказаў пад ружай».

З далёкай-далёкай старажытнасці дайшлі да нашых дзён і запісы пра ўнікальныя лекавыя ўласцівасці ружы. Але гэта больш тычыцца яе дзікарослага продка — шыпшыны (с. 72). Галоўная роля ружы сёння — гэта ўпрыгожванне садоў і паркаў. Ружа — царыца кветак!

*У свеце незлічоная колькасць відаў і сартоў руж: чайныя і чайна-гібрыдныя, французскія, паліянтавыя, шатландскія, рэмантантныя, фларыбунда, мініяцюрныя і іншыя. Уявіць сад без руж немагчыма!*





С

## Сліва

(*русск.* **Слива**)

*Як царэўна, ганарліва*
*З-пад ліста глядзіцца* ***сліва.***
*І ўся важная такая —*
*Шчокі моцна надзімае.*



Вучоныя лічаць, што чалавецтва пачало вырошчваць слівы амаль 3 тысячы гадоў таму. У той час іх ужо шырока выкарыстоўвалі ў Егіпце і ўжывалі не толькі сырымі, але і ў выглядзе розных страў.

Плады слівы маюць розныя памеры і афарбоўку: яны бываюць жоўтыя, сінія, фіялетавыя з васковым налётам. У іх шмат вітамінаў і караціну.



Сёння сліва — надзвычай распаўсюджаная расліна, якая налічвае больш за 35 відаў, з якіх можна прыгатаваць стравы на любы смак і густ: слівы сушаныя, мочаныя, марынаваныя, кампоты, кісялі, варэнне, джэмы, пюрэ, жэле, мармелад, канфіцюр, салата... Хіба ўсё пералічыш?!

**Салата са слівамі**

Дробна пакрышаныя 6 сліў і нарэзаныя невялікімі кубікамі 3 кавалкі кавуна ссыпаем у міску. Дадаем карыцу і мёд, старанна перамешваем. Вось і ўсё. ***Смачна есці!***

## Сон-трава

(русск. **Сон-трава, прострел**)

*Глянь, на сонечнай палянцы*
*Карагод узнік жывы:*
*Стаўшы ў круг, плывуць у танцы*
*Дзіва-кветкі* ***сон-травы.***



Калі ў канцы красавіка ці ў маі мацней прыгравае сонца, на баравых палянках з'яўляюцца серабрыста-





пушыстыя камячкі дзіўных раслін. Фіялетавыя, блакітна-ліловыя, сінія пухнатыя кветкі то тут, то там збіраюцца невялікімі сямейкамі. Гэта сон-трава прачынаецца. Але чаму сон-трава?

Людзі верылі, што яна навявае сон. Таму і прыдумвалі розныя небыліцы пра гэтую кветку. У адных распавядалася пра тое, як падарожнікі, трапіўшы вечарам на паляну з гэтай раслінай, ахіналіся моцным сном. Другія былі перакананы, што гэта самі кветкі, звесіўшы галоўкі, забыліся глыбокім сном. Рознае казалі... Нават тое, што расліна валодае прароцкімі здольнасцямі: прадказвае тым, хто спіць, дабро і зло. Але ўсё гэта — павер'і і небыліцы.

А вось у сапраўднасці кветка дапамагае геолагам і падказвае, дзе шукаць... карысныя выкапні, асабліва рэдкія — кобальт і нікель. Такая гэта Дзіва-кветка.

Сон-трава — дэкаратыўная расліна. Вучоныя вывелі сарты з кветкамі рознага колеру: белага, цёмна-чырвонага, ліловага, ружовага.



- *За сваю прыгажосць сон-трава пакутуе ад зборшчыкаў букетаў, таму занесена ў Чырвоную кнігу Рэспублікі Беларусь.*
- *У медыцыне водны экстракт сон-травы выкарыстоўваецца ў якасці моцнага бактэрыцыднага і фунгіцыднага сродку для загойвання ран і грыбковых захворванняў скуры.*





# Стакротка, маргарытка

(*русск.* **Маргаритка**)



*Далёкія зоркі агністыя*
*Рассыпала ноч па зямлі.*
***Стакроткі** — бялюткія, чыстыя —*
*З тых зорак за ноч расцвілі.*

Калі назву гэтай кветкі перакласці з грэчаскай мовы на беларускую, то атрымаем прыгожае слова «жамчужына». Сапраўды, калі добра прыгледзецца, дробненькія кветачкі стакротак нагадваюць белыя або ружовыя жамчужынкі.



Даўняя легенда расказвае, як з'явіліся на зямлі гэтыя прыгожыя кветкі.

Ноч расхінула над зямлёю сваё покрыва, усыпанае яркімі зоркамі. І маленькая дзяўчынка, якая ніяк не магла заснуць, любавалася гэтымі далёкімі агеньчыкамі. А потым нечакана папрасіла: «Ночка, ночка, зрабі так, каб зоркі сталі кветкамі і я магла з імі пагуляць». Пачула ноч просьбу дзяўчынкі...

Прачнулася малая — і застыла ад здзіўлення, таму што ўвесь двор зацвіў серабрыста-белымі стакроткамі. Гэта зоркі, схаваўшыся ў кропельках расы, заіскрыліся пад промнямі ранішняга сонца. Відаць, таму гэтыя кветкі яшчэ называюць «вачамі дня».



Стакроткі цвітуць у нас з красавіка да ліпеня, а калі нечакана пахаладае... Калі пахаладае, яны зацвітаюць яшчэ раз.

● *Выведзена шмат сартоў стакротак з ружовымі, цёмна-чырвонымі, двухколернымі, белымі, махровымі, падобнымі да пампонаў, кветкамі, якія вырошчваюцца ў нашых садах.*



## Суніцы

(*русск.* **Земляника**)

*Пакланіся нізенька зямліцы,*
*Лісце асцярожна расхіні –*
*Бачыш, цуд: як пацеркі,* ***суніцы***
*Іскрамі гараць сярод травы.*

Суніцы першымі адкрываюць ягадны сезон: ужо ў другой палове чэрвеня іх можна знайсці і ў лесе, і між кустоў, і нават на лузе.

Ягады суніц карысныя людзям любога ўзросту, асабліва дзецям, якім даюць іх з вяршкамі, цукрам, смятанай. Лічаць, што з сунічным кампотам не параўнаецца ніякі другі. Але самыя смачныя ягады гэта тыя, што вы знойдзеце самі і з'ясце прама з куста, — здаецца менавіта так пахне лета.

А ці ведаеце вы, что суніцы садовыя часта называюць клубніцамі ці трускаўкамі. Такія яны смачныя, аж за вушамі трашчыць!



*Суніцы садовыя, або клубніцы*

**Суніцы з малаком**

Шклянку вымытых ягад пакладзём у міску і зальём шклянкай малака. На свой густ дададзім цукар. Вось і ўсё. ***Смачна есці!***

# Т

## Трыпутнік

(*русск.* **Подорожник**)

*Я —* ***трыпутнік****, падарожнік,*
*Чалавеку — ежа, лекі.*
*Хто ў бядзе яму паможа,*
*Як няма нідзе аптэкі?*



Ведаеце, чаму індзейцы называюць трыпутнік «следам белага чалавека»? Разгадка простая. Калі еўрапейцы адкрылі амерыканскі кантынент, мясцовыя жыхары



заўважылі: там, дзе прайшоў белы чалавек, праз некаторы час з'яўлялася невядомая расліна. Яе авальныя бліскучыя лісцікі, здаецца, прыціскаюцца да самай зямлі, а над імі ўзвышаюцца дзве-тры сцяблінкі. Калі ўважліва прыгледзецца, то можна ўбачыць і маленькія кветачкі. Пазней (не паверыце!) адна расліна з гэтых кветачак можа даць да 60 тысяч зернейкаў насення. Яно не баіцца ні дажджоў, ні асенняй слоты, а, наадварот, прыліпаючы да вопраткі, абутку, капытоў і поўсці жывёл, да колаў аўтамабіляў, «захоплівае» ўсё новыя і новыя тэрыторыі. Так расліна і трапіла за акіян.



У Беларусі сустракаюцца 4 віды трыпутнікаў: вялікі, ланцэталісты, сярэдні і шурпаты.

Нягледзячы на тое што трыпутнік — пустазелле, ён шырока выкарыстоўваецца ў народнай медыцыне. Ім спыняюць крывацёкі, ачышчаюць раны, лечаць хваробы страўніка і органаў дыхання. А ў аптэцы вы знойдзеце лекі з трыпутніку — «Плантаглюцыд» і «Сок трыпутніку».



● *Маладыя лісты трыпутніку ядомыя. На Каўказе і Далёкім Усходзе з іх вараць супы і дабаўляюць у салаты.*

## Фіялка

(*русск.* **Фиалка**)

*Зямля прачнулася ад зімняй стыні,*
*Зноў вестуны вясны — шпакі — ляцяць.*
*І вачанятамі, як неба колер сіні,*
***Фіялкі** здзіўлена вакол глядзяць.*



«Вясна прыйшла! Прыйшла вясна!» — радасна зазвінелі ручайкі.

«Вясна прыйшла? Прыйшла вясна? — запыталі фіялкі і, падняўшы ўгару галоўкі, здзіўлена раскрылі сінія вочы: — Яна прыйшла! Прыйшла вясна!»









За пяшчотныя кветкі незвычайнага колеру, за прывабны, ні з чым не параўнальны водар людзі палюбілі фіялкі і склалі шмат легенд.

Вось адна з іх — з далёкай Афрыкі.

Над бяскрайнімі пяскамі пустыні, над высокімі гарамі, ганяючыся за пухнатымі воблакамі, бесклапотна пралятаў Малады Вецер. А то, паклікаўшы старэйшых братоў: Бора, Мусона і Фена — гуляў з імі ў хованкі. Вельмі падабалася яму хавацца сярод блакітных кветак.

Толькі заўважыў Вецер, што не адзін ён у даліне. Часта, пабраўшыся за рукі, прыходзілі сюды хлопец і дзяўчына. Яна закахана глядзела ў вочы юнака, а ён уплятаў у косы любімай блакітныя фіялкі. Ды не маглі маладыя застацца на ўсё жыццё разам: дзяўчына была прынцэсай мясцовага племені, а хлопец — чужаком сярод яе народа.

Няўмольна набліжаўся час расстання. Шкада стала Ветру закаханых. Але што рабіць? І тады паклікаў ён старэйшых братоў ды папрасіў дапамогі...

Тысячы блакітных фіялак, быццам казачныя матылькі, падняліся ў неба, ветры падхапілі іх і разнеслі па ўсім свеце...

На ўсё жыццё захавалі юнак і дзяўчына памяць адно пра аднаго, пра свае шчаслівыя сустрэчы, а блакітныя фіялкі сталі сімвалам іх чыстага кахання.

У народнай медыцыне адварамі з фіялак лечаць кашаль, бранхіт і некаторыя іншыя захворванні.

*Анюціны вочкі, або фіялка трохколерная, — адзін з відаў фіялак, якія разводзяць як дэкаратыўныя. Якіх толькі колераў анюціны вочкі не ўпрыгожваюць нашы клумбы!*

# Флёкс

(*русск.* **Флокс**)

*Вандроўныя ў царстве Плутона старога*
*Сцяжыну шукалі да болю ў вачах.*
*Ад цемры і стомы ўзрастала трывога —*
*Ды **флёксы** вандроўным адзначылі шлях.*







Здарылася гэта ў той час, як людзі яшчэ самі сябе абслугоўвалі: і жывёлу разводзілі, і агароды даглядалі, і хлеб пяклі, і ежу здабывалі, і вопратку шылі, і хаты будавалі. Таму шанавалі ў народзе майстроў-умельцаў і складалі пра іх незвычайныя апавяданні. Вось адно з іх.

Жыла ў вёсцы дзяўчына-прыгажуня. Але не толькі харaством славілася, а найперш — умельствам: многія вяскоўцы насілі ды хвалілі ўборы, пашытыя майстрыхай.

Быў у дзяўчыны каханы хлопец — і праз некаторы час яны збіраліся зладзіць вяселле. Але прыйшла нядобрая вестка: забралі суджанага ў салдаты. Горка плакала дзяўчына. Толькі слязамі гору не паможаш. Таму, каб адолець сваю бяду, з ранку да вечара шыла яна ўборы-заказы. Ды ўсё роўна не магла забыцца пра каханага. І так аднойчы задумалася, што незнарок укалола іголкай палец. Упала на зямлю кропелька крыві і — о, дзіва! — вырасла з яе незвычайная пунсовая кветка. Чырвоная, як кропелька дзявочай крыві, і гарачая, як яе каханне.

У перакладзе з грэчаскай мовы «флёкс» азначае «полымя», відаць, за ярка-чырвоную афарбоўку кветак.

У гэтым апавяданні гаворка пра той, першы флёкс, ад якога пайшлі розныя сарты сучасных кветак, якія зараз упрыгожваюць нашы сады і кветнікі.

● *У народнай медыцыне флёкс сібірскі выкарыстоўваецца для прафілактыкі захворванняў горла.*

# Х







## Хрызантэма

(*русск.* **Хризантема**)

*Прывітанне светлае з восеньскай пары:*
*Песня жураўлiная растае ўгары,*
*Іней — пералівамі ў промніках зары,*
***Хрызантэмы** белыя зацвілі ў двары.*

Колькі жыў чалавек — побач з ім заўсёды былі кветкі. Яны аберагалі людское жыллё ад шкоднікаў-нячысцікаў, супакойвалі ў хвіліны расчаравання або гора, радавалі душу і вока хараством у светлыя часіны, аддавалі свае жыццядзейныя сілы і вылечвалі ад цяжкіх хвароб.

А дзякуючы маленькай хрызантэме нават з'явілася новая дзяржава. Вось як гэта было.

Расказваюць, што ў даўнія-даўнія часы правіў Кітаем самаўладны і жорсткі імператар. Даведаўся ён, што на адным востраве расце незвычайная кветка — хрызантэма. Людзі казалі, што з яе соку можна прыгатаваць напой даўгалецця. Толькі сарваць расліну мог чалавек з добрым сэрцам і чыстымі памкненнямі. Але ні імператар, ні прыбліжаныя, людзі злосныя, сквапныя і нядобрыя, не маглі гэта зрабіць.

Таму загадалі пасланць на востраў людзей бязгрэшных — юнакоў і дзяўчат. Але тыя, калі знайшлі кветку, не захацелі вяртацца да імператара і заснавалі сваю дзяржаву, якая называецца Японія.

Японцы вельмі паважаюць хрызантэму і кожную восень адзначаюць свята ў яе гонар.

З пялёсткаў хрызантэмы ў Кітаі і Японіі гатуюць экзатычную салату.

### Салата з хрызантэм

Дробна наразаем лісты або пялёсткі хрызантэм, дадаем пакрышаную цыбуліну і выціскаем сок палавіны лімона. Пасыпаем кропам і паліваем алеем. Вось і ўсё. ***Смачна есці!***

Ц

# Цынія

(*русск.* **Цинния**)

*Першаю з касмічнае прасторы*
***Цынія** зірнула на Зямлю.*
*Роднымі ёй сталі ў небе зоры —*
*Кветку прынялі ў сваю сям'ю.*



Даўным-даўно жылі на Зямлі цыніі — вясёлыя ды мудрыя людзі. Добрай традыцыяй стала для іх рабіць падарункі сабе і сваім блізкім.

Што б ні здарылася: шчаслівае ці не вельмі — цыніі абарочвалі гэта ў свята радасці і весялосці. Надыходзіла вясна — людзі з песнямі засявалі палі; летам шчыра радаваліся сонцу, цёпламу ветру, ціхаму дожджыку, кветкам; калі пачыналася восень, дружна выходзілі ўбіраць багаты плён сваёй працы; марознымі зімовымі вечарамі збіраліся разам ды расказвалі незвычайныя гісторыі. І абавязкова папярэджвалі, асабліва малых, што чужое ніколі не павінна станавіцца тваім.



А яшчэ гэтыя людзі ўзялі за звычай не зрываць кветкі, а любавацца імі жывымі: яркімі, духмянымі, пяшчотнымі. «Трэба радавацца самім і радаваць другіх, — казалі цыніі. — Не існуе чужых: усе людзі блізкія і родныя адзін аднаму на гэтай Зямлі».

Напамінам пра мудры запавет далёкага народа засталіся нам казачныя кветкі, якія называюцца цыніі.

Сёння садаводы з задавальненнем выкарыстоўваюць гэту кветку ў якасці дэкаратыўнага ўпрыгожання клумбаў у нашых парках і скверах.



*Цынія стала першай буйной кветкай, якая ў 2016 г. расцвіла ў апараце Veggie ў бязважкасці на борце Міжнароднай касмічнай станцыі. Але вядома, што яшчэ ў 1982 г. на арбітальнай станцыі Салют-7 дала кветачкі маленькая расліна арабидопсис. Касманаўты падарылі букецік гэтых кветачак Святлане Савіцкай, якая ў той час прыбыла на станцыю.*







# Цюльпан

(*русск.* **Тюльпан**)

*Трэба слухаць душою,*
*Забыцца на зайздрасць-падман,*
*І прыйдзе само сабою*
*Шчасце — кветка* ***цюльпан****.*

Вялікі мастак — Прырода. Бо ні адзін чалавек не можа перадаць на карціне таго багацця колераў і адценняў, якія падарыла вясна зацвіўшым цюльпанам. Тут і снежна-белыя, і агніста-пунсовыя, і сонечна-жоўтыя, і аксамітна-фіялетавыя, і цёмна-чырвоныя, і нават чорна-ліловыя кветкі. І ў кожнай... схавана шчасце. Не верыце? Тады паслухайце адну з самых старажытных легенд пра казачную кветку.

Расла на лузе незвычайная залаціста-жоўтая кветка. Людзі ведалі, што ў яе бутоне схавана шчасце. І кожны марыў забраць яго сабе, але ніхто не мог раскрыць бутон. Так і рос цюльпан з недасягальным шчасцем.

Ішла неяк лугам жанчына са сваім сынам, вясёлым, гарэзлівым. Малы то адбяжыцца, то вернецца назад — усё яму цікава. Але раптам хлопчык спыніўся і здзіўлена ўсклікнуў: «Мама, мама, маленькае сонейка ў траве схавалася». Потым ціхенька падышоў да кветачкі, працягнуў ручку — і бутон раскрыўся, а шчасце ўпала на хлопчыкаву далоньку...

Раскрытая дзіцячая душа, шчырае сэрца і бесклапотны смех зрабілі тое, што не ўдалося ніякай сіле.

*Зараз вядома больш за 3 тысячы разнавіднасцей цюльпанаў самых розных форм і колераў. Гавораць, што чырвоныя цюльпаны азначаюць каханне, а фіялетавыя — вернасць. Цікава, што пялёсткі цюльпанаў ядомыя і выкарыстоўваюцца замест цыбулі.*

Некалі цюльпаны былі самымі дарагімі кветкамі. Кошт адной цыбуліны ў 10 разоў пераўзыходзіў аплату

працы рабочага ў Нідэрландах. Менавіта ў гэтай краіне цюльпаны набылі сусветную папулярнасць.



Сёння ў народнай медыцыне алеем з пялёсткаў цюльпанаў лечаць некаторыя захворванні скуры, прымяняюць яго і ў касметалогіі.

## Чарніцы

(*русск.* **Черника**)

*Ёсць у ягады-**чарніцы***
*Свой сакрэт і таямніцы:*
*Хоць яна чарней ад ночы –*
*Добра лечыць людзям вочы.*



Адна з легенд расказвае, як даўным-даўно жыхароў дрымучых лясоў — гномаў — напаткала вялікае няшчасце: яны пазбавіліся свайго прыстанішча, бо людзі даведаліся пра іх багацці і сталі перакопваць зямлю ў пошуках скарбаў. Доўга блукалі гномы па лесе, пакуль, нарэшце, куст чарнічніку не пашкадаваў іх і не схаваў пад сваімі галінкамі. За дапамогу ўдзячныя гномы рассялілі чарніцы па ўсім свеце. Яны быццам бы ведалі, што чарніцы, акрамя ўсяго, вельмі карысныя — валодаюць лекавымі ўласцівасцямі: паляпшаюць зрок.



У наш час чарніцы карыстаюцца вялікай павагай кулінараў, якія гатуюць з іх ягад кампот, гарбату, сок, сіроп, кісель, варэнне і нават цукеркі. А пірагі з чарніцамі лічацца смачнейшымі за ўсе астатнія.

### Сняданак з чарніцамі

На невялічкай патэльні распускаем 3 сталовыя лыжкі мёду, на яго выкладваем трэць шклянкі ачышчаных лясных арэхаў і старанна перамешваем. Даем трохі астыць. На талеркі аднолькавымі порцыямі раскладваем палову шклянкі ёгурту, а зверху (зноў жа роўнымі порцыямі) — чарніцы і арэхі з мёдам. Вось і ўсё. ***Смачна есці!***









## Чартапалох

(*русск.* **Чертополох**)

*Як збіраліся ў дарогу*
*Нашы прадзеды-дзяды,*
*Колкі ліст* ***чартапалоху***
*Клалі ў торбачку заўжды.*

Чартапалох можна сустрэць паўсюль: у Азіі, Амерыцы, Аўстраліі, Афрыцы, у Еўропе і нават каля сцюдзёнай Арктыкі. Сёння налічваюць каля 120 відаў гэтай калючай расліны. Таму, напэўна, і кажуць, што чартапалох усякую траву перарасце. За што і не любяць яго. А вось пчолам ды некаторым птушкам, напрыклад шчыглам, чартапалох падабаецца.

Раней верылі, што гэта расліна валодае незвычайнай сілай, таму папярэджвалі: каб у дарозе абараніцца ад нячысціка ці чорта, трэба кінуць у яго калючую шышку чартапалоху. Так расліна і атрымала сваю назву: разганяе, палохае чарцей. Аднак яе кветкі вельмі любяць пчолы — збіраюць з іх многа духмянага нектару.

Чартапалох — лекавая расліна: адварам лечаць запаленні верхніх дыхальных шляхоў, расстройствы нервовай сістэмы.

Як не дзіўна, але некаторыя ўжываюць чартапалох: рыхтуюць салаты, супы, назапашваюць яго на зіму.

*Чартапалох — сімвал Шатландыі, эмблема рыцараў Ордэна Чартапалоху (другі злева на малюнку).*



# Чарэшня

(*русск.* **Черешня**)

*Летнім ранкам, сонечна-кваяцістым,*
*На **чарэшні** верабей спявае:*
*Звонкім голасам, пявуча-чыстым,*
*Ён сяброў у госці запрашае.*



Як сцвярджаюць вучоныя, раней чарэшню не адрознівалі ад вішні, а называлі проста: вішня салодкая і вішня кіслая. У краінах Еўропы і зараз выкарыстоўваюцца гэтыя назвы.

Адны даследчыкі лічаць, што чарэшня трапіла да нас дзякуючы старажытным рымлянам, якія здабылі яе ў бітвах як каштоўны трафей. А ўжо са Старажытнага Рыма расліна разышлася па ўсёй Еўропе. Другія пераконваюць: чарэшню разнеслі па Еўропе... птушкі. Каму тут верыць?



Сёння ў свеце налічваецца каля 4 тысяч сартоў чарэшні, але іх далёкім «продкам» з'яўляецца вішня птушыная.

Чарэшня — каштоўная пладовая культура. З аднаго дрэва збіраюць да 45 кілаграмаў ягад.

Ягады чарэшні карысныя не толькі тым, што маюць прыемны салодкі смак, але і тым, што яны багатыя на вітаміны. Таму з чарэшні атрымліваюць сок, гатуюць кампоты, варэнне, джэм, павідла.



**Летні напой з чарэшняй**

Ягады чарэшні (150 г) прамываем, абсушваем, выдаляем костачкі. Кладзём у блэндар. Затым 50 г аўсяных шматкоў высыпаем у глыбокую міску і заліваем 200 г падагрэтага малака. Калі шматкі набухлі, выліваем іх у блэндар. Дадаем чайную лыжку распушчанага мёду. Уключыўшы блэндар, здрабняем усю масу да аднароднага стану. Вось і ўсё. ***Смачна есці!***



# Чыстацел

(*русск.* **Чистотел**)

*Сонца веснявю парою*
*Усміхнулася іскрыста:*
*У гародзе каля тына*
***Чыстацел** зацвіў фарсіста.*



Людзі даўно заўважылі: калі пачынае дзьмуць вясенні вецер, прылятаюць ластаўкі, а з іх прылётам зацвітае «ластаўчына» трава. Так называлі чыстацел. А народнае павер'е кажа, што, калі часам птушаня слепне, маці-ластаўка корміць малое чыстацелам і вылечвае.

Людзі лічаць «ластаўчыну» траву за пустазелле і выдаляюць з прысядзібных участкаў высокія, да 1 метра, ярка-зялёныя расліны з залаціста-жоўтымі кветкамі. Аднак і тады чыстацел «пакідае пра сябе памяць»: з сарванай сцяблінкі выступае і ліпне да рук жоўта-аранжавы сок. Толькі не каштуйце — ён ядавіты, вельмі горкі, а трапіць у вочы — пячэцца.

Сёння мы ведаем гэту расліну пад назвай «чыстацел», таму што яна «чысціць», «ачышчае» цела: свежым сокам лечаць раны, выводзяць бародаўкі.

*Чыстацел — моцны інсектыцыдны сродак, мае і бактэрыцыдныя ўласцівасці. З каранёў атрымліваюць жоўтую фарбу, з насення — алей.*



# Шпажнік

(*русск.* **Гладиолус**)

*Быццам раць на абарону краю ўстала,*
*Выйшла строем — да пляча плячо.*
*Гэта **шпажніку** на градцы месца мала...*
*Росы ззяюць на клінках мячоў...*

У далёкай старажытнасці корань шпажніку выкарыстоўвалі як амулет-абярэг, што засцерагаў у баі і ра-



Ш

таваў ад смерці. Ды і сама назва кветкі «ваяўнічая»: меч, клінок шпагі з кропелькамі крыві. Невыпадкова, што ў Старажытным Рыме шпажнік лічыўся кветкай гладыятараў.

А ў Паўднёвай Афрыцы існуе другая легенда.

На невялікае паселішча напалі ворагі. Многіх забілі, многіх забралі ў палон. Але старэйшыне з некалькімі жыхарамі ўдалося ўратавацца, і яны схавалі ад захопнікаў самыя каштоўныя скарбы. Ворагі доўга шукалі, але нічога не атрымалася. І тады, каб знайсці каштоўнасці і старэйшыну, доўга здзекаваліся з яго прыгажуні-дачкі. Але тая маўчала. Разгневаны важак загадаў забіць дзяўчыну на вачах у землякоў...

Не паспеў меч дакрануцца да шыі дзяўчыны, як багі пératварылі яго ў незвычайную кветку з пурпурова-чырвонымі бутонамі. Убачыўшы гэты цуд, захопнікі зразумелі, што багі асуджаюць іх, і збеглі з паселішча.

А дачка старэйшыны засталася жывою.

Яшчэ кажуць, што букет шпажніку, пастаўлены ў доме, перадае сваю сілу гаспадарам.

Сёння шпажнік, або гладыёлус, — адна з любімых кветак садаводаў за разнастайнасць колераў і адценняў: белых, ружовых, лілова-пурпуровых...



*Шпажнік чарапіцавы*

● *Шпажнік чарапіцавы занесены ў Чырвоную кнігу Рэспублікі Беларусь.*













# Шыпшына

(*русск.* **Шиповник**)

*Ёсць у ягадах* ***шыпшыны***
*Для цябе ўсе вітаміны.*
*Ты пра іх не забывай!*
*На здароўе! Спажывай!*

Ва ўсе вякі народы свету шанавалі шыпшыну за прыгажосць ды лекавыя ўласцівасці. І складалі дзівосныя легенды, паданні пра яе.

Жыла ў вёсцы дзяўчынка. Прыгожая была яна, але з беднай сям'і. Ішоў час, падрастала дзяўчынка — і ўсё больш прыгажэла. Многія юнакі заглядаліся на яе. Толькі дзяўчына аддала сваё сэрца маладому юнаку-суседу, хлопцу прыгожаму ды адважнаму, але таксама бедняку. Тады вясковец-багацей, заляцанням якога красуня адмовіла, вырашыў сілай забраць яе да сябе. Каб не дастацца нялюбаму, уцякла дзяўчына ў лес і там...

На месцы, дзе загінула непакорная прыгажуня, вырас зялёны куст з дзівоснымі ружовымі кветкамі, пакрыты для абароны вострымі шыпамі.

Шыпшына — унікальная расліна — яе пялёсткі, плады, алей шырока выкарыстоўваюцца не толькі ў медыцыне для лячэння розных хвароб (цынгі, захворванняў сэрца, страўніка, печані, нырак, вачэй), але і ў кулінарыі.

Шыпшына — кладоўка вітаміну С, якога ў ягадах больш, чым у лімоне ці антонаўках. Таму з іх гатуюць лекавыя або вітамінныя кісялі, кампоты, гарбату, сіропы, павідла, варэнне. А з падсмажаных пладоў — нават... каву з водарам ванілі.

### Адвар «Усе вітаміны з шыпшыны»

Выдаляем костачкі з ягад шыпшыны і раскладваем у слоікі. Потым ставім слоікі на вадзяную лазню і даводзім да кіпення. Кіпяцім 10 хвілін, пакідаем астываць. А каб напой быў яшчэ больш карысным і смачным, можна дадаць у яго мёд. Вось і ўсё. ***Смачна есці!***

Э

# Эдэльвейс

(*русск.* **Эдельвейс**)

*Дзе вяршыні горныя*
*Воблакі кранаюць,*
***Эдэльвейсы** гордыя*
*Ўлетку зацвітаюць.*



У нас гэту кветку наўрад ці сустрэнеш, таму што расце яна высока ў гарах, куды чалавеку складана дабрацца. Але ўсё роўна людзей гэта не палохае, бо яны ўпэўнены: хто знойдзе кветку, для таго не будзе ў жыцці нічога немагчымага...

Пра эдэльвейс бытуе шмат легенд, асабліва сярод насельнікаў горных краін. Вось адна з іх.



Даўно тое было, але не забылася і не згубілася за смугою гадоў. Жыла ў альпійскім паселішчы вельмі прыгожая (а можа, і самая прыгожая) дзяўчына. Ды толькі характар яе азмрочваў жорсткі і капрызны характар. Але многія маладыя людзі прапаноўвалі красуні руку і сэрца. Для ўсіх у дзяўчыны быў адзін адказ: «Выйду замуж толькі за таго, хто прынясе мне букецік эдэльвейсаў». Згаджаліся юнакі, ішлі на пошукі кветак — і вярталіся ні з чым. А прыгажуня ўсё настойвала на сваім...

Праз колькі гадоў спраўдзілася жаданне капрызніцы: нарэшце яна атрымала букецік эдэльвейсаў. Але...



Юнак не захацеў узяць яе за жонку, бо перад ім сядзела не прыгажуня, а састарэлая жанчына...

Эдэльвейс — расліна-сухацвет. Таму яго іншы раз называюць кветкай бессмяротнасці.

*У медыцыне эдэльвейс выкарыстоўваецца як сродак для лячэння рэўматызму, органаў дыхання і стрававання, а таксама для ўмацавання імунітэту арганізма.*



Пад ламачча бор стары
Пахаваў свае дары.
Пераблытаў тыя сцежкі,
Дзе прыціхлі сыраежкі.
Ды ніжэй нагнуў сукі,
Каб схаваць баравікі...
Ты ж, мой дружа, не зявай –
Скарб крамяны адшукай!





*Бору-лесу*
*будзь удзячны:*
*пакланіся —*
*ён аддзячыць!*

# А

## Абабак, падбярозавік, бабка
(*русск.* **Подберезовик**)

*Ледзь пачаўся новы дзень,*
*А яны забеглі ў цень*
*Ды ад сонца ўздзелі шапкі*
*Пад бярозамі* ***ababкі***.







Аматары «ціхага палявання» назавуць вам некалькі відаў гэтых грыбоў, якія часцей за ўсё сустракаюцца ў бярозавых зарасніках. Першы расце ў сырых мясцінах сярод рэдкага бярэзніку, уздоўж дарог, на ўзлесках і палянах. У яго доўгая тонкая ножка і мяккая шэрая шапачка. Другі можна знайсці ў сухіх бярозавых пералесках. Выглядае грыб «салідна»: моцны, крамяны, на тоўстай цёмнай ножцы і ў чорна-бурай шапачцы. А трэці выбірае сырыя бярэзнікі і селіцца нават каля балот. На выгляд — не вельмі прывабны: дробны, кволы, на тонкай ножцы, у зеленавата-белай шапачцы. Абабкі — трубчастыя грыбы, гэта значыць, што пад шапачкай у іх ёсць ледзь прыметныя трубачкі.

Усе абабкі ядомыя. З іх можна прыгатаваць шмат смачных страў. Толькі не збірайце старыя грыбы, якія перараслі: у іх могуць змяшчацца ядавітыя рэчывы.

*Вучоныя высветлілі, што ў абабках і падасінавіках утрымліваецца вітамін $B_1$ (тыямін), і яго ў грыбах не менш, чым у зерневых прадуктах.*









# Апенька восеньская

(*русск.* **Опенок осенний**)



*Абляпілі пень старэнькі*
*Танканогія* ***апенькі*** *—*
*Як да дзеда яго ўнукі,*
*Так і просяцца на рукі.*

Знайсці гэтыя грыбы можна ў чыстых старых і маладых бярэзніках, у змешаных лясах ды на высечках. У сасняках яны не растуць, атакуюць дружныя сямейкі апенькаў бярозавыя, асінавыя, яловыя і нават дубовыя пні ці пянькі. Аднак і гэтага ім мала. Быццам верхалазы, узбіраюцца яны па ствалах даволі высока — часам на 3 метры, а потым жыцця не даюць дрэву. Маладое хварэе ад іх 3 гады і гіне, старое — да 10 гадоў. Таму ў навуцы за імі замацавалася «вайсковая» назва — *armillaria mellea*, грыбы-армейцы, штурмавікі лесу.



Апенька летняя

Дрэву такія «штурмы» не на карысць, а вось грыбнікам — на радасць, бо апенькі, як і лісічкі, не чапаюць грыбныя мухі — яны ніколі не бываюць чарвівыя. А яшчэ знаўцы кажуць, што самыя смачныя грыбы (пасля рыжыкаў) — смажаныя апенькі і супы з імі, а пасля рыжыкаў і груздоў — марынаваныя і засоленыя апенькі. Для гэтых грыбоў характэрны моцны грыбны пах і смак, шчыльная белая мякаць.



Апенька восеньская



Апенька зімовая

- *Каб не пераблытаць апеньку восеньскую з неядомымі грыбамі, памятайце, што на яе шапачцы ёсць лускавінкі і на ножцы плевачнае кольца. Апенька — пласціністы грыб (у яе пад шапачкай — пласцінкі).*











**Б**

## Баравік, белы грыб

(*русск.* **Белый гриб, боровик**)

*Ледзь не плачуць грыбнікі —*
*Мабыць, лёс у іх такі:*
*Пад галлё ды пад сукі*
*Збеглі ўсе **баравікі**.*



Баравік — самы каштоўны і карысны грыб у нашых лясах, «цар грыбоў». Яго можна смажыць, тушыць, варыць, сушыць, марынаваць, кансерваваць — заўсёды будзе смаката! Расце паўсюль: у сасновым бары, у маладым ельніку, у сухім бярэзніку, на ўзлеску, уздоўж дарог і сцяжынак. Цікава, што баравікі сябруюць з пэўнымі дрэвамі. Баравік яловы расце пад елкамі, баравік дубовы — пад дубамі. Таму і шапачкі ў іх бываюць розныя: цёмна-карычневыя, бурыя, светлыя. Але знізу ўсе яны трубчастыя. У адрозненне ад іншых грыбоў, якія падчас сушкі чарнеюць, у баравіка ніжняя частка і ножка застаюцца белымі.



Няма смачнейшага сушанага грыба за белы грыб!

- *Баравікі валодаюць лекавымі ўласцівасцямі: у іх знойдзены танізуючыя і проціпухлінныя рэчывы. Ужыванне баравікоў умацоўвае імунітэт, аднаўляе сілы пасля перанесеных інфекцый.*





# Бледная паганка

(*русск.* **Бледная поганка**)

*Хоць прывабна выглядае*
*На паляне летнім ранкам,*
*Ды характар злосны мае*
*Бела-**бледная паганка**.*



Сярод грыбоў нашых лясоў — гэта самы страшны і ядавіты грыб. Нават «хуткая дапамога» не зможа выратаваць таго, хто выпадкова пакаштуе хаця б маленькі кавалачак гэтага ляснога «гасцінца».

Каб не памыліцца і не пакласці ў кош такога шкодніка, вось яго «партрэт»: шапачка можа быць белай, шэра-белай, жаўтаватай, зеленаватай. На шапачцы — камячкі-лускавінкі белай плеўкі. Плеўкай поўнасцю закутаныя маладыя грыбы. Пласцінкі шапачкі — белыя. Ножка — таксама белая, доўгая, унізе падобная да булавы. Пад шапачкай, вакол ножкі, — плеўка-кольца. Таму грыб нагадвае светлы парасон з пояскам. Расце ён з чэрвеня да лістапада ў светлых лясах, на ўзлесках, лугавінах.



*Бледная паганка вельмі падобная да шампіньёнаў, таму, каб пазбегнуць атручэння, трэба добра ведаць грыбы, пачынаць «ціхае паляванне» разам з вопытнымі грыбнікамі. А яшчэ лепш — набываць грыбы ў краме.*







# В





## Валуй

(*русск.* **Валуй**)

*Піць вавёрка захацела –*
*Ля грыбка нясмела села:*
*Сілы ў спёку падмацуй*
*Мне вадой жывой,* ***валуй.***

Расце валуй з ліпеня да кастрычніка ў бярозавых, дубовых і сасновых лясах. Шапачка ў яго жоўта-бурая ці светла-жоўтая, бліскучая, ножка тоўстая.

Валуй — пласціністы грыб, пласцінкі ў яго жоўта-белыя. У сырое надвор'е на іх выдзяляюцца кропелькі вільгаці. Скурка з грыба амаль не здымаецца. Грыбнікі не вельмі паважліва ставяцца да валуя за гаркаваты смак і непрыемны пах сырасці, які зусім знікае ў вельмі спякотнае ці, наадварот, вельмі сырое надвор'е. Аднак прафесіяналы-кулінары кажуць, што валуі вельмі смачныя салёныя (лепш браць шапачкі маладых грыбоў і спачатку крыху іх адварваць). Акрамя таго, з іх атрымліваецца не менш смачная грыбная ікра.

*Ці ведаеце вы, што грыбы — адны са старэйшых насельнікаў Зямлі, нават старэйшыя за дыназаўраў. Пра гэта сведчыць знаходка акамянелага грыба, якому прыкладна 400 мільёнаў гадоў.*



## Ваўнянка

(*русск.* **Волнушка**)

*Вярнулася «бабіна лета» —*
*Пяшчотай зямля сагрэта.*
*А ў лесе прагалы-палянкі*
*Ўсыпалі густа* ***ваўнянкі.***

Чаму ў гэтага грыба такая незайздросная доля? І кланяюцца яму людзі з неахвотай, і ў кош кладуць



у самы апошні момант, калі другіх грыбоў няма. Хаця выглядае грыб даволі прывабна: шапачка, пушыстая па краях, знізу пласціністая, ружовага ці жоўта-ружовага колеру, з чырвонымі кругамі, якія нагадваюць «гадавыя кольцы» зрэзаных дрэў. Ножка кароткая, трохі святлейшая за шапачку. Калі яе разламаць, то з'явяцца кропелькі белага соку, горкага на смак.



Цэлыя карагоды гэтых прыгажунь можна сустрэць у бярозавых ці змешаных лясах з ліпеня па кастрычнік. Вядома, што лепшая сяброўка ваўнянкі сярод дрэў — бяроза. Там і трэба шукаць гэтыя грыбы, калі хочацца зімой смачна паесці.



## Гаркуха

(*русск.* **Горькушка**)

*Што, ідуць на «паляванне»*
*Грыбнікі яшчэ ад рання?*
*Да зямлі схіліла вуха —*
*Чуйна слухае* ***гаркуха****.*



Чырвона-карычневая шапачка гэтага грыба сухая, шаўкавістая, з пласцінкамі знізу. Ножка невысокая, святлейшая за шапачку, ля зямлі з белаватым лямцам. З'яўляецца ў лесе вельмі рана: у сярэдзіне мая — і расце да сярэдзіны кастрычніка. Сустракаецца па адной ці цэлымі сем'ямі ў лясах, багатых вільгаццю.



Грыб ядомы, але звычайна яго не ўжываюць у ежу, бо гаркуха мае едка-горкі смак з-за малочна-белага соку. Вядомыя рэцэпты засолкі гэтых грыбоў, але яны патрабуюць працяглага вымочвання ці адварвання.

*Памятайце! Ужываць усе грыбы дзецям да 12 гадоў не рэкамендуецца. Можна толькі* ***чайны грыб****, які расце не ў зямлі, а ў слоіку. Напой з гэтага грыба праганяе смагу, дапамагае вылечваць запаленні і ўмацоўваць імунітэт.*





# Гнаявік

(*русск.* **Навозник**)

*На мяне ніхто не гляне,*
*Браць ніхто мяне не звык, —*
*Гэтак жальбіць на паляне*
*Грыб-загадка — **гнаявік**.*

Унікальны гэты грыб ужо тым, што не патрабуе далёкіх паходаў, бо адшукаць яго можна нават каля хаты, у агародзе ці ў садзе. Назва адпавядае месцу «жыхарства»: добра ўгноеныя, багатыя на перагной глебы, а таксама сметнікі або кучы кампосту. І дзіўна, што ў такіх непрывабных мясцінах вырастае снежнабелы прыгажун.



А расце ён так хутка, што ні адзін грыб (акрамя дажджавіка) не ўгоніцца за ім.

Гнаявік вядомы чалавеку ўжо больш за 300 гадоў. Аднак да сённяшняга дня канчаткова не вывучаны і выклікае нямала спрэчак. Хаця знаўцы кажуць, што грыб гэты не проста ядомы, а вельмі смачны. Прыдатнымі да ўжывання з'яўляюцца маладыя грыбы, у якіх салодкая, без соку, чыста-белая мякаць.



Цікава паназіраць, як расце грыб. Спачатку на перагноі з'яўляецца белае яйцо, потым вырастае белы званочак, які ператвараецца ў шар, а ўжо з яго — белы парасон шапачкі з пласцінкамі. Краі шапачкі размякчаюцца, разрываюцца, раскалмачваюцца, і паступова адслойваюцца цямнейшыя за капялюшык лускавінкі. Не паспееў азірнуцца, і вось ужо перад намі прыгажун на доўгай ножцы.

*Кароткі век у гнаевіка. Грыб хутка старэе, чарнее і расплываецца чарнільнай кляксай. Па гэтай прычыне вучоныя яшчэ называюць гнаявік «чарнільным» або «дзягцярным» грыбам.*

## Грузд

(*русск.* **Груздь**)

*Ты вазьмі найбольшы кош,*
*Навастры зараней нож,*
*Бо ў бярэзніку заўжды*
*Знойдзеш белыя* ***грузды****.*



Белы грузд



Чорны грузд



Гэты грыб — грузд — любіць пагуляць з грыбнікамі ў хованкі: залезе пад лісцікі ці ігліцу, схаваецца-прытоіцца — толькі невялікія ўзгорачкі-купінкі відаць. Адкінеш лісце — а там цэлая сям'я. І ўсе як на падбор: крамяныя, у белых шапачках з пласцінкамі, на невысокіх белых ножках. Прыгледзеўшыся, можна заўважыць светлыя кругі на паверхні. А па краях шапачак звісаюць пушыстыя махры.

Хараство — ды і толькі! Грузды бываюць не толькі белыя, але і жоўтыя, і нават чорныя. Гэта ядомыя грыбы, якія часцей за ўсё выкарыстоўваюцца ў засоленым выглядзе. Патрабуюць вымочвання ці адварвання.

*Грыбы на 90 % складаюцца з вады. У састаў пладовых цел грыбоў уваходзяць бялкі, глюкоза, глікаген, вітаміны B, C, D, PP, ферменты.*

Д

## Дажджавік

(*русск.* **Дождевик**)

*Ад дажджу забег пад клён,*
*Да карэння там прынік,*
*Бо дажджу не любіць ён,*
*Хоць завецца* ***дажджавік****.*



Гэты грыб называюць заечай бульбай, чортавай табакеркай, воўчым тытунём ці порхаўкай. Расце на лугах, на пашах, у лясах і нават у парках і скверах. Мае даволі незвычайны выгляд: круглая, як шар, белая





галоўка з шыпікамі паступова пераходзіць у тоўстую ножку. Калі грыб пастарэе, яго белая мякаць становіцца зеленавата-жоўтай або аліўкава-карычневай. Трапіць пад нагу высахлы грыб — і цэлае воблака зеленавата-карычневага дыму ўзаўецца ўверх.

*Грыб валодае лекавымі ўласцівасцямі. З сушаных дажджавікоў гатуюць настойкі для лячэння печані, скуры, вывядзення цяжкіх металаў. Каб спыніць кроў і суцішыць боль, дастаткова разламаць малады грыб і прыкласці яго да ранкі. Дажджавікі — ядомыя грыбы, але ўжываюць часцей за ўсё маладыя экзэмпляры.*

3

## Зялёнка

(*русск.* **Зеленка**)

*Верасень руплiва*
*Лес наведаў гонкi,*
*Глянуў клапатлiва,*
*Цi растуць* ***зялёнкi****.*





Цікавы гэты грыб: і прыгожы, і смачны — а людзі не вельмі любяць яго браць, бо лянуюцца адмываць. Так і прападае часам смакоцце.

Аднак зялёнкі не брудныя: проста любяць сухія сасновыя лясы і пясчаныя глебы. Там, амаль схаваўшыся ў зямлі, растуць і па адным, і цэлымі сем'ямі... Таму, каб прыгатаваць грыбны пачастунак, трэба добра вымыць зеленавата-жоўтыя ці нават аліўкава-карычневыя шапачкі ад наліплага пяску.

Ад другіх грыбоў зялёнка адрозніваецца тым, што не толькі ў лесе, але і ў... талерцы супу можна яе беспамылкова пазнаць: пры адварванні грыб не толькі не губляе свой колер, а становіцца яшчэ зелянейшым.

Адрозніваецца зялёнка прыемным мучным пахам. Смачная ў смажаным, салёным і марынаваным выглядзе.

# Казляк

(*русск.* **Козляк, решетник**)

*Да чаго ж ужо дажыўся,*
*Што не ўцямлю я ніяк:*
*Хоць прывабным нарадзіўся,*
*А завуць мяне —* ***казляк.***





Растуць гэтыя грыбы цэлымі сем'ямі на вільготных імшаніках у ельніках ды сасонніках. Неспрактыкаваным грыбнікам можа падацца, што гэта маслякі: такія ж слізкія жоўта-шэрыя, рыжавата-жоўтыя ці буравата шапачкі з трубачкамі знізу. Аднак плеўка з іх амаль не здымаецца. Ножкі ў казлякоў пад колер шапачкі ці трошкі святлейшыя. Людзі кажуць, што гэтыя грыбы «касалапыя»: часта стаяць яны на сагнутых ножках, скрыўленых ля самай зямлі.

Казляк — ядомы грыб, але рэкардсмен па чарвівасці. Нават, калі ножка на зрэзе чыстая, шапачку трэба разрэзаць і праверыць — яна можа быць чарвівай.

*З высушаных казлякоў атрымліваюць духмяную грыбную муку для запраўкі мясных, рысавых страў і соусаў.*

# Каўпак кольчаты, курка

(*русск.* **Колпак кольчатый, курочка**)

*Што за дзіва, што за цуд?*
*Запытае, хто ні гляне.*
*І адкуль іх столькі тут,*
***Курак*** *на паляне?*



Афіцыйная назва грыба тлумачыцца проста: верхняя частка — шапачка — нагадвае каўпак, а на ножцы маецца белае кольца. Вось і атрымліваецца — каўпак кольчаты. Але чаму яшчэ і курка?







Народ вельмі ашчадна ставіцца да слова і невыпадкова выбірае адпаведныя назвы. Так атрымалася і з каўпаком кольчатым, смак якога нагадвае курынае мяса. Ці, можа, вялікая сям'я гэтых жаўтаватых, розных па памеры, грыбоў нагадвае курыную сям'ю, калі маціквактуха вывела дзетак-куранятак на прагулку?



Як бы то ні было, але ў нас гэтыя грыбы ў пашане. Растуць яны з ліпеня па кастрычнік у сасновых лясах сярод імхоў, на глебе з верхавым торфам і ў ельніках на кіслай глебе. Тут іх — толькі паспявай зразаць! Аднак памятайце, што растуць яны часам далекавата адзін ад аднаго. Таму не забывайце аглядацца.

Пазнаць курку, або курачку, даволі лёгка: шапачка бывае жоўтая ці светла-карычневая і быццам прысыпана светлым пылком. Пад ёй — пласцінкі. Ножка жаўтаватая, роўная, да 12 сантыметраў у вышыню і дыяметрам да 3 сантыметраў. Пад каўпаком ёсць кольца-плеўка.

*Каўпак кольчаты валодае лекавымі ўласцівасцямі: патоўчаныя сухія грыбы змешваюць з мёдам, салам і атрымліваюць лячэбны кампрэс.*

Л

## Лісічка

(*русск.* **Лисичка**)

*Нельга тут не падзівіцца –*
*Мох у лесе залаціцца:*
*Як манеткі невялічкі,*
*Дол усыпалі **лісічкі**.*



Гэта самыя раннія з летніх грыбоў. Растуць з пачатку лета і да восені ў бярозавых, хваёвых або змешаных лясах. Яны заўсёды навідавоку, бо цэлымі сем'ямі разбягаюцца па зялёным моху ці лясной траве. А якое хараство! Суцэльныя ножкі, тонкія ўнізе, паступова





пераходзяць у ярка-рыжыя або жоўтыя шапачкі, падобныя да лейкі ці крохкай вазачкі. Мякаць грыба белая, шчыльная з прыемным пахам і смакам.

З-за жоўта-рыжай афарбоўкі гэтыя пласціністыя грыбы носяць імя лясной хітрухі. А яшчэ яны адметныя тым, што амаль ніколі не бываюць чарвівымі.

Лісічка — добра вядомы ядомы грыб, які ўтрымлівае вітаміны PP, групы B і мікраэлементы (цынк, медзь).



*Лісічкі валодаюць procіпухлінныmі ўласцівасцямі і здольныя без шкоды для арганізма пазбаўляць чалавека ад паразітаў.*

## Лось

(*русск.* **Саркодон**)

*— Што, унучак, прыпыніўся*
*Ды на цуда задзівіўся?*
*Не чакай, грыбы нясі,*
*Што завуць у нас **ласі**.*



Са жніўня да лістапада ў хваёвых лясах сустракаюцца грыбы, якія маюць «жывёльную» назву. Буравatым ці чорна-бурым колерам яны падобны да акрасу згаданай жывёлы. Шапачка, пакрытая, нібы чарапіцай, завостранымі лускавінкамі, немаленькая: можа быць да 20 сантыметраў у дыяметры. Знізу на ёй — пласцінкі. Ножка, афарбаваная пад колер грыба, таксама даволі доўгая — да 8 сантыметраў. Мякаць гаркаватая на смак, бруднавата-шэрая, шчыльная з незвычайным вострым смакам. Лось — малавядомы ўмоўна-ядомы грыб, прычым спажываюцца толькі маладыя экзэмпляры ў сушаным ці смажаным выглядзе.



*Вучоныя налічылі на Зямлі больш за мільён відаў грыбоў. У гэты лік уваходзяць дрожджы, губы, чайны грыб і іншыя.*



# М

## Масляк

(*русск.* **Масленок**)

*Шапачкі рудзенькія,*
*Слізкія бакі:*
*Гэта маладзенькія*
*Франты-**маслякі.***





Грыбы гэтыя растуць вялікімі сем'ямі ў маладых сасновых лясах, на ўзлесках, у хвойных зарасніках да позняй восені. Сустракаюцца і ў сухім бары, і ў лішайнікавым сасняку, і на месцах пажараў. Вельмі любяць святло. У сырое ці дажджлівае надвор'е трубчастая шапачка бывае слізкай, масляністай, часта аблепленай ігліцай. Па гэтай прычыне, верагодна, і назвалі яго масляком. Хаця ёсць і другая версія: сваім колерам грыб нагадвае сметанковае масла — такі ж жаўтаваты. А вось калі надвор'е сухое, то і шапачка масляка бліскучая, шаўкавістая, жаўтавата-карычнева-бурая. Ніжняя частка грыба светла-жоўтая. Краі шапачкі злучаны з ножкай даволі шчыльнай плеўкай, якая з цягам часу разрываецца і ўтварае вакол ножкі кольца.

Маслякі — вельмі карысныя і смачныя грыбы. Грыбнікі кажуць, што іх мякаць, якая не цямнее на месцы злому, мае смак і пах яблыка.

*Калі вы збіраецеся смажыць або марынаваць маслякі, то не забудзьце зняць скурку. А калі збіраецеся сушыць, то скурку здымаць не абавязкова. Вось так!*







# Махавік

(*русск.* **Моховик**)

*Глянь, ад нас грыбок схаваўся:*
*У зялёны мох забраўся*
*І да лісціка прынік*
*Жоўта-буры* ***махавік.***



У нашых краях сустракаецца шмат розных махавікоў: стракаты, жоўта-буры, зялёны, чырвоны. Па афарбоўцы гэты грыб часта блытаюць з казляком і называюць балотавікам. А па форме — з падасінавікам. Растуць махавікі вялікімі сем'ямі на імшаніках, у вільготных сасновых лясах або на пясчанай лясной глебе. Па адным сустракаюцца рэдка. Шапачка ў гэтага грыба выпуклая, знізу — трубчастая, ножка — бледна-жоўтая, з бураватым адценнем. Мякаць жаўтаватая, на зрэзе пачынае сінець — гэта асноўнае адрозненне махавікоў. Да гэтай сям'і належыць і ўсім вядомы польскі грыб.



*Польскі грыб*



*Махавікі — ядомыя грыбы з характэрным, прыемным грыбным смакам. Іх смажаць, сушаць, марынуюць, соляць.*

# Мухамор

(*русск.* **Мухомор**)

*Шапку ў крапінкі надзеў,*
*Падмануць нас захацеў.*
*— Я ўпрыгожу гэты бор, —*
*Кажа хітра* ***мухамор.***



Гэтыя часцей за ўсё ярка-чырвоныя з белымі крапінкамі грыбы ад пачатку лета і да позняй восені ўпрыгожваюць нашы лясы. Звычайна яны растуць сем'ямі. Людзі кажуць, што ні адзін грыб не можа параўнацца з чырвоным мухаморам сваім хараством.



Толькі трэба памятаць і быць вельмі асцярожнымі: лясныя прыгажуны — вельмі ядавітыя. Калі дажджы пазмываюць белыя крапінкі з іх шапачак, то грыбы вельмі лёгка пераблытаць з чырвонымі сыраежкамі, якія таксама пласціністыя. Каб не памыліцца, варта памятаць, што сыраежкі не маюць на ножцы каўнерыка-кольца.



Мухамор пантэрны

- *Здаўна вядомыя таксічныя ўласцівасці настою мухамора для насякомых. Але ўстаноўлена і тое, што ласі лечацца гэтымі грыбамі.*
- *Трэба памятаць, што мухамор пантэрны вельмі ядавіты грыб!*

П

## Падасінавік, чырванагаловік

(*русск.* **Подосиновик**)

*Там, дзе гай шуміць зялёны,*
*Між ствалоў асінавых,*
*Капялюш надзеў чырвоны*
*Яркі падасінавік.*



Іх можна сустрэць не толькі пад асінамі, але і пад бярозамі, і пад соснамі ды елкамі, і на палянах ды на ўзлесках. Здалёк відаць іх яркія шапачкі: чырвоныя і цёмна-чырвоныя — у асінніках, бела-ружовыя — у сырых барах, шэрыя — у таполевых зарасніках, аранжавыя, жоўта-чырвоныя ці бура-жоўтыя — у змешаных лясах.

Чым жа яшчэ адрозніваецца трубчасты падасінавік ад іншых грыбоў, акрамя чырвонай шапачкі, — яго ножка на зрэзе сінее і нават чарнее.



- *Кажуць, што па сваіх смакавых якасцях падасінавік займае другое месца пасля баравіка. Яго смажаць, марынуюць, сушаць і соляць. Каб паменшыць пацямненне, перад прыгатаваннем вытрымліваюць у вадзе з лімоннай кіслатой.*

## Падзялёнка, радоўка шэрая

(*русск.* Подзелёнка, рядовка серая)



*Адны сцвярджаюць: «**Падзялёнкі***
*Забеглі ў гонкія сасонкі».*
*Другія кажуць: «Не, галоўкі*
*Схавалі там у мох радоўкі».*



Можна сказаць, што падзялёнкі — родныя сёстры зялёнак, бо, як і тыя, сустракаюцца ў вялікіх сасновых барах з верасня і растуць да першых замаразкаў. Ёсць і другая назва, якая паходзіць ад таго, што грыбы растуць радамі. І зялёнкі, і падзялёнкі належаць да радовак.

Ножка ў грыба роўная, белая, часам з жаўтаватым адценнем. Шапачка з пласцінкамі, цёмна-шэрага ці попельнага колеру, у цэнтры больш цёмная. Плеўка з шапачкі здымаецца лёгка. Ядомы грыб, найбольш часта ўжываецца ў салёным выглядзе.

*Памятайце! Нельга збіраць грыбы ў парках гарадоў, каля аўтамагістралей і заводаў.*

## Парасонік стракаты

(*русск.* **Зонтик пестрый**)



*Поўдзень, ветру — ані-ні.*
*І пячэ няшчадна сонейка.*
*Добра жабкам у цяні*
*Пад **стракатым парасонікам**.*

Грыб-парасонік, асабліва стракаты парасонік, — самы высокі сярод нашых грыбоў. Вышыня яго ножкі часам дасягае 40 сантыметраў, а дыяметр шапкі — 35 сантыметраў. Назву грыб атрымаў за падабенства з сапраўдным парасонам. Сустрэць яго можна за ваколіцамі, дзе глеба дастаткова ўгноеная, у рэдкалессях, на палянах, высечках і нават у садах. А яшчэ — у гарадскіх парках і скверах, дзе ён расце толькі на адкрытых месцах.



Парасонік — ядомы грыб і высока цэніцца на рынках еўрапейскіх і азіяцкіх краін. А вось у нас яго не вельмі прывячаюць, хаця асобныя аматары сцвярджаюць, што парасонік мае незвычайны грыбны пах, падобны да шампіньёна ці грэцкага арэха, і смак курынага мяса.

● *Вельмі смачныя адбіўныя з маладых грыбоў-парасонікаў, шапачкі якіх яшчэ не раскрыліся. Іх паніруюць у яйцах і сухарах і абсмажваюць на патэльні ў алеі. А вось ножкі грыбоў высушваюць і перамолваюць на муку.*

Р

## Рыжык

(*русск.* **Рыжик**)

*Хоць ты вопыту не маеш,*
*Між грыбоў яго пазнаеш:*
*То аранжавы, то рыжы,*
*Гэты слаўны, смачны* ***рыжык****.*



Кажуць, што рыжык — адзін з самых каштоўных, смачных і карысных грыбоў нашых лясоў. Ён багаты на вітаміны і жалеза. Вялікімі сем'ямі растуць рыжыкі ў сасонніках ды ельніках з пачатку жніўня і да самых замаразкаў. Здалёк відаць іх круглыя ярка-аранжавыя шапачкі на кароткіх светла-аранжавых ножках.

Людзі заўважылі, што гэтыя грыбы любяць халаднаватыя мясціны, а самыя вялікія з іх растуць з паўночнага боку дрэва. Калі грыб разламаць, то з пласцінак пачне выдзяляцца светла-аранжавы сок, а мякаць пацямнее — стане зеленаватай.



● *Ужываюць рыжыкі ў смажаным, салёным, марынаваным выглядзе. Перад смажаннем грыбы не адварваюць, а толькі дадаюць у патэльню соль, перац, цыбулю і смятану.*



С

## Смаржок

(*русск.* **Сморчок**)

*— Не чапай мяне, не руш,*
*Я не зморшчаны страчок.*
*Глянь, які мой капялюш,*
*А завуся я — **смаржок.***



Некаторыя лічаць яго прыгодным у ежу, нават смачным, некаторыя — умоўна ядомым. Таму і пра карысць яго да сённяшняга дня няма адзінага меркавання: адны раяць перад ужываннем замочваць, другія — адварваць або сушыць. Што ж гэта за загадкавы насельнік лесу?

Сапраўды, не паспее гэты грыб у красавіку-маі вылезці з зямлі на ўзлесках, у шыракалістых або змешаных лясах, імшыстых канавах уздоўж лясных дарог ці на высечках, а ўжо выглядае як той старэнькі дзядок. Бурая або карычневая шапачка (бывае да 6 сантыметраў у вышыню і ад 3 да 8 сантыметраў — у шырыню) нагадвае яйцо, выцягнутае ўверх, уся зморшчаная, у ямках, падобных на пчаліныя соты. Там знаходзяцца споры, якімі грыб размнажаецца. Белаватая або шэражоўтая ножка даволі высокая.



*Смаржок канічны*



*Смаржок звычайны*

● *Акрамя смецця і пылу, у зморшчынках грыба знаходзяць сабе прытулак дробныя насякомыя ці ўліткі.*

## Страчок

(*русск.* **Строчок**)

*Лес прытоена маўчаў,*
*Не гайдаў сучкі*
*І пад шыльнікам хаваў*
*Бурыя **страчкі**.*



Растуць гэтыя грыбы і ў сасновых барах, і пад старымі бярозамі ці пад елкамі. Многа іх на месцах



лясных пажарышчаў, высечках, прасеках, а таксама на палянах і ўзлесках. Страчок звычайны расце ў красавіку, маі, а асенні — восенню. Страчкі — неядомыя грыбы, таму што ўтрымліваюць ядавітыя рэчывы. Да і грыбамі назваць іх не заўсёды хочацца. Бо выгляд яны маюць карыкатурны, не зусім грыбны: карычневая ці бура-чырвоная шапачка (бывае да 20 сантыметраў у дыяметры) шышкаватая, уся ў звілінах, нагадвае сваім выглядам... мозг. А ножка зусім кароткая, тоўстая.

*Вельмі важна не блытаць ядавітыя страчкі з ядомымі смаржкамі. Звярніце ўвагу на малюнкі і запомніце адрозненні гэтых грыбоў.*





## Сыраежка

(*русск.* **Сыроежка**)

*Сонца радасна вітаюць,*
*З ім у хованкі гуляюць,*
*Бо забеглі аж на ўзмежкі*
*У панамках* ***сыраежкі****.*

Сыраежкі растуць у самых розных лясах. І амаль усе — ядомыя. Толькі грыбнікі лепшымі лічаць тыя, у якіх менш чырвонага колеру на шапачках, — жаўтаватыя, сіняватыя, зеленаватыя. Жоўтыя сыраежкі з'яўляюцца ў ліпені, але асабліва багата іх бывае









са жніўня да верасня. Грыбы надзвычай карысныя, аднак людзі не вельмі ахвотна іх збіраюць: шапачкі з пласцінкамі вельмі крохкія. Таму варта браць маладыя, больш моцныя экзэмпляры.

Гэтыя дары лесу апраўдваюць сваю назву — іх можна есці нават сырымі, папярэдне аддзяліўшы плеўку і пасыпаўшы соллю. У навуковых працах назвы гэтых грыбоў часта адпавядаюць афарбоўцы іх шапачак: чырвоныя, жоўтыя, шэрыя, пурпурова-чырвоныя і г. д.



*Грыбы могуць замяніць чалавеку нават мяса, бо ў іх шмат бялкоў, няма тлушчаў, яны багатыя на вітаміны $B_1$, $B_2$, D.*

## Хрушч, губа авечая

(*русск.* **Трутовик овечий**)

Х

*У лес зайшоў — не забывай:*
*Асцярожна ты ступай*
*І грыбы не патапчы,*
*Нават горкія* ***хрушчы****.*



Гэты грыб падобны да грузда. Але ў параўнанні з апошнім мае адрозненні: меншая шапачка, мякаць больш пругкая, а малочна-белы сок горкі і мае смалісты пах. Цэлымі сем'ямі расце хрушч з ліпеня да верасня ў хваёвых і ліставых лясах.

Хрушч — грыб-«чысцёха»: здалёк відаць масіўную чыста-белую шапачку, часта са светла-жоўтымі плямкамі і трэшчынкамі, якая ніколі не хаваецца пад зямлю. Грыбнікі не вельмі прывячаюць гэты грыб, але кажуць, што ў маладых экзэмпляраў даволі прыемны грыбны пах і смак.



*Цікава, што вавёркі ўжываюць больш за 40 відаў грыбоў, але аддаюць перавагу падасінавікам.*





# Ч

## Чага

(*русск.* **Чага**)

*Між грыбамі — свой «дзівак»,*
*Ён жыве зусім не так:*
*Сок з бярозы п'е, як смага,*
*Так расце на дрэве* ***чага****.*



Яшчэ ў далёкай старажытнасці людзі заўважылі, што лясныя дары могуць быць не толькі ежай, але і лекамі. Да такіх адносіцца і гэты не вельмі прывабны грыб, нават шкоднік, паразіт. Расце ён часцей за ўсё на бярозах (за што яшчэ называецца «бярозавым грыбам»). Але можа пасяліцца і на асіне, і на вольсе, і на рабіне, і на ясені. Убачыўшы такое дзіва першы раз, не скажаш, што гэта грыб: велічынёю з кулак (а то і большы), чорны нарост на ствале дрэва, які дасягае 5 кілаграмаў. Вырастае ён на жывых бярозах на месцы зламаных галін, на пашкоджаных марозам ствалах.



*Кавалачкі чагі*

*З чагі гатуюць лекавы прэпарат «Бефунгін», які выкарыстоўваецца ў медыцыне для лячэння страўніка.*





Ш

## *Шампіньён*

(*русск.* **Шампиньон**)

*Страваў з грыба ёсць багата:*
*Запяканка, суп, салата.*
*Ён на кухні — чэмпіён,*
*Гэты смачны* ***шампіньён.***



*Шампіньён палявы*

Некалькі цікавых фактаў пра шампіньён:

- грыб валодае незвычайнай сілай: былі выпадкі, калі ён разбураў нават асфальт, каб прабіцца да сонца;
- многія лічаць грыб самым смачным сярод усіх шапачкавых грыбоў і пераконваюць, што ён не саступае баравіку, — і за гэта вельмі папулярны;
- па харчовых якасцях грыб параўноўваюць з мясам;
- людзі навучыліся вырошчваць шампіньён у штучных умовах.

А ў прыродзе шампіньёны сустракаюцца паўсюль: на палях і лугах, у садах і парках, на дарогах, выганах і пашах — важна, каб глеба была добра ўгноеная. Там яны растуць з мая і да позняй восені.

У «маладым узросце» грыб падобны да белага шарыка, які з часам падрастае, выпростваецца — і вось ужо красуецца белы капялюшык на высокай ножцы з каўнерыкам-кольцам. Пласцінкі пад капялюшыкам светла-ружовыя, але (дзіва!)... за адзін дзень яны спачатку становяцца карычневымі, потым — фіялетава-бурымі і нарэшце — чорнымі.

Аматары «ціхага палявання» даўно заўважылі, што грыб пахне анісам. Упершыню цудоўныя смакавыя якасці і карысныя ўласцівасці шампіньёнаў ацанілі жыхары Старажытнага Рыма.

*Шампіньёны, якія вырошчваюцца ў штучных умовах*





- Навукоўцы сцвярджаюць, што шампіньёны паніжаюць узровень халестэрыну ў крыві і павышаюць працаздольнасць чалавека.



Якія толькі дзівы
Не стрэнуцца ў бары!
То заяц палахлівы,
То мудрыя зубры.
То лось-рагач паважны,
То страшныя дзікі...
Ты толькі будзь уважны:
Багаты лес такі!





*І на лузе,*
*і ў бары*
*ёсць свае*
*гаспадары*

# А

## Акунь

(*русск.* **Окунь**)

*Не злавіў я ані-ні, —*
*Хоць сядзеў ад рання:*
*Разагналі* ***акуні***
*Рыбу ўсю дазвання.*





Гэты рачны драпежнік дажывае да 15—17 гадоў. Асобныя экзэмпляры акунёў дасягаюць амаль паўмятровай даўжыні і паўтаракілаграмовай вагі. Можа, таму, што рыба вельмі пражэрлівая: часам наядаецца да таго, што дробная рыба ўжо не змяшчаецца і тырчыць з рота. Аднак і ў акуня ёсць ворагі: сом, шчупак, судак, налім. А таксама птушкі — качкі і чайкі.

Акуня сярод іншых насельнікаў вадаёмаў выдзяляе знешні выгляд. Цела яго высокае, гарбатае, сціснутае з бакоў, галава вялікая. Афарбоўка залежыць ад месца жыхарства. Звычайна спіна ў акуня цёмна-зялёная, бакі зеленавата-жоўтыя, жывот жаўтаваты. Упоперак усяго цела — цёмныя палоскі, якія надаюць рыбе стракаты выгляд. Вочы аранжавыя.

У спякотнае сонечнае надвор’е акунь звычайна хаваецца пад абрывістыя берагі, навіслыя кусты, затанулыя карчы і бярвенне, адкуль выходзіць на паляванне толькі вечарам.

*Акунь — адзін с самых папулярных аб’ектаў аматарскага рыбалоўства. А яшчэ — галоўны інгрэдыент сапраўднай юшкі.*







# Алень

(*русск.* **Олень**)

*З гушча́ру старога сівой Белавежы,*
*Ледзь птушкі разбудзяць ранак вясенні,*
*Выходзяць на ўзлесак у пошуках ежы*
*Па роснай сцяжыне сям'ёю* ***алені****.*



Алені — буйныя жывёлы, стройныя, прыгожыя. Даўжыня цела да 2 метраў і больш, маса самак да 150, самцоў — да 230 кілаграмаў. Самцы — з разгалістымі рагамі, якія кожны год у сакавіку-красавіку спадаюць, у самак рагоў няма. У дзіцянят — прыгожыя крапінкі-плямкі на скуры. На адкрытыя месцы звычайна выходзяць раніцай і вечарам, а ўдзень адпачываюць. Любімы корм — маладыя парасткі ліставых дрэў і кустоў, ягаднікі, кара і трава. Узімку паядаюць кару і пупышкі дрэў і кустоў. Ворагамі гэтых жывёл з'яўляюцца рысі і лісіцы, але самыя небяспечныя — ваўкі.









## Андатра, мускусны пацук

(*русск.* **Ондатра**)

*Не з Афрыкі, Аўстраліі,*
*Цэйлона ці Суматры —*
*З Амерыкі «прычалілі»*
*Спрытныя* ***андатры****.*

Хоць андатра звярок невялікі (даўжыня цела каля 30 сантыметраў, маса да 1,5 кілаграмаў), але даволі смелы і нават зласлівы. Аднолькава добра адчувае сябе і ў вадзе, і на сушы. Жыве ў хатках, пабудаваных з карэння аеру, трыснягу, ці ў норах, якія рые ў высокіх берагах. Мае незвычайны выгляд: густая цёмна-бурая поўсць і... пляскаты з бакоў хвост, роўны даўжыні цела.

Звычайна андатра корміцца чаротам, асокамі, травой, што расце каля вадаёмаў, зрэдку малюскамі. Каштоўны пушны звярок.



*Хатка андатры*

## Аса

(*русск.* **Оса**)

*Не чапай шар пад страхою,*
*У яго не заглядай:*
***Восы*** *вылецяць гурмою,*
*Стануць джаліць: «Ай-ай-ай...»*



Ці даводзілася вам бачыць шэры, быццам з паперы зроблены шар, які часам вісіць пад страхою або на балконе? А заглядваць у яго? Лепш не рабіце гэтага і не трывожце яго жыхароў. Бо там жывуць восы — прывабна-яркія насякомыя з чорнымі і жоўтымі палоскамі па целе.

Восы — усім вядомыя насякомыя, але ў іх ёсць нешта незвычайнае. Напрыклад тое, як восы ўспрымаюць наваколле. Для гэтага ў іх прыстасаваны вочы, якія бачаць прадметы ў радыусе 280 градусаў.



Дапамагаюць восам і вусікі-антэны, на якія яны арыентуюцца ў палёце, вызначаючы напрамак ветру, шырыню шчылін.

Патрывожаныя восы вельмі агрэсіўныя: яны не толькі выкарыстоўваюць для абароны джала, але і вельмі балюча кусаюцца.

Восы карысныя як апыляльнікі кветкавых раслін.



*Гняздо вос*

Б

## Бабёр

(*русск.* **Бобр**)

*На рацэ ўзвялі плаціну,*
*Побач — добрую хаціну.*
*Сонца дзівіцца ўгары:*
*— Працавітыя* ***бабры****!*

Як можна без сякеры і пілы збудаваць плаціну або хатку пад жыллё? А ў баброў — атрымліваецца. Хаця самі гэтыя буравата-чорны звяры невялікія. Даўжыня цела да 1 метру, хвост 20—30 сантыметраў. Аднак даволі моцныя пярэднія зубы-разцы дапамагаюць ім хутка «спілаваць» дрэва. Цікава, што зубы ў баброў растуць усё жыццё.

Жывучы ў вадзе і каля вады, дзе многа насякомых і рыбы, бабры кормяцца выключна расліннай ежай. У іх рацыёне да 200 відаў раслін. На зіму назапашваюць пад вадой драўняны корм. Жывуць сем'ямі.







*Бабровая плаціна*







## Барсук

(*русск.* **Барсук**)

*Цэлы горад пад зямлёю*
*Узвялі будаўнікі.*
*Там халодную зімою*
*Спаць палягуць* ***барсукі.***

Знешнім выглядам гэты звер нагадвае конус, пакладзены на бок: тулава, шырокае ззаду, паступова пераходзіць у вузкую доўгую мордачку. Даўжыня цела каля 80 сантыметраў, маса 8—10 кілаграмаў. Барсук мае даволі стракатую афарбоўку: спіна і бакі — шэрыя, рот, шчокі і лоб — белыя, а па баках галавы цягнуцца шырокія чорныя палосы.

Корміцца чарвякамі, жукамі, жабамі, а таксама грыбамі, ягадамі, рознымі карэньчыкамі, жалудамі. Гэта прыроджаны «землякоп» і «чысцюля». Норы, выкапаныя барсуком, служаць некалькім пакаленням на працягу многіх дзесяцігоддзяў, бо захоўваюцца ў ідэальным парадку і чысціні. А двойчы на год там праводзіцца «генеральная ўборка» і «капітальны рамонт». Барсукі актыўныя ў начы. Зімой упадаюць у спячку.

- Барсук занесены ў Чырвоную кнігу Рэспублікі Беларусь.



## Бусел

(*русск.* **Аист**)

***Буслы*** *плывуць у паднябессі,*
*Суладны іх магутны ўзмах –*
*У родны край, святочна-весні,*
*Вядзе іскрысты Млечны шлях.*

Вы добра ведаеце гэтую паважную, няспешную птушку з доўгай чырвонай дзюбай і такімі ж доўгімі чырвонымі нагамі. На спіне і канцах крылаў пер’е ў яе



чорнае, а астатняе — белае. Гэта даволі вялікая птушка, бо размах крылаў у палёце дасягае 2 метраў. Ды і маса немалая — да 4 кілаграмаў. Калі бусел хвалюецца, то пачынае моцна трашчаць дзюбай — клекатаць.

Корміцца рыбай, жабамі, яшчаркамі, змеямі, мышамі і насякомымі. Таму пасяляецца пераважна каля неглыбокіх вадаёмаў, лугоў і палёў. А таксама каля чалавечага жылля (бусел вельмі даверлівы і не баіцца чалавека). Гняздо яго, як вялікая «шапка» (часам да 2 метраў у дыяметры і да некалькіх соцень кілаграмаў масай), размяшчаецца на дрэве, слупе, страсе ці нават на коміне хаты.

А ці ведаеце вы, што кожны год бусел пралятае каля 5 тысяч кіламетраў з далёкай Афрыкі, каб вярнуцца да роднай буслянкі?

Ёсць у белага бусла і «брат» — чорны бусел, які рэдка сустракаецца чалавеку, бо жыве ў глухіх лясах. Ён любіць адзіноту, не адлятае далёка ад гнязда. Той, каму пашчасціла сустрэцца з гэтай птушкай, мог палюбавацца бліскучым чорным з зеленаватым металічным адлівам пер’ем, белым жыватом і своеасаблівай адзнакай — чырвонымі кольцамі вакол вачэй. У адрозненне ад белага бусла чорны не толькі клякоча, але можа і ціха «прамаўляць»: «чэ-лін».

*Белыя буслы*





*Чорны бусел сустракаецца вельмі рэдка, таму занесены ў Чырвоную кнігу Рэспублікі Беларусь.*

*Чорныя буслы*





# В





## Ваўёрка

(*русск.* **Белка**)

*Векавечныя яліны*
*Паразвесілі галіны.*
*А па іх, нібыта з горкі,*
*Спрытна коцяцца* ***ваўёркі****.*

Ваўёрка вельмі спрытна рухаецца па ствалах дрэў як уверх, так і ўніз галавой, хутка пераскоквае па тонкіх галінках з дрэва на дрэва. У такіх «акрабатычных практыкаваннях» ёй дапамагае пушысты хвост — служыць і рулём, і парашутам. Сам звярок невялікі (маса да 400 грамаў), рыжавата-чырвонага колеру летам і шэры зімой. Селіцца часцей за ўсё ў дуплах або ў гнёздах (гайнах). Прычым у кожнай ваўёркі іх некалькі.

Летам корміцца грыбамі, арэхамі, ягадамі, жалудамі, палюе на жукоў і матылёў, зімой — пупышкамі і насеннем елкі або сасны. Бывае, што на зіму нарыхтоўвае запасы: носіць у дупло арэхі ці жалуды, а грыбы развешвае на галінках дрэў. Можа хаваць арэхі ў лясным падсціле. Тонкі нюх дапамагае ваўёрцы знаходзіць схаваны корм пад снегам.

Ворагі ваўёркі — гарнастай, куніца, ліса, пугач, шулякі.



## Воўк

(*русск.* **Волк**)

*Так цікаўна зоркі сочаць,*
*Як праз поле напрамкі*
*Па здабычу ў пушчу крочаць*
*Згаладалыя* ***ваўкі****.*

Ваўкі лёгка прыжываюцца ў любой мясцовасці, таму і сустракаюцца і ў Еўропе, і ў Азіі, і ў Паўночнай Амерыцы. Гэта сапраўдны драпежнік, яго называюць «санітарам лесу». Жыве звычайна ў сям'і-зграі, з якой



палюе на дзікоў, ласёў, аленяў, казуль. Можа нападаць і на свойскіх жывёл.



Звер даволі буйны (даўжыня цела да 1,4 метраў, маса да 50 кілаграмаў), з доўгімі і моцнымі нагамі, пушыстай і густой поўсцю светла-шэрай або рыжаватай афарбоўкі. Вельмі моцны і вынослівы: за ноч можа праходзіць да 30 кіламетраў. Але вядомыя пераходы і па 70 кіламетраў за ноч. Пры ўдалым паляванні можа за раз з'есці 10 кілаграмаў мяса.

## Вугор еўрапейскі

(*русск.* **Угорь европейский**)

*Сонца дзівіцца ўгары*
*Раніцаю летняй:*
*У гарох паўзуць* ***вугры***
*Сцежкай непрыметнай.*



Вялікімі вандроўніўнікамі варта назваць гэтых незвычайных рыб. Для таго каб даць жыццё новаму пакаленню, рачныя вугры (дзе б яны не жылі), адпраўляюцца ў далёкае Саргасава мора, што ў Атлантычным акіяне. Тут яны адкладваюць ікру, а самі гінуць. З ікрынак з'яўляюцца шматлікія лічынкі, якія амаль 3 гады вандруюць у акіяне. За гэты час лічынкі ператвараюцца ў маленькіх празрыстых рыбак, якія, вярнуўшыся ў родныя рэкі, рассяляюцца па прэснаводных вадаёмах.



*Лічынка вугра*

Часам, каб трапіць з аднаго вадаёма ў другі, вугры перапаўзаюць па вільготнай зямлі даволі вялікія адлегласці.

Светлы час сутак вугры праводзяць у сховах, закапаўшыся ў іл, а на паляванне выходзяць ноччу. Палююць на водных насякомых, малюскаў, ракападобных і чарвякоў. Часам — на жаб і рыбу.



У прэсных вадаёмах вугры жывуць каля 10 гадоў. За гэты час вырастаюць да 2 метраў. Ды і масу набіраюць немалую — часам да 6 кілаграмаў.



Чалавек, які раней не бачыў вугроў, пры сустрэчы з імі можа нават спужацца, бо выглядае рыба незвычайна: цела вельмі падобнае да змяінага, амаль цыліндрычнае, задняя частка сціснутая з бакоў, галава крыху пляскатая, на ёй — маленькія вочкі. Тоўстая скура пакрывае не толькі цела, але і плаўнікі.

*Пра вугроў бытуе шмат рыбацкіх баек. Адны расказваюць, што бачылі, як ноччу вугры паўзлі на поле, каб паласавацца гарохам. Другія — што бачылі вугра, які адпачываў на яблыневым суку пасля наведвання гарохавага поля. Хто ведае, ці праўда?!*

## Вуж

(*русск.* **Уж**)



*— Ну, паўзі, не бойся, **вужык**,*
*Ты яшчэ малы, нядужы,*
*Ляж на сонцы, выгравайся,*
*Сіл жыццёвых набірайся.*



Вуж — самы бясшкодны для чалавека від змей, які кусаецца вельмі рэдка. Знешне ён нагадвае невялікую вяроўку або канат, за што і атрымаў у старажытнасці такую назву. Пазнаць сапраўднага вужа можна па «жоўтых вушках» на галаве і афарбоўцы. Яна можа быць рознай: чорнай, аліўкавай, шакаладна-карычневай ці ізумрудна-зялёнай.

Жывуць вужы там, дзе ёсць вада і дзе высокая вільготнасць: каля рэк, азёр, балот і нават у вёсках. Яны добрыя плыўцы і доўгі час могуць знаходзіцца пад вадой.

На паляванне вуж выходзіць раніцай. Зрэдку — вечарам. А ўдзень грэецца на сонцы, часам нават забіраючыся на дрэвы.

Ёсць у гэтых бяскрыўдных змей і ворагі. Найперш — лісы, куніцы, норкі, буслы, каршуны.



# *Вушатая сава*

(*русск.* **Ушастая сова**)



*Што за дзіва між галін*
*Днём спякотным шастае?*
*Там кладзецца на спачын*
***Совачка вушатая.***

І хто гэта, схаваўшыся між галля, так уважліва сочыць за наваколлем, настрыўшы вушкі? Ды гэта ж сава! Толькі сава вушатая!

Галава ў птушкі вялікая, круглая (цікава, што яна можа паварочвацца на 270 градусаў), твар таксама круглы, быццам дыск, абведзены цёмным пер’ем. Вочы жоўтыя ці аранжавыя. Вострая дзюба загнутая, што разам з такімі ж вострымі і моцнымі кіпцюрамі на нагах дазваляе ўтрымліваць здабычу. Савіныя вушкі складаюцца з пер’я бурага колеру, а ўсё цела мае мармуровую афарбоўку.

На паляванне сава звычайна вылятае вечарам або ноччу, а ўдзень адпачывае. Часцей за ўсё палюе на грызуноў, аднак не адмаўляецца ад насякомых і нават дробных птушак. Лётае ціха і бясшумна.

Знайсці вушатую саву нескладана, бо яна сустракаецца там, дзе ёсць зялёныя насаджэнні: высакаствольныя лясы, кустоўе, паркі. Часам яе можна ўбачыць і каля чалавечага жылля. У час зімоўкі трымаецца невялікімі групамі — да 8—10 асобін. Размяшчаюцца разам на адным дрэве, прытуліўшыся да ствала.



*Савяняты*







# Г





## Гарнастай

(*русск.* **Горностай**)

*Снегам лес зацерушыла —*
*Стала ўсё вакол няміла.*
*Футра хуценька мяняй*
*На зімоўку, **гарнастай**.*

Летам гарнастай буравата-карычневы, з жаўтавата-белым адценнем горла, грудзей і брушка. А зімою — снежна-белы, толькі кончык хваста чорны. Жыве ў зарасніках, кустах па берагах рэк, азёр, сярод камянёў. Не любіць сухіх бароў і бярэзнікаў. Добра прыстасаваны да жыцця ў розных умовах: выдатна плавае і спрытна лазіць па дрэвах і кустах. Часцей за ўсё корміцца мышамі, мышавіднымі грызунамі і землярыйкамі, зрэдку палюе на зайцоў, птушак, яшчарак і насякомых, у тым ліку шкодных. Гэтым звярок прыносіць вялікую карысць сельскай гаспрадарцы.

Гнёзды робіць у норах, дуплах, пад сціртамі саломы.

- *Раней зімовае футра гарнастая выкарыстоўвалі для ўпрыгожвання адзення багатых людзей.*



## Глушэц

(*русск.* **Глухарь**)

*Шчэ пад снегам спіць паляна,*
*Шчэ між дрэў зіма начуе,*
*А **глушэц**-фарсун ад рана*
*Шчыра-радасна такуе.*

Ці праўду кажуць: глушэц атрымаў назву за тое, што нічога не чуе? Што ён — сапраўды глухі? Знаўцы сцвярджаюць, што гэта так: калі вясною глушэц песнямі кліча сваю сяброўку (такуе), то нічога не заўважае навокал — і становіцца лёгкай здабычай. Аднак у







*Глухарка*

астатні час гэта вельмі асцярожная і чуйная птушка, якая, дзеля сваёй бяспекі, начуе на галінах дрэў, а ўдзень спускаецца на зямлю і хаваецца сярод лясной расліннасці.

Корміцца пупышкамі дрэў, лісцем і кветкамі, маладымі парасткамі, а таксама жалудамі і ягадамі. Можна часам бачыць, што глушэц глытае невялікія каменьчыкі. Аказваецца, гэта трэба для таго, каб у страўніку лягчэй ператраўлівалася ежа.

Глушца лічаць адной з самых вялікіх лясных птушак: даўжыня цела самцоў дасягае аднаго (і нават больш) метра, маса — каля 7 кілаграмаў. Ды і размах крылаў — амаль 1,5 метра. Самкі значна меншыя.

Адметная асаблівасць глушца — своеасаблівая барада з пер'я, якая расце пад дзюбай. Акрамя гэтага, птушка выдзяляецца і кідкай афарбоўкай: галава і хвост — чорнага колеру, цела — цёмна-шэрае, крылы — бураватыя, грудзі — бліскучага цёмна-зялёнага адцення. А яшчэ — прыгожыя ярка-чырвоныя бровы. Калі ж глушэц такуе, то распускае свой падобны да веера акруглы хвост.

Зімою глушцы часам начуюць у гурбах. Для гэтага «пікіруюць» з вышыні, зарываючыся даволі глыбока ў снег. У такіх сховах падчас вялікіх маразоў птушкі могуць знаходзіцца да 3 сутак.

*Глушэц такуе*



Д

# Дамавы верабей

(*русск.* **Домовой воробей**)

*Пад страхою **верабей***
*Змайстраваў кватэру:*
*Звіў гняздзечка для дзяцей*
*Забіяка шэры.*



*Верабей дамавы (самец)*



*Вераб'іха*

Вось «партрэт» гэтай птушкі: у самца галава шэрая, горла і пляма на грудзях чорныя. Спіна і крылы карычневыя, на крылах светлыя палоскі. Ніз цела шэры ці брудна-белы. Самка і маладняк крыху святлейшыя: зверху яны карычнева-шэрыя, знізу — бруднавата-белыя ці шэрыя. Пазналі? Канешне, гэта — вераб'і. Стайкамі яны трымаюцца каля жылля чалавека, за што і атрымалі назву — вераб'і дамавыя. Іх гучнае, быццам на кірмашы, «ціў-ціў» чуваць здалёк. Здаецца, зляцеліся птушкі з усёй акругі, каб абмеркаваць свае пытанні.

Селяцца дамавыя вераб'і звычайна пад стрэхамі будынкаў, у шчылінах, у дуплах дрэў і нават займаюць пустыя шпакоўні (з-за чаго вясною бываюць сур'ёзныя сутычкі са шпакамі). А асобныя смельчакі знаходзяць прытулак у бакавых сценках бусліных гнёздаў.

Кормяцца вераб'і часцей за ўсё расліннай ежай: зернем, насеннем, ягадамі, а таксама рэшткамі ежы чалавека.

Дарэчы, вераб'і — вельмі клапатлівыя бацькі: маленькіх птушанятак даглядаюць і верабей, і вераб'іха, якія па чарзе саграваюць дзетак і прыносяць ім смачны корм.

● *У нашых мясцінах жыве і крыху драбнейшы палявы верабей, які часцей сустракаецца ў гаях, поймавых дубровах, на ўскраінах вёсак.*



## *Джгір, ёрш*

(*русск.* **Ёрш обыкновенный**)





*Адплывай, шчупак-задзіра,*
*Не чапай малога* ***джгіра****:*
*Ён у гневе, быццам вожык,*
*Пакалоць балюча можа.*

Жыве джгір да 12 гадоў. За гэты час вырастае да 20 сантыметраў. А вось маса ў яго невялікая: каля 150 грамаў. Афарбоўкай рыба не вельмі выдзяляецца сярод іншых: цёмна-шэрая, з мноствам невялікіх цёмных плямак на верхняй палове цела, спінным і хваставым плаўніках. Спіна звычайна шэра-зялёная, з невыразнымі бурымі плямамі, бакі жаўтаватыя, жывот белаваты.

Часцей за ўсё джгіра можна сустрэць там, дзе цячэнне запаволенае, ля абрывістых берагоў, у ямах з вірамі. Джгір рэдка пакідае для вандровак сваё месцажыхарства. А выцягнуты з вады, бароніцца і ператвараецца ў страшыдлу: моцна раздзімае так званыя шчокі, узброеныя вострымі зубцамі, растапырвае плаўнікі, хвост згінае набок — сапраўды нагадвае шар з калючкамі, які абыходзяць стараной нават галодныя рачныя драпежнікі.

## *Дзік, дзікая свіння*

(*русск.* **Дикий кабан**)



*У іх касматыя бакі*
*І насы, як пятакі,*
*У іх загнутыя іклы,*
*Пазнаёмцеся —* ***дзікі****.*

Глянуўшы на дзіка, адразу ўбачыш нос — рыла з пятачком, доўгія іклы і маленькія вочкі. Шчаціннe ў яго жорсткае, бурага колеру. Жыве звер у статку, звычайна ў сырых ці забалочаных лясах, бо вельмі любіць «гразевыя ванны». Кормам яму служаць расліны, іх









плады і карані, чарвякі і лічынкі насякомых, а таксама мышападобныя грызуны, жабы і змеі. Восенню, калі паспявае ўраджай, статак наведваецца на палі і выкопвае бульбу ды моркву, а таксама з задавальненнем корміцца аўсом і лубінам.

*Даўжыня цела дзіка да 140 сантыметраў, маса — 100—150 кілаграмаў.*

Ж

## Жаба

(*русск.* **Лягушка**)

*Жаба сажалкавая*





*Мусіць, лёс у іх такі —*
*Голенькія лапкі.*
*Па балоце напрасткі*
*Паскакалі **жабкі**.*

Сустрэць жаб часцей за ўсё можна ў азёрах, старыцах, вільготных, забалочаных лясах, радзей — у садах і парках. У нашых мясцінах сустракаюцца жабы азёрная, вострамордая, сажалкавая і іншыя.

Спінка ў жабы сажалкавай ярка-зялёная, брушка — брудна-белае з дробнымі плямкамі. Корміцца насякомымі, у вадзе — маляўкамі рыб. Патомства выводзіцца вясной з ікрынак, якія жабы адкладваюць на водныя расліны. З ікры выходзяць апалонікі. Жабы зімуюць на дне вадаёмаў, зрэдку на сушы.



## Жэрах

(*русск.* **Жерех**)



*У азёрным княстве — жах,*
*Хоць скачы адтуль на бераг,*
*Бо нагнаў на плотак страх*
*Ненасытны злосны* ***жэрах.***



Цікава палюе гэта рыба: на вялікай хуткасці ўразаецца ў стайку дробных рыбак, моцна б’е хвастом па вадзе, глушачы здабычу, хапае яе, часцей з галавы. Корміцца печкурамі, плоткамі, яльцамі. На паляванне выходзіць звычайна раніцай, а на начлег апускаецца на дно. Селіцца жэрах на раўнінных участках рэк з павольным цячэннем, дзе дастаткова корму. А вось хуткае цячэнне і халодная вада яму не даспадобы. Жэрах — рыба-адзіночка, толькі на зімоўку збіваецца ў стайкі.

Выглядае даволі фарсіста: спіна шырокая, сіне-шэрага колеру, бакі з блакітным адценнем, жывот белы. Плаўнікі чырванаватыя ў асновы і шэрыя ў канцы. Маса каля 2 кілаграмаў, але сустракаюцца экзэмпляры па 10—12 кілаграмаў.



## Заяц

(*русск.* **Заяц**)

*На паляне зранку свята —*
*Колькі ўдалых малайцоў:*
*Матч-рэванш ідзе заўзята*
*Між камандамі* ***зайцоў.***



Адгадайце загадку: «Летам шэры, зімой белы». Адгадалі? Цяпер вы ведаеце, пра каго пойдзе гутарка? У гэтага звярка доўгія вушы, пярэднія ногі намнога карацейшыя за заднія. Ратуючыся ад небяспекі, ён блытае сляды, прабягае па іх некалькі разоў, а потым рэзка скача далёка ўбок. Летам корміцца расліннай ежай, зімой — карой і маладымі парасткамі дрэў,







Заяц-бяляк



Заяц-русак

асабліва асіны, бярозы, дуба, яблыні і грушы. Шукаць корм часцей выходзіць ноччу, а ўдзень адпачывае ў лежбішчы пад кустом. Цікава, што спаць ён кладзецца галавой да сваіх слядоў, каб зараней убачыць ворага. А іх даволі многа: воўк, рысь, ліса і нават драпежныя птушкі. Таму і кажуць: «Баязлівы, як ...».

У нашых краях сустракаюцца заяц-бяляк (зімой поўсць у яго белага колеру) і заяц-русак, які на працягу ўсяго года карычнявата-шэры (маса да 6 кілаграмаў).

## Зубр

(*русск.* **Зубр**)

*Эх, раздолле дык раздолле!*
*Аж гудзе ўсё наваколле,*
*Бо ад раніцы ў бары*
*Сілай хваляцца* ***зубры.***

Яго называюць «царом пушчы», бо гэта самая вялікая жывёла ў лясах Беларусі. Выглядае зубр даволі



ўнушальна: поўсць карычнева-бурая, тулава высокае (каля 1,8 метра) і доўгае (да 3 метраў), у дарослых на спіне выдзяляецца горб, а на магутнай шыі доўгія валасы, вельмі падобныя на бараду; на вочы навісае густы чуб. Маса самца да 800 кілаграмаў, самкі значна меншыя — да 500 кілаграмаў. Але найперш увагу прыцягваюць чорныя рогі, доўгія і загнутыя.



Кормяцца травой, лісцем, карой і маладымі парасткамі ліпы, дуба, граба, ясеня. Часцей за ўсё гэтых жывёл можна сустрэць у Белавежскай пушчы. Трымаюцца статкамі па 20 асобін. Кіруе ў статку самка. Жывуць зубры 25—30 гадоў.

● *Еўрапейскі зубр занесены ў Чырвоную кнігу Рэспублікі Беларусь.*

## *Кажан*

(*русск.* **Кожан**)

К

*Слёзна скардзіцца сініца:*
*— Зноў не выспімся, сястрыца:*
*Зноў трывожыць будуць сны*
*Цёмнай ноччу* ***кажаны****.*



У нас на Беларусі гэтых звяркоў з сямейства лятучых мышей можна сустрэць усюды. Але вельмі рэдка, бо яны вылятаюць пасля заходу сонца і палююць цэлую ноч. Звычайная ежа кажаноў — матылі, жукі даўганосікі, хрушчы. Кажаны пакрытыя мяккай густой карычневай поўсцю. У іх вузкія крылы, якія спрыяюць хуткім манеўрам у час імклівага палёту.



Жывуць калоніямі (да 50 асобін), самцы і самкі асобна. Удзень кажаны хаваюцца пад карнізамі, staўнямі, за драўлянай ашалёўкай хат, а таксама ў дуплах дрэў.

Зімуюць у падвалах, склепах. Для некаторых характэрныя асеннія міграцыі ў паўднёвыя раёны.





## Камар звычайны

(*русск.* **Комар обыкновенный**)



*Зранку ў лесе, у бары*
*Правяць баль свой* ***камары.***
*Галасок у іх піскучы,*
*Носік — колюча-сысучы.*



*Лічынкі камара*

Камар, мусіць, самае нелюбімае насякомае, якое не толькі раздражняе чалавека сваім нудным бесперапынным піскам, але і даволі балюча «кусае». Аднак ці ведаеце вы, што кусаюць толькі самкі камара, а самцы — даволі бяскрыўдныя: яны кормяцца кветкавым нектарам.

У камара тонкае цела жоўтага, шэрага ці карычневага колеру, доўгія ногі, вузкія празрыстыя крылы.

І яшчэ адзін цікавы факт з «біяграфіі»: дзяцінства і маладосць камар праводзіць у вадзе, куды самка адкладвае яйцы, з якіх выходзяць лічынкі — корм для рыб. А вось дарослае жыццё камара праходзіць у паветры, тут ён можа пражыць да 120 дзён.

● *Камары не толькі вельмі надакучлівыя насякомыя, яны яшчэ з'яўляюцца пераносчыкамі ўзбуджальнікаў хвароб жывёл і чалавека. Пазбягайце ўкусаў камароў!*

## Капусніца, капусная бялянка

(русск. **Капустница, капустная белянка**)



*Ой, бяда-бяда ў гародзе —*
*Матылькі-****капусніцы****:*
*Ураждаю моцна шкодзяць*
*Гэтыя распусніцы!*

Якое хараство на градках! Быццам белыя кветачкі выраслі на маладых качанчыках капусты. Але чаму не радуецца гаспадыня? Чаму спяшаецца хутчэй пазбавіцца ад гэтага хараства? Накрыць нечым капусту?





Аказваецца, гэтыя белакрылыя насякомыя (а крылы ў іх сапраўды белыя, толькі чорныя кончыкі і пасярэдзіне дзве чорныя крапінкі) могуць дарэшты знішчыць пасевы капусты. Праўда, не яны самі, а іх дзеткі-вусені, якія нараджаюцца з яец, што адкладвае капусніца. Адна самка можа адкласці іх да 250. А за год у капусніцы выводзяцца два пакаленні. Вось вам і адказ, чаму гаспадыня не рада гэтым прыгожым матылькам.

## Карась залаты

(*русск.* **Карась золотой**)

*З галавой залез у гразь*
*І забыўся на абед,*
*У яме спіць зімой* ***карась*** *—*
*Там ратуецца ад бед.*



Цела залатога карася высокае, сціснутае з бакоў, за што яго яшчэ называюць карасём круглым, бо даўжыня цела перавышае вышыню ўсяго ў 1,2—2 разы. Спіна цёмная або цёмна-карычневая, з зеленаватым адценнем, бакі цёмна-залацістыя (за што і атрымаў назву), а жывот светлы.



Жыве карась у забалочаных вадаёмах са стаячай вадой або ў зарастаючых азёрах з ілістым грунтам. Не любіць чыстых рэк з пясчаным дном і хуткім цячэннем.

Карась вельмі жыццеўстойлівы ў самых складаных умовах. З надыходам халадоў ён закопваецца ў іл і ўсю зіму праводзіць без корму і без руху. Нават калі вадаём прамярзае, то карась не гіне, а з надыходам цёплых дзён, як поўнасцю растае лёд, а тэмпература вады павышаецца, аднаўляе свае сілы. Для гэтага палюе на дробных рачкоў, лічынак, зрэдку корміцца водарасцямі і рэшткамі воднай расліннасці.

Карась — рыба-дамасед: ён рэдка пакідае абжытыя мясціны і адпраўляецца ў далёкія вандроўкі.









## Куніца

(*русск.* **Куница**)

*Навіну нясе сарока —*
*Балбатуха белабока:*
*Хопіць, птаства, весяліцца —*
*Домік ваш знайшла **куніца**.*

Куніца рухавая і вельмі прыгожая жывёла: футра бураватага колеру пушыстае, мяккае і густое. А ўздоўж горла да пярэдніх лап цягнецца светла-жоўтая пляма. Хвост доўгі, пушысты. Селіцца ў яловых лясах, дзе многа старых дуплаватых дрэў. Звер не мае пастаяннага гнязда, таму і адпачывае ў розных дуплах ці ў вавёрчыных гайнах. На паляванне часцей выходзіць ноччу. Гэты драпежнік звычайна палюе на мышэй, вавёрак, вожыкаў, птушак, але можа спажываць розныя плады, ягады і птушыныя яйцы (добра лазіць па дрэвах).

Даўжыня цела куніцы каля 50 сантыметраў, маса 1,5 кілаграма.

*Цікава, што назва харвацкай грашовай адзінкі «куна» паходзіць ад адной з даграшовых адзінак — шкуркі куніцы. А яшчэ відарыс куніцы сустракаецца на гербах многіх гарадоў Расіі (Уфа, Курган, Шадрынск).*

# Л

## Лань

(*русск.* **Лань**)

*Прыпыніся ранкам звонкім*
*Ды хутчэй на поле глянь:*
*Нібы з ветрам у абгонкі,*
*Грацыёзна мчыцца **лань**.*

Гэтых жывёл можна зблытаць з аленямі: у самцоў ланяў такія ж вялікія, разгалістыя рогі. Аднак ёсць і адрозненні: цёмна-бурае тулава меншага памеру і не









такое стройнае. А яшчэ — светлыя плямы па спіне і баках. Самкі і дзіцяняты ланяў трымаюцца статкам, самцы — паасобку пераважна ў лісцевых ці змешаных лясах. «Рацыён» ланяў даволі разнастайны: трава, кусты, маладыя парасткі дрэў, кара, ягады. У іх многа ворагаў-драпежнікаў: ваўкі, рысі, лісы.

Раней сустрэць лань у беларускіх лясах было звычайнай справай. Потым іх колькасць рэзка скарацілася. Зараз у нашых мясцінах адраджаюць папуляцыю гэтых прыгожых жывёл — ланей.

## *Лімонніца*

(русск. **Лимонница**)

*Як на конкурсе якім*
*Выступае модніца,*
*Так уборам залатым*
*Хваліцца* ***лімонніца****.*



Яшчэ толькі сышоў пасля зімы снег, яшчэ трава не паспела зазелянець і не паспелі распусціцца кветкі-першынцы, а гэтыя матылькі-модніцы ўжо хваляцца сваімі светла-жоўтымі, жаўтавата-белымі ці белавата-зялёнымі ўборамі. Таму лімонніц і называюць самымі раннімі матылькамі. А яшчэ — доўгажыхарамі сярод







матылёў, бо жывуць яны аж 10 месяцаў. І не баяцца зімовых маразоў ды сцюжаў: схаваюцца пад кару дрэва, на гарышча ці ў падвал, а то нават заляцяць у хату — і перазімуюць дзе ў куточку.

А вясной з яец, якія адклала самка, з'яўляюцца ярказялёныя вусені. Часцей за ўсё іх можна ўбачыць у лесе на крушыне (таму гэтага матылька яшчэ называюць крушыннiцай). Потым вусені ператвараюцца ў дарослых матылькоў, якія лятаюць да самых халадоў.



*Вусень і кукалка лімонніцы*

- *Лімонніца, у адрозненне ад капусніцы, не прыносіць шкоды чалавеку, бо корміцца пераважна крушынай.*

## Лось

(*русск.* **Лось**)

*Не спяшыць, ідзе паважна:*
*Лесу цар — не менш, нябось,*
*І нясе карону важна*
*Гэты моцны, горды* ***лось.***

Лось — адна з самых буйных жывёл на Беларусі. Маса самцоў дасягае 500 кілаграмаў. Лосі адрозніваюцца





высокім ростам, доўгімі нагамі, моцным тулавам, якое пакрыта жорсткай поўсцю цёмна-шэрага колеру. Верхняя губа намнога даўжэйшая за ніжнюю.



Самцы «носяць» рогі-лапаты і бараду-«завушніцу». Сустрэць ласёў можна часцей за ўсё ў сасонніках, бярэзніках, дзе жывёлы кормяцца маладымі раслінамі, карой ліcцевых дрэў і кустоў, хвояй, імхамі, лішайнікамі, грыбамі, а таксама на палетках азімых культур.

*Жывуць невялікімі статкамі па 3—5 асобін (ласіхі з дзіцянятамі). Лосі-самцы часцей за ўсё трымаюцца асобна. Іх самымі небяспечнымі ворагамі з'яўляюцца ваўкі.*

M

## Мыш

(*русск.* **Мышь**)

*Зіма на полі шчыравала —*
*Дыван пуховы разаслала.*
*Навокал тут спакой і ціш,*
*І спіць у цёплай норцы* ***мыш.***



Ці ведаеце вы, што ў нашых краях сустракаюцца розныя віды мышэй: дамавая, лясная, палявая, жаўтагорлая.

Мыш дамавая з даўніх часоў пасяляецца побач з чалавекам і прыносіць яму шкоду, знішчаючы і засмечваючы прадукты харчавання. Жыве ў складах, гумнах, летам — на палях і агародах.



Мышы з'яўляюцца разносчыкамі хвароб як сярод жывёл, так і сярод людзей. Хаця выглядаюць зусім бяскрыўдна: маленькі шэры зварок з доўгім тонкім хвастом (хвост можа быць роўны даўжыні тулава).

*Альбіносы (белыя дамавыя мышы) выкарыстоўваюцца ў якасці лабараторных жывёл.*







# Мядзведзь

(*русск.* **Медведь**)

*На малінавай паляне*
*Смакату знайшоў ад рання,*
*А цяпер ідзе ледзь-ледзь*
*Між бяроз стары* ***мядзведзь****.*

Буры мядзведзь самы буйны (даўжыня цела больш за 2 метры, маса — да 350 кілаграмаў) драпежнік у Беларусі, хаця сустракаецца даволі рэдка. Яго бурае футра густое і калматае.

Для жылля мядзведзь выбірае мясціны, недаступныя чалавеку. Там рыхтуе бярлогу, каб на ўсю зіму залегчы ў спячку. Мядзведзей, якія ў спячку не залягаюць, называюць «бадзягамі».

Усёедны звер. Корм самы разнастайны: можа нападаць на дзікіх і нават свойскіх жывёл, карміцца маладымі парасткамі дрэў, жалудамі, зялёным аўсом, любіць ягады, асабліва маліны. Але больш за ўсё яму







падабаецца мёд. Таму мядзведзь часам спусташае гнёзды дзікіх і вуллі свойскіх пчол.

Медзведзяняты (звычайна іх 1—2) нараджаюцца зімой масай 500 грамаў. Трымаюцца каля мядзведзіцы да 2 гадоў. Ворагам мядзведзя з'яўляецца воўк.

*Буры мядзведзь занесены ў Чырвоную кнігу Рэспублікі Беларусь. Неабходныя меры аховы — стварэнне заказнікаў.*

## Мядзянка

(*русск.* **Медянка**)

*— Гляньце, дзіва: каля ганка*
*Медна-шэрая* ***мядзянка***
*У клубок скруцілася —*
*Мусіць, заблудзілася.*



Назву гэта невялікая, але даволі масіўная змяя атрымала за сваю афарбоўку: скура бліскучая, гладкая, брuха пакрытае лускавінкамі колеру медзі, што найбольш прыметна ў промнях сонца. Вочы чырванаватыя. У даўніну людзі верылі, што мядзянкі валодаюць магічнымі здольнасцямі і могуць нашкодзіць чалавеку. Аднак моцна памыляліся, бо небяспечная змяя толькі для халаднакроўных паўзуноў, на якіх палюе. А вось чалавеку шкоды не прыносіць. Хаця можа і ўкусіць, калі яе моцна напужаць. Толькі ўкус гэты не ядавіты, таму яго месца дастаткова апрацаваць антысептыкам.



Жыве мядзянка звычайна ў хвойных або ліставых лясах, сярод дрэў і кустоў.

*Сустракаецца мядзянка ў нашых мясцінах вельмі рэдка, таму занесена ў Чырвоную кнігу Рэспублікі Беларусь.*





# Н





## Норка

(*русск.* **Норка**)

*Неяк летнім ясным днём*
*Сярод жаб пайшла гаворка,*
*Што ў суседні вадаём*
*Заплыла з сям'ёю **норка**.*

Норка — драпежны звер, што жыве ўздоўж берагоў невялікіх рэк і ручаёў у норах, якія сама і капае, а таксама займае пакінутыя бабровыя хаткі. Зімой трымаецца каля палонак і іншых незамерзлых месцаў. Звычайна корміцца мышамі, жабамі, ракамі, дробнай рыбай.

Карычневая бліскучая поўсць норкі густая і мае незвычайную асаблівасць: яна застаецца сухой, калі звярок нядоўгі час прабудзе ў вадзе. Плаваць і ныраць жывёле дапамагаюць невялікія перапонкі паміж пальцамі ног.

Актыўная ўвечары і ноччу. Самай жа адметнай знешняй прыметай норкі з'яўляецца белая пляма на вузкай мордачцы, якая закрывае падбародак, верхнюю і ніжнюю губы. Выразныя чорныя вочы нагадваюць пацеркі. А галоўная паляўнічая зброя норкі — вострыя зубы.

# П



## Палёўка

(*русск.* **Полёвка**)

*Што за спрытны там звярок*
*Па іржышчы — шмыг ды скок?*
*Гэта корм збірае лоўка*
*Для сваёй сям'і **палёўка**.*

Палёўку можна назваць «сястрой» звычайнай мышы. Але гэты звярок мае і пэўныя адрозненні: вушы і хвост у яе карацейшыя, а колер — буравата-шэры. Да таго ж



палёўка вельмі добра плавае. Жыве ў норках на лугах, палянах, у садах. Зімой хаваецца ў стагах сена, саломы і нават у жыллі чалавека.



Корміцца маладымі парасткамі зерневых культур, зернем, ягадамі, карой дрэў. Пашкоджвае ўраджай, чым прыносіць значныя страты гаспадарцы чалавека. Можа быць і разносчыцай хвароб. Актыўная на змярканні і ноччу.

## Пчала

(*русск.* **Пчела**)

*Не кранай **пчалу** рукой —*
*У яе характар свой:*
*Сцеражыся яе джала,*
*Каб бяда не напаткала.*



Пчала — усім вядомая нястомная працаўніца. Яна дае чалавеку мёд, пчаліны воск, прапаліс, пчаліны яд, пяргу, матачнае малачко. Яе прыметны (чаргаванне жоўта-аранжавых і чорных палосак) убор відаць здалёк. А калі прыгледзецца ўважлівей, то можна заўважыць, што цельца яе пакрыта валаскамі, якія і ахоўваюць, і дапамагаюць распазнаваць пахі.



Хабаток пчалы служыць для збору нектару і адчування яго смаку.

*Пчала вызначаецца неверагоднай працавітасцю: за дзень можа абляцець да 7 тысяч кветак, а за ўсё жыццё — да 200 тысяч.*

Звычайна пчолы жывуць сем'ямі (ад 10 да 50 тысяч асобін) у вуллях, якія ім майструе чалавек. Яны грамадскія насякомыя. Аднак у такіх вялікіх сем'ях існуе ідэальны парадак, бо кожная пчала ведае сваё месца: валадарыць у вуллі пчала-матка, або царыца, ёй дапамагаюць рабочыя пчолы, якія збіраюць нектар і пылок,







перапрацоўваюць нектар у мёд, а пылок — у пяргу; пчолы-разведчыцы шукаюць кветкавыя паляны; пчолы-фуражыры прыносяць корм; пчолы-вартаўнікі ахоўваюць вуллі ад «набегаў» ворагаў. А вось трутні... Яны патрэбны для таго, каб з'явілася новае патомства. І больш ніякай карысці на прыносяць. Таму восенню трутней выганяюць з вулля.

**Р**

## *Расамаха*

(*русск.* **Росомаха**)

*Нават воўк — пірат ліхі —*
*Дасць у спрэчцы з ёю маху,*
*І ўцякае праз імхі,*
*Як сустрэне* ***расамаху****.*



У цяперашні час расамаху ў нашых краях не сустрэнеш, але да XIX стагоддзя гэты звер вадзіўся ў беларускіх лясах.

Знешне расамаха нагадвае бурага мядзведзя, але меншая за яго. Вызначаецца незвычайнай сілай і спрытам. Мае магутнае, мускулістае, моцнае цела (маса да 20 кілаграмаў). Футра — і цёмна-карычневага, і чорнага, і нават светла-карычневага колеру. «Касцюм» таксама прыгожы: ад плячэй да пояса цягнуцца рыжыя палосы, на шыі і грудзях выдзяляецца светлы каўнерык, а на мордзе — такая ж светлая маска.



Назва звера ў перакладзе з лацінскай мовы абазначае «пражэрлівы, ненасытны», бо корміцца ён як дробнымі, так і буйнымі жывёламі, часта і загінуўшымі, не адмаўляецца ад ягад, арэхаў і нават мёду. На паляванне выходзіць бліжэй да вечара. Частку здабычы хавае пра запас. Цікава, што зімой гэты звер пралазіць па такіх гурбах, якія іншыя звяры абмінаюць.

Расамаха — адзіночны звер. У прыродзе выконвае ролю санітара.



# Рысь

(*русск.* **Рысь**)

*Засталося і цяпер,*
*Як лічылася калісь:*
*Небяспечны гэты звер,*
*Хоць завецца кошкай* ***рысь.***



Сваім выглядам рысь вельмі падобная да вялікай кошкі. Даўжыня цела каля 1 метра, маса 20—30 кілаграмаў. Яе асаблівымі прыметамі з'яўляюцца стаячыя вушы з кутасікамі і «бакенбарды» ў дарослых асобін. Ногі высокія, моцныя, хвост як быццам абсечаны. Футра можа быць і цёмна-шэрым, і чырвона-рыжым з невялікімі плямамі. Селіцца рысь звычайна ў глухіх, недаступных мясцінах. Удзень адпачывае, а ноччу выходзіць на паляванне. Часцей палюе з засады як на буйных (казуль, маладых аленяў і ласёў), так і на дробных жывёл (мышэй, зайцаў, а таксама на птушак). Добра лазіць па дрэвах.



*Рысь — рэдкі ў нашых мясцінах від звяроў. Занесена ў Чырвоную кнігу Рэспублікі Беларусь.*









# С

## Сом

(*русск.* **Сом**)

*Лета. Спёка. Ціш кругом.*
*Сонца ў хвалях грае.*
*А стары вусаты* ***сом***
*Пад карчом адпачывае.*





Сом — жаданая здабыча рыбакоў. Вялікая шырокая і пляскатая галава складае амаль шостую частку масіўнага голага тулава, пакрытага мяккай скурай, якая выдзяляе вялікую колькасць слізі. Вялікі рот узброены шматлікімі дробнымі, але вострымі зубамі. Маленькія вочкі як бы ссунуты да верхняй губы. Да таго ж з верхняй сківіцы звісаюць два доўгія белаватыя вусы, а з ніжняй — яшчэ чатыры, карацейшыя і жаўтаватыя. Адметны хвост — ён займае амаль палову тулава.

Афарбоўка рыбіны залежыць ад асяроддзя. Але звычайна спіна чорная, бакі чарнавата-зялёныя з аліўкавымі плямамі, жывот белы з блакітнымі крапінкамі, вочы жоўтыя з чорнымі плямкамі.

> *Жыве сом да 30 і больш гадоў. За гэты час ён вырастае да 5 метраў і набірае масу да 300 кілаграмаў.*

## Соня

(*русск.* **Соня**)

*Лясная соня*



*Нібыта ваўкі, завялі ветравеі*
*Працяглую песню ў марозным палоне.*
*Ды толькі дарэмна пужаюць завеі —*
*Пра лета сны бачыць маленькая* ***соня.***

У беларускіх лясах жывуць некалькі відаў гэтых незвычайных звяркоў з сямейства грызуноў: соня арэшнікавая, вялікая, лясная, садовая і соня-палчок.



Лясную соню можна назваць фарсухай за яе выгляд: футра пушыстае, мяккае, буравата-шэрага колеру на спіне, а на шыі, грудзях і жываце — жаўтавата-белае. Па баках галавы, ад носа да вушэй, цягнецца чорная палоска.

Большую частку жыцця звярок праводзіць на дрэвах. Корміцца насеннем, пупышкамі і карой маладых раслін, арэхамі, жалудамі, ягадамі, насякомымі, радзей птушынымі яйцамі. Толькі чаму жывёлу назвалі соней, калі самы актыўны час для яе — ноч? А можа, таму, што ўжо з восені, калі пачынаюцца халады, яна залягае ў зімовую спячку? З імху будуе шарападобныя гнёзды ў кронах дрэў, у дуплах і моцна спіць да цяпла.



*Соня-палчок*



*Арэшнікавая соня*

*Соня-палчок, арэшнікавая і садовая соні занесены ў Чырвоную кнігу Рэспублікі Беларусь і падлягаюць ахове.*

## Страказа

(русск. **Стрекоза**)

*Дзе над рэчкай нікнуць лозы,*
*Разгуляліся **стракозы**:*
*Моцна крыльцамі стракочуць,*
*Паляцець за хмаркай хочуць.*





У Беларусі сустракаецца каля 50 відаў стракоз: бабкі, дзедкі, каромыслы, люткі. Жывуць часцей за ўсё каля вады. Стракозы — драпежнікі, ловяць здабычу на ляту.

Легкакрылымі верталёцікамі кружаць стракозы над азёрнай гладдзю. Іх карычневыя, зялёныя, сінія крыльцы працуюць, як маленькія маторчыкі. Аднак хоць і маленькія, а даволі моцныя: некаторыя стракозы могуць лятаць хутчэй за аўтамабілі — да 140 кіламетраў у гадзіну. Ды і лятаюць даволі далёка: асобных «падарожніц» знаходзілі больш за 500 кіламетраў ад берага.





Адметныя гэтыя насякомыя і тым, што маюць незвычайныя, даволі вялікія вочы. Страказа адначасова бачыць, што робіцца ўверсе, і тое, што адбываецца ўнізе. Да таго ж для стракоз характэрны каляровы зрок — яны адрозніваюць жоўты, зялёны, чырвоны і аранжавы колеры.

*Стракозы — старажытныя насякомыя. Першы ўспамін пра іх адзначаецца XVIII—XVII стагоддзямі да нашай эры. У японскай міфалогіі страказа лічылася духам рысу, кітайскія паэты прысвячалі ёй вершы, а ў народаў Еўропы стракоз звязвалі з нячыстай сілай.*

## Суслік

(*русск.* **Суслик**)

*Цэлы горад пад зямлёй*
*Збудавалі на вякі.*
*У ім вядуць парадак свой*
*Дамаседы-**суслікі**.*





Суслікі — вельмі цікавыя звяры. Яны сустракаюцца каля дарог, на выганах і іншых непрыдатных землях. Большую частку жыцця праводзяць пад зямлёй, у норах. Жывуць калоніямі, але кожны з іх мае свой уласны ўчастак і ў кожнага ёсць свая «кватэра». У такіх «гарадах» пракладзены «дарогі», ёсць «назіральныя пункты», а «жыхары» строга выконваюць свае абавязкі. Пра небяспеку яны папярэджваюць адзін аднаго свістам. І на кожны выпадак — новая мелодыя. Каля нары часта стаяць «слупікам».

Кормяцца звяркі зялёнымі часткамі раслін, насеннем, карэннямі, зрэдку паядаюць мурашак і жукоў. Да зімы назапашваюць у арганізме шмат тлушчу. Зімой упадаюць у спячку, а прачынаюцца ў красавіку.

Суслікі з'яўляюцца пераносчыкамі хвароб.



# Тарпан

(*русск.* **Тарпан, дикая лошадь**)

*Раздолле — на полі.*
*І траваў — дыван.*
*Як вецер, на волі*
*Імчыцца **тарпан**.*



Тарпаны лічацца далёкімі продкамі сучаснага каня. Ды і выглядам яны вельмі падобныя, толькі значна меньшыя — вышыня ў карку да 140 сантыметраў.

Густая поўсць дазваляла тарпанам перажываць халодныя часы. Надзвычай вынослівыя і хуткія: у пошуках корму яны праходзілі многія дзясяткі кіламетраў. Да таго ж — дзікія і вельмі асцярожныя. Карміліся травой, маладымі парасткамі дрэў і кустарнікаў. Жылі табунамі.

Многія стагоддзі на тэрыторыі Беларусі на тарпанаў наладжваліся паляванні — і апошнія асобіны дажылі толькі да пачатку XIX стагоддзя. Сёння ў Налібоцкай пушчы можна ўбачыць родзічаў тарпанаў — тарпанападобных коней, праграма акліматызацыі якіх наладжана ў Беларусі.

*Тарпанападобныя коні*







## Тхор

(*русск.* **Хорёк**)



*— Эгэ-гэ! Ку-ка-рэ-ку-у-у-у! –*
*Певень будзіць сонны двор:*
*— Годзе спаць вам на шастку:*
*Ноччу ў хлеў прабраўся* ***тхор****.*



Тхор — звычайны ў нашых мясцінах драпежны звер. Селіцца ў зарасніках каля рэк, азёр, на балотах.

Калі гэтаму звярку вельмі хочацца есці, ён можа залезці нават у хлеў і знішчыць курэй або куранят. Хаця часцей корміцца мышамі, жабамі, рыбай ці птушкамі і іх яйцамі. На паляванне выходзіць ноччу, а ўдзень адпачывае, схаваўшыся ці ў нары, ці пад сухім галлём, ці сярод камянёў. Бо ў самога таксама многа ворагаў: сабакі, лісы, буйныя драпежныя птушкі. Калі тхор даганяе здабычу або ратуецца ад ворага, ён не бяжыць, а пераможчаецца доўгімі скачкамі. Яшчэ тхор умее добра плаваць, а вось па дрэвах лазіць з цяжкасцю. Актыўны ноччу.

*Цікава, что тхары-альбіносы (з белай поўсцю) — фуро — прыручаныя і дапамагаюць чалавеку рэгуляваць на падвор'і колькасць мышэй.*

# У

## Удод

(*русск.* **Удод**)



*Ранкам сонечным* ***удод***
*На галінку спрытна ўзлез*
*Ды лясны здзівіў народ —*
*Распусціў свой «іракез».*

Птушка гэта некалькі меншая за голуба. Аднак у яе даволі імпазантны і экстравагантны выгляд: дзюба доўгая, крыху загнутая ўніз; крылы і хвост шырокія,





чорныя з белымі крапінкамі. Цела ружавата-рыжае, жывот белы.

Але не гэта вылучае ўдода з птушынай грамады. А чуб, або хахол... Яму пазайздросціць любы моднік-франт. Распушчаны, чуб нагадвае вялікі веер з чорнымі крапінкамі. А калі «згорнецца», то складваецца ўражанне, быццам удод надзеў на галаву стракаты каўпачок.

Сустрэцца з гэтым прыгажуном можна на адкрытых мясцовасцях з невялікімі купкамі дрэў: у дуплах на ўзлесках, на высечках, у гайнах. І нават каля жылля чалавека, дзе птушка будуе сабе гняздо.

Звычайна ўдод корміцца насякомымі і іх лічынкамі, чарвякамі, а таксама дробнымі жабамі, яшчаркамі і змеямі.

Ратуючыся ад небяспекі, птушка ляціць не прама, а крутымі зігзагамі. А калі гэта не дапамагае, то выдзяляе рэчыва з вельмі непрыемным пахам. Тым самым адганяе ворагаў.

Часцей прыгажуна-ўдода можна сустрэць у паўднёвых раёнах Беларусі. А на зімоўку птушкі ляцяць у Афрыку, где гняздуецца «брат» нашага ўдода — птушка-насач.



*Птушка-насач*

## Уклейка, верхаводка

(*русск.* **Уклейка**)

*Між берагоў лясістых*
*Рэчкі ўецца змейка.*
*А ў прадоннях чыстых*
*Серабрыцца **ўклейка**.*



Гэта рухавая і бойкая рыбка вядома многім аматарам пасядзець з вудачкай каля вады. Сама невялікая (до 20 см даўжынёй), серабрыстая, мае прадаўгаватае цела. Любіць спакойныя рачныя ўчасткі.





Трымаецца вялікімі чародамі на паверхні вады. Адсюль і другая назва — верхаводка. Хаця ўклейка рыбка і дробная, але вельмі пражэрлівая: корміцца водарасцямі, мухамі, камарамі, жукамі, лічынкамі, ікрой іншых рыб. Яе злейшымі ворагамі з'яўляюцца драпежныя рыбы і каляводныя птушкі.

*Асаблівага прамысловага значэння ўклейка не мае. Але гаспадыні гатуюць з яе «шпроты»: 3—4 гадзіны тушаць у алеі з цыбуляй.*

Х

## Хамяк

(*русск.* **Хомяк**)

*Ураджай такі багаты*
*На любы і густ, і смак:*
*Проса, жытнія зярняты —*
*Вось пацешыцца* ***хамяк****.*





Чалавека, які за сталом набірае поўны рот ежы (што не вельмі прыгожа і культурна), мы часта параўноўваем з гэтым звярком. Бо і ён, калі рыхтуе запасы на зіму, носіць іх у мяшэчках за шчокамі. Хамяк непераборлівы да ежы: корміцца зялёнымі парасткамі зерневых і дзікіх раслін, семачкамі, караняплодамі, а таксама насякомымі. Засяляе межы, выганы, узлескі, трапляецца ў пасевах і садах. Жыве ў норах, дзе позняй восенню кладзецца ў зімовую спячку. На зіму назапашвае корм (да 10—15 кілаграмаў) і часта прачынаецца, каб паесці.

Хоць звярок выглядае прыгожа і прывабна, аднак трэба памятаць: ён даволі злосны і смелы. Ратуючыся ад небяспекі (а ворагамі яго з'яўляюцца гарнастаі, ласкі, лісы), часцей за ўсё кідаецца на ўцёкі. Калі ўцячы не ўдаецца, то становіцца на заднія лапы, надзімае зашчочныя мяшкі і рэзка свішча.



## Хахуля

(*русск.* **Выхухоль**)

*У затоцы летнім раннем*
*Плёскае чысцюля:*
*Вымывае там старанна*
*Футрачка* ***хахуля****.*







Хахуля жыве на Зямлі ўжо (нават цяжка паверыць!) каля 30 мільёнаў гадоў. Раней сустракалася на тэрыторыі Беларусі. Зараз лічыцца зніклай. Мае дзіўны знешні выгляд: сама невялікая, але з доўгім пляскатым хвастом, які нагадвае кіль. Паміж пальцамі задніх ног плавальныя перапонкі. Незвычайна выглядае мордачка жывёлы: галава заканчваецца доўгім рухавым хабатком, на канцы якога знаходзяцца ноздры.

Футра на спіне цёмнае, буравата-шэрае, а на горле, грудзях і жываце — серабрыста-белае. Паўводная жывёла, жыве ў норах з выхадам пад вадой, якія капае ў ціхіх, зарослых вадаёмах з невысокімі сухімі берагамі. Корміцца малюскамі, дробнымі вадзянымі жукамі, чарвякамі, п'яўкамі, а таксама воднымі раслінамі.

- *Хахуля звычайная занесена ў Чырвоную кнігу Рэспублікі Беларусь у спіс відаў, якія зніклі з тэрыторыі нашай краіны за апошнія 400 гадоў.*

Ш

## Шчупак

(*русск.* **Щука**)

*Драбяза на дне ракі*
*Пахавалася ізноў,*
*Бо піраты-****шчупакі***
*Выйшлі з-пад карчоў.*



Рыбакі расказваюць, што лавілі вялікіх шчупакоў: іх даўжыня дасягала 1,5 метра, а маса 35 кілаграмаў.





Аднак такія гіганты цяпер сустракаюцца рэдка. Хаця жыве рыба 20, а часам і больш гадоў. Селіцца ў ціхай вадзе пад карчамі і падводнымі пнямі, у ямах, адкуль выходзіць толькі на паляванне.

Шчупак вельмі пражэрлівы: можа з'есці ў 10 разоў больш за ўласную масу. А корміцца звычайна рыбамі, ракамі, жабамі і нават качанятамі. Часам здабыча дасягае каля паловы даўжыні і масы самога драпежніка. Акрамя іклаў, якімі ён хапае здабычу, у шчупака на нёбе і языку ёсць зубы, якія дапамагаюць глытаць ежу.



У шчупака доўгае, падобнае да стралы цела, плямістае, у цёмных папярэчных палосках. У залежнасці ад месцажыхарства яно можа быць шэра-зеленаватым, шэра-жаўтаватым або шэра-бураватым. С узростам афарбоўка рыбы цямнее.

*Шчупак — важны аб'ект аматарскага рыбалоўства і рыбаразвядзення.*

## Шыншыла

(*русск.* **Шиншилла**)

*У бары паміж звяроў*
*Нечаканы слух пайшоў:*
*— Футра новае пашыла*
*Наша модніца-**шыншыла**.*



Гэтых невялікіх (маса да 1 кілаграма) грызуноў у дзікай прыродзе засталося вельмі мала. Таму людзі пачалі разводзіць шыншыл і трымаць іх дома.

Знешне звяркі падобныя да буйной вавёркі, але перамяшчаюцца як зайцы — невялікімі скачкамі. У іх вялікія вушы, цёмныя вочы, пушысты доўгі хвост. Кормяцца расліннай ежай і насякомымі. Характар у іх вельмі ласкавы, яны амаль ніколі не кусаюцца. Найбольш актыўныя раніцай і ўвечары. У шыншыл вельмі цэннае футра.



## Шэршань

(*русск.* **Шершень**)



*Грозны **шэршань** вострыць джала*
*Ды гудзе-гудзе, сярдзіты:*
*— Каб бяда не напаткала,*
*Дом мой лепей абыдзі ты.*

Сапраўды, калі гаварыць пра джала шэршня, то не лішнім будзе напомніць, што, у адрозненне ад пчалінага, яно гладкае. Таму шэршань можа джаліць і некалькі разоў. А каб не трапіць пад гэты «ўкол», трэба ведаць, што:



- шэршань адносіцца да сямейства грамадскіх восаў;
- таму ён падобны да сваёй «сястрычкі», аднак намнога большы (можа быць да 3 сантыметраў даўжынёй);
- афарбоўку мае рыжую або чырванавата-бурую з чорнымі палоскамі;
- жыве сям'ёй;
- жыллё робіць у дуплах дрэў, драўляных пабудовах і нават у вуллях пчол;
- корміцца нектарам і пылком кветак, грызе садавіну і... кару маладых дрэў, асабліва ясеняў.

Я

## Язь

(*русск.* **Язь**)



*Падымае іл ды гразь,*
*Плешчацца старанна —*
*Гэта спрытны вёрткі **язь***
*Так прымае ванну.*

Язь — рыба вельмі хітрая і асцярожная. Таму выбірае глыбокія рэкі з ціхім цячэннем, дзе ёсць гліністае заглеенае дно. Селіцца ў ямах або пад навіслымі над вадой кустамі. Ноччу выходзіць на водмелі і ў зараснікі чароту.







Корміцца звычайна воднымі насякомымі, чарвякамі, жукамі, водарасцямі. А дарослы язь — нават дробнай рыбай. Даўжыня цела язя дасягае 60 сантыметраў, маса каля 5 кілаграмаў.

Мае даволі прыгожую афарбоўку: цемнаватую, з залацістым адценнем. Спіна і верхняя частка бакоў цёмна-сінія, ніжняя — белаватая. Аднак асабліва прывабна язь выглядае вясной: на сонцы ён становіцца то серабрыстым, то залацістым, то амаль чорным. А плаўнікі набываюць чырванаваты колер.

## Янот-паласкун

(*русск.* **Енот-полоскун**)



*Ледзь расплюшчыць вочы ранне,*
*А ў яго кіпіць работа:*
*І мыццё, і паласканне —*
*Справы важныя ў **янота**.*



Цікава, што, упаляваўшы здабычу, янот-паласкун спачатку палошча яе ў вадзе, а потым есць (за што і атрымаў мянушку вялікага чысцёхі). Корміцца ён самай разнастайнай ежай: ягадамі рабіны, жалудамі, жукамі, жабамі, мышамі. «Далікатэсам» для янота з'яўляюцца рачныя ракі.

На выгляд жывёла даволі «фотагенічная»: шэра-бурае футра з цёмным адценнем; на мордачцы — чорная паласа, падобная да маскі; губы, бакі морды і падбароддзе белыя; на пушыстым хвасце чорныя або бурыя кольцы. Жыве ў старых мяшаных лясах з дуплістымі дрэвамі і вадаёмамі. Селіцца ў дуплах. Актыўны ў прыцемках і ноччу. Добра лазіць па дрэвах, плавае. Зімой упадае ў спячку.

*Янотаў разводзяць у зверагаспадарках, бо ў іх каштоўнае футра.*



# Змест

*Дарагія юныя натуралісты!* . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 3

## *Ягады і кветкі — сонейкавы дзеткі*

**А**бляпіха . . . . . . . . . . 6
Агрэст . . . . . . . . . . 7
Ажыны . . . . . . . . . . 8
Алыча . . . . . . . . . . 9
Астра . . . . . . . . . . 10

**Б**арбарыс . . . . . . . . . . 11
Барвенак . . . . . . . . . . 12
Брусніцы . . . . . . . . . . 13
Буякі . . . . . . . . . . 14
Бэз . . . . . . . . . . 15
Бяссмертнік, цмен . . . . . . . . . . 16

**В**алошкі, васількі . . . . . . . . . . —
Венерын чаравічак . . . . . . . . . . 18
Верас . . . . . . . . . . 19
Вішня . . . . . . . . . . 20

**Г**арлачык . . . . . . . . . . 21
Гваздзік . . . . . . . . . . 23
Глог . . . . . . . . . . 24

**Д**зівасіл . . . . . . . . . . 25
Дзьмухавец . . . . . . . . . . 26

**Ж**уравельнік, герань . . . . . . . . . . 27
Журавіны . . . . . . . . . . 28
Жывакост . . . . . . . . . . 29
Жэньшэнь . . . . . . . . . . 30

**З**ваночак . . . . . . . . . . 32
Зверабой, святаяннік . . . . . . . . . . 33
Зуброўка . . . . . . . . . . 34
Зязюліны слёзкі . . . . . . . . . . —

**І**мшарніца . . . . . . . . . . 36
Ірга . . . . . . . . . . 37

**К**азялец . . . . . . . . . . —
Каліна . . . . . . . . . . 38
Касач . . . . . . . . . . 39
Кураслеп . . . . . . . . . . 40

**Л**андыш . . . . . . . . . . 41
Лілея . . . . . . . . . . 42
Лотаць . . . . . . . . . . 43

**М**ак . . . . . . . . . . —
Мацярдушка . . . . . . . . . . 44
Мята . . . . . . . . . . 45

**Н**аготкі, календула . . . . . . . . . . 46
Нарцыс . . . . . . . . . . 47
Незабудка . . . . . . . . . . 48

**П**арэчкі . . . . . . . . . . 49
Пералеска . . . . . . . . . . 50
Півоня . . . . . . . . . . 51
Пярэсна . . . . . . . . . . 52

**Р**абіна . . . . . . . . . . 53
Рамонак . . . . . . . . . . 54
Расіца . . . . . . . . . . 55
Ружа . . . . . . . . . . 56

**С**ліва . . . . . . . . . . 57
Сон-трава . . . . . . . . . . —
Стакротка, маргарытка . . . . . . . . . . 59
Суніцы . . . . . . . . . . 60

**Т**рыпутнік 60

**Ф**іялка 61
Флёкс 63

**Х**рызантэма 64

**Ц**ынія 65
Цюльпан 66

**Ч**арніцы 67
Чартапалох 68
Чарэшня 69
Чыстацел 70

**Ш**пажнік —
Шыпшына 72

**Э**дэльвейс 73

## *Бору-лесу будзь удзячны: пакланіся — ён аддзячыць!*

**А**бабак, падбярозавік, бабка 76
Апенька восеньская 77

**Б**аравік, белы грыб 78
Бледная паганка 79

**В**алуй 80
Ваўнянка —

**Г**аркуха 81
Гнаявік 82
Грузд 83

**Д**ажджавік —

**З**ялёнка 84

**К**азляк 85
Каўпак кольчаты, курка —

**Л**ісічка 86
Лось 87

**М**асляк 88
Махавік 89
Мухамор —

**П**адасінавік, чырвонагаловік 90
Падзялёнка, радоўка шэрая 91
Парасонік стракаты —

**Р**ыжык 92

**С**маржок 93
Страчок —
Сыраежка 94

**Х**рушч, губа авечая 95

**Ч**ага 96

**Ш**ампіньён 97

## І на лузе, і ў бары ёсць свае гаспадары

**А**кунь . . . . . . 100
Алень . . . . . . 101
Андатра, мускусны пацук . . . . . . 102
Аса . . . . . . —

**Б**абёр . . . . . . 103
Барсук . . . . . . 104
Бусел . . . . . . —

**В**авёрка . . . . . . 106
Воўк . . . . . . —
Вугор еўрапейскі . . . . . . 107
Вуж . . . . . . 108
Вушатая сава . . . . . . 109

**Г**арнастай . . . . . . 110
Глушэц . . . . . . —

**Д**амавы верабей . . . . . . 112
Джгір, ёрш . . . . . . 113
Дзік, дзікая свіння . . . . . . —

**Ж**аба . . . . . . 114
Жэрах . . . . . . 115

**З**аяц . . . . . . —
Зубр . . . . . . 116

**К**ажан . . . . . . 117
Камар звычайны . . . . . . 118
Капусніца, капусная бялянка . . . —
Карась залаты . . . . . . 119
Куніца . . . . . . 120

**Л**ань . . . . . . —
Лімонніца . . . . . . 121
Лось . . . . . . 122

**М**ыш . . . . . . 123
Мядзведзь . . . . . . 124
Мядзянка . . . . . . 125

**Н**орка . . . . . . 126

**П**алёўка . . . . . . —
Пчала . . . . . . 127

**Р**асамаха . . . . . . 128
Рысь . . . . . . 129

**С**ом . . . . . . 130
Соня . . . . . . —
Страказа . . . . . . 131
Суслік . . . . . . 132

**Т**арпан . . . . . . 133
Тхор . . . . . . 134

**У**дод . . . . . . —
Уклейка, верхаводка . . . . . . 135

**Х**амяк . . . . . . 136
Хахуля . . . . . . 137

**Ш**чупак . . . . . . —
Шыншыла . . . . . . 138
Шэршань . . . . . . 139

**Я**зь . . . . . . —
Янот-паласкун . . . . . . 140



Навукова-папулярнае выданне

**Школьная энцыклапедыя**

**Кажура** Віктар Віктаравіч

ЭНЦЫКЛАПЕДЫЯ
ЮНАГА НАТУРАЛІСТА

6+ EAC

Заг. рэдакцыі *Г. А. Бабаева*. Рэдактар *А. У. Ліцвіновіч*.
Мастак *А. Г. Дашкевіч*. Мастацкі рэдактар *А. А. Жданоўская*.
Тэхнічнае рэдагаванне і камп'ютарная вёрстка *Г. А. Дудко, В. І. Улазнюк*.
Карэктары *В. С. Казіцкая, А. П. Тхір, Г. В. Алешка*.

Падпісана да друку 27.06.2022. Фармат 60 x $90^1/_8$.
Папера мелаваная. Друк афсетны. Умоўн. друк. арк. 18,0.
Ул.-выд. арк. 11,5. Тыраж 1000 экз. Заказ 226.

Выдавецкае рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства «Народная асвета» Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь. Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вытворцы, распаўсюджвальніка друкаваных выданняў № 1/2 ад 08.07.2013.
Пр. Пераможцаў, 11, 220004, Мінск, Рэспубліка Беларусь.

Адкрытае акцыянернае таварыства «Паліграфкамбінат імя Я. Коласа».
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вытворцы, распаўсюджвальніка друкаваных выданняў № 2/3 ад 10.09.2018.
Вул. Каржанеўскага, 20, 220024, Мінск, Рэспубліка Беларусь.



«Народная асвета»

ISBN 978-985-03-3819-8

ВІКТАР КАЖУРА • ЭНЦЫКЛАПЕДЫЯ ЮНАГА НАТУРАЛІСТА